Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 ЛЮТАГА 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 20 (26133)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Беларусь не стварае праблем ні суседзям, ні заходнім краінам

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 31 студзеня прыняў Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла ФРГ у Беларусі Гебхарта Вайса. Прэзідэнт адзначыў пазітыўныя адносіны краўніка германскай дыпламатычнай місіі да нашай краіны.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, роля любога пасла — устанаўліваць нармальныя дружалюбныя адносіны сваёй краіны з краінай знаходжання.

«На вялікі жаль, у заходніх паслоў такога жадання няма, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Атрымліваецца парадокс. У прыватным парадку паслы практычна заўсёды шчыра, я лічу, выказваюцца ў падтрымку таго, што адбываецца ў Беларусі, іх задавальняе тая стабільнасць, якая ёсць у краіне. Яны гавораць, што ім выгадна гэта стабільнасць, што яны вельмі залежаць, асабліва сёння, ад энергапаставак з Расіі. Тое, што тут ёсць стабільнасць, значыць, што ёсць стабільнасць і ў эканоміках іх дзяржаў. Але, калі мы чуем афіцыйныя заявы некаторых паслоў і бачым іх рэальныя дзеянні, становіцца вельмі сумна. І ў сувязі з гэтым я не зусім разумею ролю паслоў краін Еўрасаюза ў большасці сваёй і пасла ЗША і не хачу гэтага ўтойваць. Таму я часам рэзка выказваюся, каб спыніць некаторых, асабліва бойкіх, і паказаць, што Беларусь — суверэнная, незалежная дзяржава і з'яўляецца такой паўтара дзесятка гадоў. Тое, што мы стабільныя, і тое, што мы нікому ніякіх праблем не ствараем — ні суседзям, ні Германіі, ні Францыі, ні ЗША, — гэта факт. Дык чаго ж ад нас хочуць?».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «ёсць многа пытанняў», і ён гатовы выслухаць любыя прапановы пасла ФРГ, крытычныя заўвагі. «Вы павінны сказаць, што вам не падабаецца ў нашай палітыцы, што б вы хацелі змяніць. Я паспрабую адрэагаваць на тое, што вы скажаце», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт выказаў надзею на плённасць гэтай сустрэчы.

Кіраўнік германскай дыпмісіі прапанаваў «не азірацца назад, а паглядзець наперад». «Бліжэйшыя месяцы да правядзення парламенцкіх выбараў будуць у пэўнай ступені вырашальныя для Беларусі і яе становішча ў Еўропе. На фоне гэтых падзей, калі працэс пойдзе наперад, то, магчыма, складзецца новая сітуацыя», — сказаў дыпламат.

Аляксандр Лукашэнка падпісаў пастанову Савета Бяспекі аб будаўніцтве АЭС у Беларусі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 31 студзеня падпісаў пастанову Савета Бяспекі краіны № 1 «Аб развіцці атамнай энергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь».

У дакуменце змяшчаецца рашэнне аб тым, што ў Беларусі будзе ажыццёўлена будаўніцтва атамнай электрастанцыі сумарнай электрычнай магутнасцю 2000 МВт з уводам у эксплуатацыю першага энергетычнага блока ў 2016 годзе, другога — у 2018 годзе.

Крэдытаванне рэальнага сектара эканомікі Беларусі ў 2008 годзе плануецца павялічыць не менш як на 41 працэнт

Аб гэтым Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку далажыў старшыня праўлення Нацбанка Пётр Пракаповіч.

Аляксандр Лукашэнка праінфармаваны аб выкананні ў 2007 годзе ў поўным аб'ёме асноўных паказчыкаў грашова-крэдытнай палітыкі.

У рэспубліцы ўдалося стварыць неабходную базу для ўмацавання нацыянальнай валюты ў 2008 і наступных гадах за кошт значных золатавалютных рэзерваў. За мінулы год яны павялічыліся ў 2,9 раза і да 1 студзеня 2008 года дасягнулі $5 млрд.

Нацбанк выканаў усе даручэнні Прэзідэнта па крэдытаванні дзяржаўных праграм, рэальнага сектара эканомікі. У 2007 годзе аб'ём выдадзеных крэдытных рэсурсаў удвая перасягнуў запланаваны Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі.

Пётр Пракаповіч паведаміў, што прыняты неабходныя меры для выканання ўсіх паказчыкаў, якія закладзены ў Асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі на 2008 год. У прыватнасці, будзе значна ўзмоцнена крэдытная падтрымка рэальнага сектара эканомікі. Выпрацаваны таксама дадатковыя меры па правядзенні эфектыўнай працэнтнай палітыкі, умацаванню плацежнай сістэмы.

Кіраўнік дзяржавы даручыў і ў 2008 годзе забяспечыць выкананне ўсіх паказчыкаў Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі ў поўным аб'ёме.

Акрамя таго, Прэзідэнту даложана аб выкананні даручэнняў па развіцці ў рэспубліцы вяслярных відаў спорту, а таксама планах па ўмацаванні спартыўнай базы. Так, у гэтым годзе запланаваны ўвод у эксплуатацыю дзвюх вяслярных каналаў: у Заслаўі і Гомелі. Будзе праведзена рэканструкцыя некалькіх вяслярных баз, што дасць магчымасць значна павялічыць колькасць тых, хто займаецца гэтымі відамі спорту, і стварыць добрую аснову для падрыхтоўкі беларускіх нацыянальных камандаў.

Кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову па развіцці гэтых відаў спорту і даручыў зрабіць усё неабходнае для стварэння моцных нацыянальных камандаў, якія дастойна прадстаўляць краіну на маючых адбыцца Алімпійскіх гульнях у Пекіне і іншых спаборніцтвах міжнароднага ўзроўню.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З чаго пачынаецца Радзіма...

Сотні выпускнікоў сталічнай гімназіі № 25, якая сёння святкуе «залаты» юбілей, перакананыя: Радзіма пачынаецца менавіта са школы

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Урок беларускай мовы вядзе настаўніца Людміла ГАЛАЙД.

Мабыць, не будзе перабольшаннем сказаць, што гісторыя 25-й школы (у 2001 годзе за вялікія дасягненні ў адукацыйна-выхаваўчай рабоце ёй быў нададзены статус гімназіі) — гэта гісторыя нашай краіны.

25-я — своеасаблівая пабрацімка «Звязды». І зараз гімназія святкуе не толькі 50-гадовы юбілей. Мяркуйце самі...

(Заканчэнне на 7-й стар.)

Будынак Мінскай гімназіі № 25.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

КРЭДЫТНАЯ АФЕРА Ў БУЙНЫМ ПАМЕРЫ

Супрацоўнікі Брэсцкага абласнога ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ў стратэгічных накірунках выявілі ў Баранавічах крэдытную аферу «памерам» у 250 тысяч долараў.

Як паведаміла оперупаўнаважаны па асабліва важных справах УБЭЗ Міністэрства ўнутраных спраў Вераніка Пасмецьева, у поле зроку міліцыі трапіў кіраўнік адной з баранавіцкіх будаўнічых фірмаў. Ён заключыў дамову з ААТ «Белзнешэканамбанк» на атрыманне крэдыту ў памеры 250 тысяч долараў. Паводле дакументаў, гэтыя грошы прызначаліся на набыццё дрэваапрацоўчага абсталявання, складскога будынка і памяшкання цэха адной з мясцовых вытворчых фірмаў. У якасці закладу атрымальнік крэдыту абавязаўся прадаставіць банку памянёнае абсталяванне і нерухомасць. Аднак адразу ж пасля набыцця ўсёй маёмасці ён прадаў яе індывідуальнаму прадпрымальніку, а грошы прысвоіў. Як лічаць барацьбіты з эканамічнай злачыннасцю, фактычна кіраўнік фірмы меў на мэце крадзеж атрымана крэдыту. Падазроны знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе. За такое злачынства прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад 5 да 12 гадоў. Нядобрасумленны крэдытаатрымальнік набыў дрэваапрацоўчае абсталяванне ў фірмы, якой кіруе яго сваяк. Таму цяпер правяраецца і прыналежнасць гэтай асобы да крэдытнай аферы.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

МІНІМАЛЬНАЯ ЗАРПЛАТА З 1 СТУДЗЕНЯ ЎСТАНОЎЛЕНА Ў ПАМЕРЫ BR208 ТЫС. 800

У Беларусі месячная мінімальная заработная плата з 1 студзеня 2008 года ўстаноўлена ў памеры Br208 тыс. 800. Такое рашэнне прынята пастановай Савета Міністраў № 111.

Пагадзінная мінімальная заработная плата ўстаноўлена ў памеры Br1240.

БЕЛТА.

НЯЎДАЛЫЯ «ГАСТРОЛІ»

Далей Стоўбцаў не ўдалося ўцячы непрацуючаму жыхару Санкт-Пецярбурга, які спрабаваў зрабіць ногі на ўгнаным у Беларусі аўтамабілі.

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, у Мінску па дапамогу звярнуўся 27-гадовы сталічны жыхар: ён паведаміў, што на вуліцы Сярова нехта выкраў яго аўтамабіль «Таёту-Карола» 2006 года выпуску. Супрацоўнікам міліцыі спатрэбілася ўсяго каля гадзіны, каб затрымаць зламысніка. Угнаная машына, за рулём якой знаходзіўся 38-гадовы жыхар Санкт-Пецярбурга, «засвяцілася» на пункце спагнання дарожных зборaў у Стоўбцах.

Ігар ГРЫШЫН.

ПЕРАКІС ВАДАРОДУ... У КЛІЗМЕ

Медсястра ў адным з санаторыяў Пяцігорска памылкова заліла ў клізму перакіс вадароду. 17 чалавек шпіталізаваныя.

У ДЖЫПЕ ЗНАЙШЛІ ЛАСЯ

Супрацоўнікі Смаргонскага раённага таварыства паляўнічых і рыбаловаў у ходзе рэйда на дарозе ў раёне вёсак Капачы і Сыраватка знайшлі ў джыпе «Форд-Маверык» 3 паляўнічыя ружжы і патроны, а таксама тушу забітага 200-кілаграмовага лася. Аб гэтым паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў упраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама.

На наступны дзень у міліцыю з павіннай з'явіўся гаспадар джыпа. Тым, хто падстрэліць лася «куляй і карцеччу», пагражае буйны штраф або турэмнае зняволенне. Ім давядзецца таксама кампенсаваць урон, нанесены паляўнічай гаспадарцы, у суме Br3 млн 325 тыс.

Рычард САЛАТА, БЕЛТА.

ПАДСУНУЛІ ФАЛЬШЫЎКУ...

Пра тое, што стодоларавая купюра з'яўляецца самай сапраўднай «ліпай», два саракагадовыя мужыкі (адзін — беспрацоўны, другі — работнік фабрыкі мастацкіх вырабаў) ведалі добра. І вырашылі пазбавіцца ад яе.

Яны знайшлі недасведчанага ў грашовых справах земляка, таксама жыхара горада Хойнікі, якога «падбілі» на абмен фальшыўкі на беларускія рублі. Аднак «аперацыя» правалілася: міліцыя ўзяла махляроў за жабры. Напарадзе — лава падсудных.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Леанід КАВАЛЁЎ:

«ДАВЯРАЦЬ МОЛАДЗІ»

На выставе «Тыдзень моды на здароўе» я, уласна кажучы, амаль не адыходзіла ад стэнда нашай газеты, і не было часу цікавіцца ніякай друкаванай прадукцыяй, прадстаўленай у гэтыя дні ў «Белэкспа» ў вялікай колькасці, тым не менш, каляндар з сімволікай БРСМ у мяне ўсё ж такі аказаўся. Усюдыісная арганізацыя і там аказалася адной з самых актыўных, у прыватнасці ў распаўсюджанні сваёй сімволікі. Нічога дзіўнага ў гэтым няма, бо толькі за апошні год Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі пашырыўся на 100 тысяч. Мінулы год быў багатым для саюза і на іншыя падзеі, аб чым расказаў першы сакратар Цэнтральнага камітэта ГА БРСМ Леанід КАВАЛЁЎ.

— Леанід Леанідавіч, пачнём з прыемнага — вам удалося пераканаць дэлегацыю Лівіі адмовіцца на карысць Беларусі ад правядзення міжнароднага маладзёжнага фестывалю?

— Не толькі ад Лівіі залежыць, дзе будзе праводзіцца наступны фестываль. Прэзідэнт Сусветнай дэмакратычнай федэрацыі моладзі (СДФМ) Мігель Мадэра ў лістападзе мінулага года на сустрэчы ў Маскве падчас мерапрыемстваў, прысвечаных 90-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі, расказаў нам, што заяўкі прымаліся да канца 2007 года. І ў ліку прэтэндэнтаў, якія афіцыйна заявілі аб сваёй гатоўнасці прыняць фестываль, былі Лівія і Беларусь. У сувязі з гэтым нам з лівійскім бокам, як двум сапернікам, трэба было дамовіцца. З лістапада па студзень мы вялі перамовы, і нашы канкурэнты «здаліся». Днямі афіцыйная лівійская дэлегацыя на чале з Генеральным сакратаром нацыянальнай маладзёжнай арганізацыі Лівіі прыехала да нас, і мы, акрамя фестывальных пагадненняў, падпісалі дамову аб супрацоўніцтве ў галіне турызму, адукацыі, абмену маладзёжнымі праграмамі па працаўладкаванні і інш. Лівійскі бок запэўніў, што падтрымаюць фестываль 2009 года ў Беларусі, а мы ў сваю чаргу падтрымаем правядзенне фестывалю 2013 года ў Лівіі.

— Такім чынам, вас можна павіншаваць з тым, што Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў пройдзе ў Беларусі...

— Канчатковае рашэнне яшчэ не прынята, давайце яго і пачакаем. Часта так бывае: пачынаеш думаць, што ўдача ў цябе ў руках, а потым штосьці здараецца, што ад цябе не залежыць, і ўсё... У лютым у Лісабоне будзе праходзіць чарговае пасяджэнне кіраўніцтва СДФМ, там будзе разглядацца пытанне правядзення фестывалю, але і там будзе толькі абмеркаванне. Па традыцыі рашэнне аб правядзенні фестывалю будзе прынята на тэрыторыі той краіны, дзе ён праходзіў апошні раз, гэта значыць у Венесуэле, у Каракасе. Калі ж усё адбудзецца так, як і павінна, і мы атрымаем фестываль, гэта будзе лепшая ўзнагарода за тую вялізную работу, якая намі праведзена. Ні для кога не сакрэт, што заходнія СМІ сёння лепяць з Беларусі краіну-ізгоя. Многія людзі, калі прыязджаюць у Беларусь, здзіўляюцца, бо іх меркаванне пасля наведвання Беларусі цалкам адрозніваецца ад таго, якое імкнуцца стварыць аб нашай краіне на Захадзе. Хацелася б, каб моладзь з усяго свету пабывала ў нашай краіне — і наша сталіца, і іншыя гарады мяняюцца ў лепшы бок, у нас багатая гісторыя, традыцыі і культура, нам ёсць што паказаць. У нас гасцінныя людзі, я думаю, і мы на дастойным узроўні прымем фестываль.

— Давайце звернемся да вынікаў работы вашай арганізацыі ў мінулым годзе. Летась шэрагі БРСМ папоўніліся 100 тысячамі маладых людзей. З улікам таго, што ў папярэднія гады гэта лічба складала 50—60 тысяч, мінулагодні вынік выглядае неяк зусім фантастычна...

— З улікам тых, хто выбыў з арганізацыі па ўзросце ці па іншых прычынах, БРСМ папоўніўся на 95 тысяч. Многія нас абвінавачваюць, што мы настойліва папаўняем нашу арганізацыю. Але з пункту погляду здаровага сэнсу, як можна гэта ўявіць? З сённяшнімі падлеткамі, а ў нашу арганізацыю прымаюць з 14 гадоў, не так проста дамовіцца ці загнаць іх куды-небудзь. Студэнтаў, навучэнцаў — тым больш. Я магу дапусціць, што ёсць асобныя выпадкі, калі педагогу-арганізатару ў школе ці дэкану на факультэце, якому замест таго, каб нейкім цікавым мерапрыемствам ці добрым прыкладам паказаць, што такое арганізацыя, прасцей папрасіць напісаць заяву. Аднак ці ўсе яе напішуць? Зразумела, што не. На ўсе абвінавачванні такога кшталту я рэагую вельмі проста. Калі хтосьці ведае выпадкі, калі ў БРСМ прымушалі ўступаць, скажыце мне, каго і дзе, канкрэтнае прозвішча і навучальную ўстанову. Мы тут жа ўмяшаемся і адпаведным чынам адрэагуем. У статуце прапісана, што гэта павінна быць добраахвотнае рашэнне маладога чалавека.

— Што дае маладым людзям членства ў БРСМ?

— Асноўная задача нашай арганізацыі — дапамагчы маладому чалавеку знайсці сваё месца ў жыцці ў самым шырокім сэнсе гэтага слова. Калі ты можаш добра спяваць, мы дапаможам развіць гэты талент. Напрыклад, у хуткім часе мы адкрыем студыю гуказапісу ў рамках рэалізацыі праекта прадзюсарскага цэнтра «Прэм'ера». У нашым прадзюсарскім цэнтры любы чалавек на сучасным абсталяванні можа зрабіць запіс фанаграмы, сваю песню пакласці на музыку. Сёння не кожны можа апляціць выпуск песні ці альбома, і гэта стане магчымым для любога члена нашай арганізацыі, вядома ж, я зараз маю на ўвазе тых, у каго ёсць талент.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

З нажом у сэрцы

Тры тыдні не звяртаўся да ўрачоў 17-гадовы хлопец з Брэсцкай вобласці з пранікаючым раненнем сэрца, паведамляе АНТ.

У бойцы адзінаццацікласніку прабілі лёгкае і правы жалудачак сэрца, але пра раненне падлетак маўчаў, баючыся пакарання. Да спецыялістаў хлопец доўгі час не звяртаўся, але тое, што ён часта млеў, быў слабы і губляў у вазе, дало аб сабе знаць. Пасля аператыўнага ўмяшання хірургі Брэсцкай абласной бальніцы адкачалі з лёгкага хворага 2 літры вадкасці, а з-пад абалонкі сэрца — яшчэ літр. Урачы здзіўляюцца такой жывучасці хлопца і лічаць, што гэта беспрэцэдэнтны выпадак у айчыннай медыцыне. Цяпер жыццю хлопца нічога не пагражае, а сэрца павінна аднавіцца на працягу года.

Кар. БЕЛТА.

Кнігі — ад дэпутата

Чатыры сотні кніг падарыў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Іван Талкачоў Гомельскай абласной універсальнай бібліятэцы імя Леніна. Усе яны — з яго асабістай бібліятэкі. У свой час ён з'яўляўся чытачом гэтай бібліятэкі і лічыць сваім абавязкам аддзячыць ёй за веды. Ён паабяцаў прадоўжыць пачатую справу.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Сітуацыя на беларуска-польскіх пагранпераходах нармалізуецца

Сітуацыя на беларуска-польскіх пагранпераходах нармалізуецца. Аб гэтым паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка.

Паводле яго слоў, у напрамку грузавога пагранпераходу «Казловічы — Кукурыкі» за начную змену чарга скарацілася на 10 км. Польская мытная служба аформіла 500 аўтамабіляў. На раніцу змене на грузавым тэрмінале пачаў працаваць 21 мытнік пры нарматыве колькасці змены 16 супрацоўнікаў. Чарга каля пагранпераходу складае 3 км.

Таксама консульства Беларусі ў Бяла-Падляскі адзначае значнае змяншэнне колькасці велікагрузных аўтамабіляў на прыдарожных паркінгах у напрамку граніцы.

На двух іншых буйных грузавых пагранпераходах «Брабароўнікі — Бераставіца» і «Кузніца — Брузгі» з польскага боку ёсць чэргі велікагрузных аўтамабіляў. Разам з тым яны не крытычныя і хутчэй за ўсё іх можна супаставіць з чэргамі, якія існуюць на пагранпераходах звычайна. Паводле інфармацыі мытных службаў Польшчы, працуюць каля 80 працэнтаў складу звычайнай мытнай змены.

Адбываецца паляпшэнне сітуацыі і на ўкраінскім напрамку. З польскага боку скарачаецца чарга велікагрузных аўтамабіляў.

Пасольства Беларусі ў Варшаве атрымала пацвярджэнне інфармацыі аб нармалізацыі сітуацыі ад мытнай службы Міністэрства фінансаў Польшчы, якая выказала гатоўнасць прадоўжыць перагаворы з мэтай заключэння пагаднення паміж урадам Польшчы і прафсаюзамі мытнікаў.

Павел Латушка падкрэсліў, што сітуацыя апошніх дзён паказвае неабходнасць стварэння паміж Беларуссю і Польшчай умоў узаемнага аператыўнага абмену інфармацыяй аб такіх сітуацыях, а таксама сістэмы папераджальнага інфармавання паміж адпаведнымі службамі, што і прадугледжваюць існуючыя пагадненні, якія рэгулююць пытанні граніцы паміж Беларуссю і Польшчай. Гэтыя прапановы былі чарговы раз прадстаўлены польскім партнёрам.

Пасольства і консульствы Беларусі ў Польшчы прадаўжаюць адсочваць сітуацыю ў кантакце з цэнтральнымі і рэгіянальнымі пагранічнымі і мытнымі службамі Польшчы.

Кар. БЕЛТА.

Внимание!

РУП «Белпочта» **с 10 февраля по 10 марта 2008 года** проводит опрос-конкурс **«Лучшая почтовая марка Республики Беларусь 2007»**.

Посетив любое отделение почтовой связи, вы сможете ознакомиться с условиями конкурса и заполнить анкету. Вашу анкету с решением о лучшей марке 2007 года направляйте по адресу:

Издательский центр «Марка» РУП «Белпочта»
пр-т Независимости, 10, 220050, Минск
с пометкой: **Конкурс «Лучшая марка»**

Победители конкурса будут награждены памятными призами.

БЕЛПОШТА

Справки по телефону: **328-59-19**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион

по продаже 3-этажного кирпичного здания (общ. пл. 2038 кв.м, пл. зем. уч. 0,3611 га) и здания проходной (общ. пл. 10 кв.м, пл. зем. уч. 0,0049 га), расположенных: Смолевичский р-н, д. Будагово. Начальная цена снижена на 20 % и составляет 624 000 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.12.2007 г. Аукцион состоится 19.02.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 18.02.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

«РЭЦЭПТЫ» АД... АД'ЕЗДАЎ ЗА МЯЖУ

Вынікам скарачэння колькасці насельніцтва Беларусі становіцца дэфіцыт працоўнай сілы, ужо зараз краіне не хапае прыкладна 200 тысяч будаўнікоў. Прычым выйсцем у гэтай сітуацыі могуць быць змяншэнне колькасці выездаў на заробкі за мяжу і паступовае ўцягванне ў легальную эканоміку грамадзян, якія афіцыйна не працуюць, не вучацца і не займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю. А ў сваю чаргу, як адзначыў падчас калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны па выніках мінулага года віцэ-прэм'ер урада Аляксандр Косінец, у дадзеным выпадку ёсць толькі два варыянты — жыллё і вартая зарплата.

Марудней. Але ўніз

Сумныя прагнозы не спраўдзіліся. Пазалетась меркавалася, што на 1 студзеня 2008 года ў Беларусі павінны былі пражываць 9 млн 612 тыс. чалавек, але на справе гэты паказчык аказаўся 9 млн 689 тыс. Як заўважыў Аляксандр Косінец, зніжэнне тэмаў дэпапуляцыі сталася прамым вынікам прыняцця праграмы дэмаграфічнай бяспекі. З аднаго боку, прадастаўленне дадатковай дапамогі па нагашэнні льготных жыллёвых крэдытаў шматдзетным сем'ям, дапамогі ў пагашэнні жыллёвых камерцыйных крэдытаў шматдзетным і маладым сем'ям, рост дзіцячых дапамог стымулявала нараджальнасць. Летась яе паказчык павялічыўся на 7,3 працэнта, у Беларусі з'явілася на свет 103 425 чалавек, такім чынам, даводзіцца канстатаваць — краіна здолела пераадолець 100-тысячную адзнаку ўпершыню з 1995 года. І адначасова на 4 працэнты зменшылася смяротнасць, і ў тым ліку — сярод працаздольнага насельніцтва.

Разам з тым натуральнае дэмаграфічнае сальда па-ранейшаму застаецца адмоўным. Сапраўды, у нечым яго кампенсуе станоўчая міграцыя, аднак тут зноў-такі ёсць пытанні. Паводле слоў віцэ-прэм'ера, калі ў 2006 годзе з краіны з'ехала 8498, то летась — 9479 чалавек. Прычым не апошнюю ролю тут адыгрываюць так званыя «эканамічныя прычыны».

200. І менш ужо нельга

Няма сумненняў, што адной з па-сапраўднаму важкіх падстаў для ад'езду з'яўляецца адсутнасць работы. Як заўважаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, летась удалося стварыць 153,4 тыс. новых працоўных месцаў, сярод якіх больш за 18 тысяч — у малых гарадах. Як вынік, колькасць беспрацоўных у малых гарадах скарацілася амаль на 11 тыс. чалавек, або на 20,7 працэнта. А ў цэлым напружанне на рынку працы зменшылася ў 92 са 118 раёнаў краіны.

Асобная тэма — заробкі. Як паведаміла першы намеснік міністра Алена Колас, леташнія планы па росце зарплаты выкананы, але ці не галоўнае — павысілася яе пакупніцкая вартасць. За мінулы год суадносіны сярэдняй па краіне зарплаты і мінімальнага спажывецкага бюджэту палепшыліся на 27 пунктаў. І яшчэ. Таксама летась зніклі раёны, дзе зноў-такі сярэдні ўзровень аплаты працы не дасягаў 200 долараў у эквіваленце.

Разам з тым, падкрэсліваюць у міністэрстве, планы па павышэнні зарплаты не выканалі 12 раёнаў, а таксама значная частка камунальных прадпрыемстваў — на Магілеўшчыне такіх прадпрыемстваў было больш за 23 працэнты. У сувязі з гэтым, паведаміла Алена Колас, сёлета задача мець сярэдні ўзровень аплаты працы павінна датычыцца не толькі рэгіёнаў, але і ўсіх без выключэння арганізацый. Прычым да канца года арганізацый з меншымі паказчыкамі не павінна застацца ўвогуле.

Да таго ж зараз міністэрствам падрыхтаваны прапановы па павелічэнні заробкаў кіраўнікоў і высокакваліфікаваных спецыялістаў арганізацый, якія выконваюць прагнозныя паказчыкі развіцця. Мэты тут дзве — стымуляванне росту ВУП і спыненне выездаў прафесіяналаў у Расію і іншыя краіны.

Шануй што маеш

Не менш важнай «крыніцай» павелічэння працоўных рэсурсаў з'яўляецца зніжэнне паказчыкаў вытворчага траўматызму. Праверкі, замена састарэлага абсталявання і нават штрафы зрабілі сваю справу. Летась у краіне пры непасрэдным выкананні сваіх працоўных абавязкаў загінулі 232 і атрымалі цяжкія траўмы 755 работнікаў, што аказалася адпаведна на 14,7 і 3,2 працэнта менш, чым у 2006 годзе. Адначасова ўкладанні ў мадэрнізацыю вытворчасцяў дазволілі стварыць бяспечныя для здароўя ўмовы амаль на 56 тысячах працоўных месцаў.

Аднак у той жа час нельга не заўважыць, што па паказчыках вытворчага траўматызму Беларусь мае горшыя, у параўнанні з краінамі Еўрасаюза, паказчыкі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Рэзананс

І ён — з народам

На працягу кароткага часу «Звязда» двойчы (12 і 19 верасня) друкавала матэрыялы, прысвечаныя творчасці Алеся Гаруна. Але 16 лістапада з'явілася публікацыя, якая проста абавязвае зноў напісаць пра яго. Я маю на ўвазе артыкул У. Кузьміна «Легенды і паданні Кракава». Аўтар у ім апавядае пра сваё падарожжа ў старажытную сталіцу Польшчы. А ў канцы раіць пры выпадку наведаць там габрэйскі раён Казімеж, курган Касцюшкі, Плянты.

Але ж мы, беларусы, павінны ведаць, што ў Кракаве ў лістападзе 1920 года памёр Алесь Гарун, што ён пахаваны там на Ракавіцкіх могілках, што ў верасні 1988 года стараннямі актывістаў Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы на магіле паэта пастаўлены помнік...

І яшчэ адна інфармацыя: выдавецтвам «Мастацкая літаратура» падрыхтаваны зборнік твораў Алеся Гаруна «І я з народам».

Уладзімір КАЗБЯРУК,
г. Мінск.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08020

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.02.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 190,82
1 латвійскі лат	4 573,01
1 літоўскі літ	923,66
1 чэшская крона	122,070
1 польскі злоты	880,19
1 расійскі рубель	88,02
1 украінская грыўня	425,49

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,4262
10 UAH	47,9001
1000 BYR	11,3498
EUR	36,2900

Курс у гандлёвых кампаніях (на 31.01.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

КУРС — НА ЗДАРОЎЕ

У трэці раз у Рэспубліканскім гарналыжным цэнтры «Сілічы» праходзіць Міжнародны прэс-семінар, прысвечаны супрацоўніцтву Беларусі і Расіі ў галіне фізічнай культуры і спорту — «Здароўестваральная палітыка Беларусі і Расіі: фізічнае і духоўнае здароўе нацыі». Яго арганізатарамі выступілі Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы і Міністэрства інфармацыі Беларусі пры садзейнічанні міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі, спорту і турызму, Мінскага аблвыканкама.

Міністр інфармацыі нашай краіны Уладзімір Русакевіч адводзіць вядучую ролю ў фарміраванні ў чалавека прэстыжнасці здаровага ладу жыцця і зацікаўленасці клапаціцца аб уласным здароўі менавіта СМІ. Пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Беларусі створаны 9 відэаролікаў сацыяльнай рэкламы, сярод іх 4 — па тэматыцы «Здаровы лад жыцця». «У прапагандзе здаровага ладу жыцця далікатнасць залішняя, — заўважыў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» Уладзімір Русакевіч. — Тут варта казаць аб агрэсіўнасці, але гэтая агрэсіўнасць павінна быць адточаная! А гэта ўжо залежыць ад прафесіяналізму журналістаў. Наогул, варта часцей ладзіць такія семінары, сустрэчы з людзьмі, якія зацікаўлены ў прапагандзе здаровага ладу жыцця. І гэту працу трэба праводзіць комплексна, у рамках Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі, дзе ёсць асобны раздзел, прысвечаны здароўю». Міністр адзначыў, што моладзі трэба раўняцца на лепшыя прыклады — прынамсі, на нашых трохразовых алімпійскіх чэмпіёнаў Аляксандра Мядзведзя і Ірыну Радніну, якія сталі ганаровымі гасцямі семінара.

«Своеасаблівым штогадовым стартам інфармацыйнай работы ў гэтым з'яўляецца Міжнародная спецыялізаваная выстава «Тыдзень моды на здароўе». Акрамя таго, для актывізацыі работы журналістаў у прапагандзе здаровага ладу жыцця, зацвярджэння ў грамадстве высокіх маральных ідэалаў Міністэрствам інфармацыі праводзяцца штогадовыя рэспубліканскія творчыя конкурсы на лепшае асвятленне тэматыкі здаровага ладу жыцця, мацярынства і бацькоўства і г.д.», — дадала першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч.

Міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгараў нагадаў удзельнікам семінара: «У нашай краіне функцыянуюць звыш 22 тысяч аб'ектаў фізкультурна-спартыўнага прызначэння, культывуюцца звыш 130 відаў спорту. 30 працэнтаў фізічна актыўнага насельніцтва Беларусі займаецца фізкультурай і спортам. Мы хацелі б, каб у перспектыве гэты паказчык вырас як мінімум да 50 працэнтаў». Уся работа Міністэрства спорту і турызму і Нацыянальнага алімпійскага камітэта, адзначае міністр, накіравана на аздараўленне нацыі, перш за ўсё моладзі і падлеткаў.

Пра здароўе як вышэйшую каштоўнасць грамадства і фактар нацыянальнай бяспекі гаварыў намеснік міністра аховы здароўя, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Міхаіл Рымжа: «У сферы аховы здароўя прымаецца комплекс мераў, накіраваных на павышэнне даступнасці і якасці медыцынскай дапамогі, эфектыўнасці выкарыстання фінансавых, кадравых і матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў». Для ўзмацнення прафілактычнай накіраванасці ў рабоце сістэмы аховы здароўя ўстаноўлены парадак дыспансэрнага назірання дарослага насельніцтва краіны.

На Міжнародным прэс-семінары ішла гаворка таксама аб супрацоўніцтве Беларусі і Расіі ў галіне фізічнай культуры, спорту і аховы здароўя. Гэта і павышэнне кваліфікацыі медыцынскіх кадраў, дабрабыт, пытанні рэалізацыі, рэгістрацыі лекавых сродкаў і вырабаў медыцынскай тэхнікі, ліквідацыя наступстваў катастрофы на ЧАЭС. Беларусь і Расія арганізуюць сумесныя вучэбна-трэніровачныя зборы для спартсменаў. У спартыўнай навуцы і медыцыне ладзяцца культурна-спартыўныя фестывалі і мерапрыемствы па аздараўленні дзяцей і падлеткаў. Штогод праводзіцца спартакіяда Саюзнай дзяржавы для дзяцей «Юнацтва», арганізуюцца велапрабегі, злёты юных турыстаў, эколагаў, ваенна-патрыятычныя змены кадэтаў і суворавцаў Беларусі і Расіі, лячэнне і аздараўленне дзяцей з рэгіёнаў, найбольш пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы. Як адзначана ў пасланні Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Паўла Бародзіна, спартыўна-масавая работа і вялікі спорт будуць і надалей атрымліваць надзейную матэрыяльную і маральную падтрымку Саюзнай дзяржавы.

Ірына ПРЫМАК.
Мінск — Сілічы.

Прамая лінія

НАША СКУРА — ЛЮСТЭРКА ІМУНІТЭТУ

Адказвае ўрач-дэрматавенеролаг, загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурна-венералагічнага дыспансэра Уладзімір ЯРОМІЧ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

(Працяг. Пачатак у нумары за 30 і 31 студзеня.)

☎ — Тэлефануе Ніна Іванаўна з Навагрудскага раёна. Кожны месяц, калі я з'ем салёнага, з'яўляюцца пухіркі ў роце. Што гэта? Можа, герпес?

— Трэба разабрацца. Працэс мог пачацца з прыёму салёнай ежы, а потым гэтаксама арганізм стаў рэагаваць і на іншыя прадукты. Герпес не павінен рэцыдываць кожны месяц. Форма, якая часта паўтараецца, можа ўказваць на зрухі ў імуннай сістэме. Трэба зрабіць імунаграму, іншыя даследаванні. Звяртайцеся па кансультацыю да спецыяліста. Без агляду цяжка нешта сказаць.

☎ — Званю з Мінска, завуць Святлана. Пасля родаў у мяне з'явіліся пігментныя плямы на твары. Прайшло ўжо 16 гадоў, а яны павялічваюцца. Двойчы рабіла лазерную шліфоўку. Плямы не зніклі, а сталі ярчэйшымі. Працэдура дарагая. Ці варта яе рабіць яшчэ раз?

— Такая паталогія, як плямы на твары — вельмі індывідуальная. Пасля лазернай шліфоўкі кожны чалавек рэагуе па-рознаму. І адразу вызначыць, ці дасць працэдура негатыўную рэакцыю, немагчыма. Вам трэба прайсці агляд у спецыяліста, праверыць унутраныя органы — пячонку, ныркі, вызначыць, ці няма ў іх нейкай паталогіі. Магчыма, менавіта апошняе і выклікае непрыемныя праявы.

☎ — Званю з Мінска, завуць Наталля Канстанцінаўна. Скажыце, калі ласка, які від дыягностыкі хламідыёзу лічыцца самым эфектыўным? Чула, што гэта можа быць пасеў на пажыўнае асяроддзе.

— На сёння дакладным лічыцца, калі хламідыі выяўляюцца пры дапамозе не аднаго, а хоць бы двух розных метадаў. Напрыклад, рэакцыя імунафлюарысцэнцыі плюс полімеразна ланцуговая рэакцыя. Ёсць і пасеў на спецыяльнае пажыўнае асяроддзе. Галоўнае, каб ён быў зроблены якасна. У нашым дыспансэры мы яго не робім. У Мінску гэтым займаецца Інстытут мікрабіялогіі. Аднак, паўтарыся, на падставе нейкага аднаго метаду дыягназ не ставіцца.

☎ — Тэлефаную з Мінска, Марына. Мне 26 гадоў, з двухмесячнага ўзросту пакутую ад скурных захворванняў. Спачатку дыятэз, потым экзэма, атапічны дэрматыт і ўжо зараз нейрадэрміт. Чым толькі ні лячылася: і з дапамогай афіцыйнай медыцыны, і народнымі сродкамі, але нічога не дапамагае. Як мне быць?

— Вы даўно звярталіся да дэрматолага?

— Летась.

— Вам трэба яшчэ раз абавязкова падысці да доктара. Калі лячэнне не дапамагае, урач можа вас накіраваць да спецыялістаў больш высокага ўзроўню, напрыклад, у кансультацыйны цэнтр, які працуе на базе нашага дыспансэра. Панацэі пры дадзеным захворванні не бывае. Тут трэба падбіраць лячэнне, і часам яно падбіраецца не за адзін і нават не за дзесяць разоў. Акрамя таго, магчыма, спатрэбіцца лячэнне любой спадарожнай паталогіі. Бо хранічнае захворванне можа пагражаць абвастрэннем скурнай хваробы.

☎ — Аксана Уладзіміраўна з Любанскага раёна звоніць. Майму дзіцяці 14 гадоў. Дыягназ — себарэйны дэрматыт твару з экзэматызацыяй. Апошнія два гады ідзе абвастрэнне. Пераілі абследаваць брушную поласць, абследавалі — нармальна, алерголаг сказаў, што няма алергіі, эндакрынолаг таксама паталогій не знайшоў. Фібрагастраскапія паказала: хранічны гастрыт з дэудэмна-гастральным рэфлексам. Прызначылі лячэнне, дыету, але са скурай лепш не стала. Што нам рабіць?

— Я думаю, вам варта даабследавацца. Магчыма, адной дыеты недастаткова, патрэбна спадарожнае лячэнне. З яго аб'ёмам павінен вызначыцца спецыяліст. Вы можаце папрасіць накіраванне і ў наш кансультацыйны цэнтр.

☎ — Нэла Уладзіміраўна, званю з Мінска. У мяне на твары, на канечнасцях ёсць застарэлыя цёмныя бародаўкі. Як пазбавіцца ад іх?

— Хутчэй за ўсё, гэта не зусім бародаўкі, а себарэйныя кератомы. Яны выдаляюцца ў касметычных лячэбніцах па месцы жыхарства. Але, на жаль, гэта не значыць, што яны не з'явяцца зноў, праз некаторы час непрыемнасць можа вярнуцца. Калі гэтых утварэнняў вельмі шмат і апошнім часам яны пачалі рэзка з'яўляцца, то перш чым ісці да касметолага, абавязкова наведайце анколага, каб ён пацвердзіў, што гэта дабраякасныя ўтварэнні, якія можна выдаліць.

☎ — Тэлефаную з Мінска, Вера Максімаўна. Майму сыну 16 гадоў. Некалькі гадоў таму ў яго дыягнаставалі кантактны дэрматыт. У тым месцы, дзе спражка ад рэменя сутыкаецца з целам, з'яўляецца раздражненне, патлівасць. Былі на прыёме ў дэрматолага на Смалячкова, выпісалі прэпараты, а яны не дапамагаюць. Што, гэта на ўсё жыццё, ці можна вылечыць? Ці можна зрабіць скуру больш стойкай?

— Калі спецыялісты сапраўды пераканаліся, што ідзе рэакцыя на спражку, зробленую з нейкага металу, то, зразумела, пры кантакце з гэтым металам дэрматыт будзе развівацца. Таму вам трэба прытрымлівацца пэўных правілаў. Пажадана як мага радзей насіць рамяні са спражкамі з металу, ці насіць такія, дзе металу мінімум. Калі юнак носіць джынсы, то знутры, там, дзе знаходзіцца адваротная частка металічнай заклёпкі, трэба зашыць яе кавалачкам тканіны, каб не было кантакту металу са скурай. Бо ў іншым выпадку з кожным разам працэс будзе ісці горш і горш, а лячыць яго стане больш складана. Магчыма, працэс нечакана спыніцца. Аднак рэгулярна трэба звяртацца да дэрматолага. Лепш за ўсё выключыць на доўгі час кантакт з металам. А потым паглядзець, ці з'явіцца прыкметы дэрматыту. Доктар параўнае ранейшыя вынікі з цяперашнімі і прызначыць адпаведнае лячэнне. Каб зрабіць скуру больш стойкай, трэба, па-першае, захоўваць правілы асабістай гігіены; па-другое, дазіраваць фізічныя нагрузкі; па-трэцяе, перыядычна прымаць вітаміны А і Е, якія «адказваюць» за скуру і ўсё, што на ёй. Нарэшце, абавязкова рэгулярна наведваць дэрматолага.

☎ — Добры дзень, Уладзімір Іванавіч. Званю з Пухавіцкага раёна, завуць Ніна Пятроўна. У нас вельмі далікатная праблема. Майму мужу 65 гадоў і апошнія 25 з іх на машонцы з'явіліся буйныя бародаўкі, іх шмат. Муж не хоча ісці да ўрача, саромеецца. Падкажыце, да якога доктара звярнуцца, каб ён паставіўся да нас з павагай? Увогуле мы прапісаны ў Мінску.

— Калі ёсць нейкія высыпкі на скуры, безумоўна, перш-наперш трэба звярнуцца да дэрматолага. Ён вырашыць, дэрматалагічныя гэта праблемы ці нешта іншае. Саромецца тут няма чаго, урачы не праяўляюць негатыўных адносінаў да пацыентаў. Можаце прыйсці ў дыспансэр і паказацца мне.

☎ — Вілейка, на провадзе Галіна. У сына атапічны дэрматыт. Плямы на твары, руках, лушчацца. Ён пераехаў вучыцца ў Полацк, стала яшчэ горш. Напэўна, там клімат іншы і ад гэтага здарылася абвастрэнне. Што рабіць?

— Без агляду параіць нічога нельга. Вашаму сыну трэба звярнуцца да дэрматолага, у дадзеным выпадку па месцы жыхарства ў Полацку. І ўжо ў залежнасці ад таго, што ў яго ёсць на скуры, якія скаргі, яму падбяруць лячэнне.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

Школа падаткаплацельшчыка

КАЛІ ГРОШЫ НА БУДАЎНІЦТВА КВАТЭРЫ ПАЗЫЧЫЛІ БАЦЬКІ

Рэдакцыя працягвае адказваць на самыя актуальныя пытанні нашых чытачоў. Сёння чарговую кансультацыю нашаму выданню дае ***старшы дзяржаўны падатковы інспектар Міністэрства па падатках і зборах Павел СЛЕСАРАЎ.***

— У верасні 2007 года я атрымаў кватэру ў шматкватэрным доме, які быў пабудаваны ў складзе ЖБК, як маючы патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Дом быў здадзены без унутранай аддзелкі. Ці маю я права на вызваленне ад падаткаабкладання затрат, якія звязаны з рамонтам, і якія дакументы трэба для гэтага прадаставіць?

Генадзь БЕЛЫ, *г. Мінск.*

— У дадзеным выпадку вы маеце права на маёмасны падатковы вылік толькі тады, калі вы адмовіліся ад аддзелачных работ, якія былі прадугледжаны праектнай дакументацыяй.

У гэтай сітуацыі расходы, панесеныя вамі пры ажыццяўленні аддзелачных работ, у тым ліку расходы на набыццё будаўнічых матэрыялаў вылічваюцца з падаткаабкладальнага даходу.

Падцвярджальным дакументам (акрамя іншых, пералічаных у артыкуле 15 Закона «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў») з'яўляецца даведка арганізацыі забудоўшчыка ці падрадчыка (субпадрадчыка) аб кошце адмоўленых работ і дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату плацельшчыкам тавараў, работ, паслуг, набытых і (або) выкананых у межах адмоўленых работ.

Нагадаем, што адмоўленымі лічацца работы па:
— аддзелцы сцен і столяў (акрамя тынкавання);
— унутранай аддзелцы памяшканняў (паклейка шпалераў, фарбаванне, абліцоўка);
— па пакрыцці падлогі (акрамя дашчанай);
— убудоўванні мэблі;
— устаноўцы дзвярных блокаў у міжпакойных перагародках;
— устаноўцы сантэхнічных прыбораў і абсталявання (прыбораў уліку вады і газу);
— устаноўцы электрычных пліт.

— Летась, як маючы патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, заключыў з будтрэстам дагавор долевага будаўніцтва кватэры ў жылым доме і ў 2007 годзе атрымаў яе. Крэдыты банка не выкарыстоўваліся. Для атрымання маёмаснага падатковага выліку я падрыхтаваў усе неабходныя дакументы і падаў у бухгалтэрыю свайго прадпрыемства. Там мне паведамілі, што я не маю права на гэты від ільгот, бо ў плацёжках у радку «плацельшчык» указаны дзеныя майго бацькі. Разам з тым у радку «від плацяжу» адзначана, што грошы пераведзены на долевае будаўніцтва кватэры ўжо на маё імя, згодна з дагаворам будаўніцтва № N. Пералічаныя грошы бацька мне пазычыў. Няўжо наяўнасць прозвішча майго бацькі ў плацёжках пазбаўляе мяне права на льготу, аднак у будтрэсце па ўсіх дакументах плацельшчыкам і ўласнікам жылля з'яўляюся менавіта я. Згодна з тлумачэннямі падатковых інспектараў у маім выпадку крыніца грашовых сродкаў (крэдыт, пазыка, накапленні) не мае значэння. Растлумачце, можа трэба мець дакумент, які пацвярджае той факт, што мой бацька даў мне грошы ў доўг?

Іван Іванавіч, *г. Баранавічы.*

— Бухгалтэрыя прадпрыемства адмовіла вам у прадастаўленні маёмаснага падатковага выліку правамерна, бо яны не атрымалі дакумента, які пацвярджае факт расходавання менавіта вамі грашовых сродкаў на будаўніцтва кватэры. Права на маёмасны падатковы вылік вы будзеце мець пасля прадстаўлення дагавора пазыкі і толькі ў той суме, якую ў 2007 годзе вярнулі бацьку ў якасці пагашэння доўгу, г.зн. фактычна панесеных вамі расходаў, якія павінны быць дакументальна пацверджаны (напрыклад, распіскай).

Тут трэба дадаць, што ўжо з першых дзён 2008 года выліку падлягае сума вернутай пазыкі, якая была атрымана толькі ад беларускіх арганізацый і (або) індывідуальных прадпрымальнікаў.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

Інфарм-укол

НАВОКАЛ — ПРАСТУДА

Сітуацыя небяспечная ў тым выпадку, калі вы схільныя да прастудных захворванняў. Мы заражаемся віруснымі інфекцыямі, як правіла, калі хто-небудзь побач чхнуў ці кашлянуў, або калі дакранаемся да інфекцыяванай паверхні, а пасля да свайго твару. Вось чаму так важна мыць рукі, і не проста апаласкаць.

■ Дасканала мыйце рукі, прычым некалькі разоў на дзень! Даследаванні паказалі, што такія меры засцярогі зніжаюць магчымасць распаўсюджвання заразы практычна на 70 працэнтаў.

■ Выцірайце пыл. Ручкі дзвярэй і трубку тэлефона пажадана праціраць спецыяльным дэзінфікуючым сродкам.

■ Імкніцеся не дакранацца рукамі да твару. Вірусы пранікаюць у арганізм праз слізістую абалонку вачэй, носа і рота.

■ Той, хто захварэў, павінен карыстацца толькі аднаразовымі носаўкамі і выкідаць іх адразу пасля выкарыстання.

■ Апранайцеся па надвор'ю. Пераахаладжэнне значна павышае рызыку ўзнікнення прастудных захворванняў.

■ У халодны час імкніцеся трымаць рот закрытым, дыхайце толькі носам.

ХТО «ГАТУЕ» ШТУЧНЫ МЁД?

Штучны — гэта мёд, атрыманы не з сот, а на фабрыках з бурачнага ці трысняговага цукру, кукурузы або соку кавуна. Пчолы да гэтага працэсу не маюць ніякага дачынення.

Цукроза расшчапляецца лімоннай кіслатой, частка вады выпарваецца, сумесь згушчаецца, жаўцее і ў выніку з'яўляецца салодкі прадукт з прыемным водарам. Штучны мёд носіць умоўную назву «мёд кавуновы», «дынны», «бурачковы» і г.д. У ім няма ўласцівых натуральнаму мёду ферментаў і водару, але дастаткова вугляводаў, мінеральных і спажыўных рэчываў. Рабіць з яго сумесі ад кашлю, вядома ж, не варта — у ім няма лекавых вартасцяў, а вось як падсалоджвальнік страў, ён вельмі добры — лёгка засвойваецца і, як правіла, поўнасцю не цукруецца.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Беларусь ім — другая радзіма

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*У Васілевіцкай спецыялізаванай школе-інтэрнаце для дзяцей з парушэннямі зроку зараз навучаецца 84 вучні. Трое з іх — **Таццяна ЧУЙКО** і сёстры-двайняткі **Наста** і **Кацярына ПАЖАРСКІЯ** — з Расіі. Гэтыя дзеці адносяцца да самай складанай групы навучання — па сістэме Брайля.*

Няўдзячны лёс, а менавіта адсутнасць зроку ад нараджэння, прывёў гэтых дзяўчынак у Беларусь. У Бранскай вобласці, дзе цяпер жывуць іх бацькі, няма адпаведнай становішчу навучальнай установы. Бліжэйшая аказалася ў беларускіх Васілевічах. Тут дзяўчынак не толькі вучаць, але і лечаць. Галоўны настаўнік для гэтай катэгорыі вучняў — Вольга Паўлючэнка, спецыяліст курса па развіцці зрокавага ўспрымання і прасторавай арыенціроўкі. Сем гадоў працуе яна ў гэтай спецыфічнай установе. Скончыўшы Мінскі педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, настаўніцай вярнулася ў родны горад, дапамагае дзецям спасцігаць і разумець свет, рабіць яго лепшым.

Крымінал, здарэнні

ЛЯЛЬКА ЗА $25 ТЫСЯЧ

Украінскія пагранічнікі сумесна з супрацоўнікі СБУ падчас пагранічна-мытнага афармлення цягніка «Кіеў—Мінск» у пункце пропуску «Гарнастаеўка» спынілі спробу вывазу з Украіны кантрабандных валюты.

Парушальнікам, які спрабаваў перапраўіць цераз мяжу амаль $25 тыс., аказаўся 22-гадовы грамадзянін Беларусі, паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнай пагранічнай службы Украіны. Аб магчымым незаконным перамяшчэнні ім значнай сумы валюты вартавыя парадку даведаліся загадзя, таму вырашылі старанна праверыць яго багаж і купэ. Аглядальная група звярнула ўвагу на падарункавы набор, які вёз беларус, — дзве дзіцячыя лялькі. У адной з лялек і былі знойдзены $24,9 тыс. Кантрабандныя грошы канфіскаваны і перададзены ў мытныя органы Украіны. Гэта ўжо не першы выпадак, калі ў дзіцячых лялька спрабуюць перапраўіць цераз мяжу кантрабанду. Звычайна ў іх хаваюць наркатычныя або псіхатропныя рэчывы.

Кар. БЕЛТА.

ДАВЕРЛІВАСЦЬ ЦАНОЙ У 2500 ЕЎРА

Дзве з паловай тысячы еўра страціў сталічны пенсіянер пасля візіту дзвюх невядомых жанчын.

76-гадовы стары, дарэчы, пацярпеў з-за ўласнай даверлівасці: пенсіянер упусціў у жыллё прайдзісветак, якія назваліся сацыяльнымі работнікамі. Кабеты ж, карыстаючыся гасціннасцю гаспадара, дарэмна час не марнавалі: яны не толькі віліся вужакамі вакол сваёй ахвяры, але паспелі незаўважна вычысціць і назапашаныя грошы. Зараз праваахоўнікі адшукваюць «спагадлівых» візіцёрак.

Ігар ГРЫШЫН.

ДЗЯЎЧАТКІ НЕ РАЗГУБІЛІСЯ

Іх было трое, яны вярталіся дадому (вёска Перарост Добрушскага раёна) са школы. Дзяўчаткам захацелася скараціць дарогу і заадно пакоўзацца па лёдзе на мясцовым возеры.

Адна з іх неабачліва ступіла на тонкі лядок, якім была зацягнута палонка, прабітая некім для лоўлі рыбы, і правалілася. Адна сяброўка пабегла клікаць на дапамогу дарослых, а другая ўтрымлівала яе за руку, каб тая не патанула. Усё закончылася добра.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

«ПЕРСПЕКТЫЎНАЯ» ШКОЛЬНІЦА

Хто вырабляе 20-тысячныя фальшывыя купюры ў Кобрынскім раёне, супрацоўнікі міліцыі выявілі хутка. Першай засвяцілася жанчына, якая прыйшла разлічыцца фальшыўкамі на пошту.

Яе затрымалі і выйшлі на 22-гадовага хлопца з вёскі Луцэвічы. А ўжо ён вывеў сышчыкаў на дзевяцікласніцу з гэтай жа вёскі, якая і выпускала 20-тысячныя купюры ў сябе дома. Школьніца доўга не ламала галаву, як наладзіць выпуск грошай. Уключыла камп'ютар, і прынтар пачаў выдаваць прадукцыю. Што чакае дзевяцікласніцу — пакажа час і суд.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПАСПЯШАЎСЯ — І ЗДАРЫЛАСЯ ТРАГЕДЫЯ

Віноўнікам яе, як паведамілі нам у прэс-цэнтры ўпраўлення дзяржаўтаінспекцыі УУС Гомельскага аблвыканкама, стаў малады чалавек, кіроўца легкавога аўтамабіля «Міцубісі».

На вялікай хуткасці ён выехаў на паласу сустрэчнага руху на аўтатрасе Гомель — Мінск і ўрэзаўся ў «Мерседэс», за рулём якога быў таксама малады чалавек. Ён, а таксама яго жонка, дарэчы, цяжарная, загінулі на месцы здарэння, а іх трохгадовы сынок, які знаходзіўся на заднім сядзенні, быў дастаўлены ў бальніцу са шматлікімі траўмамі. Туды ж трапілі і вадзіцель «Міцубісі» з пасажыркай. Вось такая дарагая цана паспешлівасці і неабачлівасці.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАДУМАЙ, ШТО ЗАБІЎ

Адразу некалькі членаў сям'і з вёскі Міцюкова Сенненскага раёна сталі ахвярамі ўжывання алкаголю.

Адзін з іх скончыў жыццё самагубствам, паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні прафілактыкі УУС Віцебскага аблвыканкама.

Пенсіянер, якому было 64 гады, пайшоў на гэта, бо знайшоў у доме трупы са слядамі пабояў на тварах сваёй 57-гадовай жонкі — пенсіянеркі і яе 52-гадовага брата, што працаваў рабочым у сельскагаспадарчым кааператыве. Падумаў, што забіў, ды вырашыў сам пайсці з жыцця. Раней неаднаразова ў хаце былі бойкі пасля хмельных застолляў. Напэўна, і вырашыў гаспадар, што на гэты раз забіў блізкіх, ды забыўся пра гэта. Але ж, як установлена ў выніку судовага-медыцынскага даследавання, жонка і яе брат памерлі ад атручвання алкаголем. Піў і сам гаспадар, ды загінуў не ад гарэлкі...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«МАБІЛЬНАЯ» ПЛЫНЬ

Адразу тры спробы незаконнага ўвозу мабільных тэлефонаў спынілі беларускія мытнікі на мяжы з Літвой.

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта, уся «мабільная кантрабанда» перавозілася ў рэйсавых аўтобусах. Так, у аўтобусе «Вільнюс — Ашмяны» было выяўлена больш за 170 мабільнікаў агульным коштам амаль 100 мільёнаў рублёў. Патаемнае месца для тэлефонаў было рассакрэчана і ў аўтобусе «Вільнюс — Мінск». Там захоўваліся 76 мабільнікаў і 750 картаў памяці на суму 62 мільёны рублёў. А ў аўтобусе, які накіроўваўся з Каўнаса ў Мінск, мытнікі знайшлі 200 новых і 40 былых у карыстанні мабільнікаў агульным коштам больш за 96 мільёнаў рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Трылесінцы навучацца плаваць

У пасёлку Трылесіна Дрыбінскага раёна 31 студзеня ўрачыста адкрыўся новы спартыўны комплекс на базе школы.

У склад комплексу ўваходзяць басейн, трэнажорная зала, шахматна-шашачны клуб, абноўленая спартыўная зала. Тут можна гуляць у настольны тэніс і більярд.

На паказальныя выступленні магілёўскіх плыўцоў прыйшлі паглядзець мясцовыя жыхары. Усім, хто захоча навучыцца плаваць, у комплексе прапануюць абанементы: білет на адно наведванне каштуе 3200 рублёў для дарослых і 2100 — для дзяцей. Для малых, канешне, запланаваныя школьныя ўрокі плавання.

І бліжэйшы час басейны адкрыюцца ў Бялынічах, Крычаве і пасёлку Ходасы Мсціслаўскага раёна. На працягу двух-трох гадоў, абяцае кіраўніцтва Магілёўскай вобласці, у кожным раёне з'явіцца сучасны плавальны басейн. І плюс да гэтага — крытыя лядовыя пляцоўкі ў буйных раённых цэнтрах. Улада хоча прыцягнуць як мага больш людзей да фізічнай культуры і спорту.

Ілона ІВАНОВА.

«Гарачы тэлефон» для прадпрымальнікаў

Тлумачэнні па праблемных пытаннях функцыянавання прыватных унітарных прадпрыемстваў, якія створаны індывідуальнымі прадпрымальнікамі, можна будзе атрымаць па тэлефоне. Як паведамляюць у Міністэрстве эканомікі, дзейнічаць нумары тэлефонаў «гарачых ліній» будуць да 1 сакавіка ў міністэрствах, установах, аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.

Такім чынам, тэлефон гарачай лініі Мінэканомікі — 200-41-23, Мінфіна — 222-69-61, 200-54-74, 222-66-40, 200-51-12, Міністэрства па падатках і зборах — 289-15-14, 222-65-16, Міністэрства юстыцыі — 200-97-55, Міністэрства аховы здароўя — 212-47-07, 292-03-25, 331-27-02, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — 222-49-54, Міністэрства гандлю — 227-12-52, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі — 200-87-09, Міністэрства транспарту і камунікацый — 293-41-84, 291-90-11, Нацыянальнага банка — 289-37-98, 218-57-77, 289-46-82, 289-95-55, 239-01-19, Дзяржкамітэта па стандартызацыі — 233-37-69, Дзяржаўнага мытнага камітэта — 218-90-00, Дзяржкамітэта па маёмасці — 284-67-72. Тэлефоны «гарачых ліній» аблвыканкамаў: у Брэсце — 8-0162-23-48-29, 8-0162-21-91-08, Віцебску — 8-0212-36-58-84, 8-0212-37-27-10, Гомелі — 8-0232-74-44-69, 8-0232-74-24-82, Гродне — 8-0152-74-34-24, 8-0152-72-32-05, Мінску — 500-41-27, Магілёве — 8-0222-31-00-75, 8-0222-46-84-57, у Мінгарвыканкаме — 220-28-73.

Ігар ГРЫШЫН.

«РЭЦЭПТЫ» АД... АД'ЕЗДАЎ ЗА МЯЖУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таму, прапанаваў Аляксандр Косінец, сёлета трэба распрацаваць спецыяльныя праграмы паляпшэння здароўя ва ўсіх арганізацыях. Апроч усяго, гэта дапаможа знізіць колькасць захворванняў і, адпаведна, прывядзе да росту эканамічных паказчыкаў. Так, пралічана: толькі 2-разовае зніжэнне захваральнасці павялічыць ВУП Беларусі на 2,5 працэнта.

Не менш вострай застаецца сітуацыя з працоўнай дысцыплінай. Летась 32,1 працэнта работнікаў, якія загінулі, і 11,2 працэнта работнікаў, што атрымалі цяжкія траўмы, знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. І сумная «раскладка» атрымалася нягледзячы на тое, што за «мацныя» напоі было скасавана прыкладна 4,5 тысячы працоўных кантрактаў.

Час «зруху» дапамог на догляд?

Між тым, праграма дэмаграфічнай бяспекі павінна мець і яшчэ адзін вынік — павелічэнне працягласці жыцця і долі насельніцтва ў пажылым узросце. Таму, паведаміла намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна, адным з галоўных напрамкаў становіцца аптымізацыя сеткі сацыяльных устаноў і, у прыватнасці, стварэнне пунктаў сацыяльнага абслугоўвання за межамі райцэнтраў. Не менш вострае пытанне з дамамі-інтэрнатамі. Летась тут удалося стварыць 578 месцаў, тым не менш у чарзе ў стацыянарныя ўстановы працягвае знаходзіцца каля 1,4 тыс. чалавек. Праўда, ліквідаваць чаргу плануецца ўжо да 2010 года і да таго ж часу ёсць намер прывесці ўсе без выключэння інтэрнаты ў адпаведнасць з санітарнымі нормамі.

Большую актуальнасць набудзе і праблема пенсій. У снежні мінулага года сярэдняя пенсія па ўзросце склала 345,4 тыс., сярэдняя пенсія па інваліднасці — 299,9 тыс., па страце карміцеля — 201,1 тыс., па выслузе гадоў — 459,5 тыс., а сацыяльная пенсія — 123,5 тыс. рублёў. Як адзначыла Марыяна Шчоткіна, гэта самыя высокія паказчыкі ў СНД, прычым пенсіі будуць павышацца і сёлета — мяркуецца, што сярэдняя намінальная пенсія ўзрасце на 17,8 працэнта. У той жа час, падкрэсліла намеснік міністра, таксама сёлета трэба звярнуць асаблівую ўвагу і на адну з праблем — нізкі памер сацыяльных пенсій, а таксама дапамог па доглядзе састарэлых ва ўзросце больш за 80 гадоў і інвалідаў.

Сяргей ГРЫБ.

Спачатку вынік, потым — зарплата?

У 2008 годзе паказчыкі росту вытворчасці працы павінны апярэдзіць рост рэальных заробкаў — аб гэтым падчас пасяджэння Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях з удзелам прадстаўнікоў урада, прафсаюзаў і аб'яднанняў найманых работнікаў заявіў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур.

План плюс 29 долараў

795,4 тысячы рублёў, ці 369 долараў у цэлым па краіне і 709,3 тысячы рублёў (329 долараў) па бюджэтнай сферы — такімі аказаліся вынікі снежня мінулага года па сярэдняй зарплаце. Адпаведна, як зазначыў Андрэй Тур, летась тут удалося не проста выйсці на запланаваную адзнаку, але і перавысіць яе на 29 долараў. Адначасова атрымалася перавысіць першачарговыя планы па росту рэальных заробкаў, а таксама дакладна ўкласціся ў прагноз па суадносінах (108 працэнтаў) мінімальнай зарплаты і бюджэту пражыткавага мінімуму.

Яшчэ адным цікавым вынікам мінулага года сталася скарачэнне «разрыву» па аплаце працы паміж галінамі-лідарамі і галінамі-аўтсайдарамі. Калі ў пачатку мінулага года сярэднія заробкі па прадпрыемствах нафтахіміі і ў сельскай гаспадарцы адрозніваліся ў 3,63, то ў снежні — ужо ў 3,33 раза. Прычым падобны малюнак перш-наперш атрымаўся дзякуючы больш хуткаму росту па АПК. Меркавалася, што напрыканцы мінулага года сярэднестатыстычны вясковец будзе зарабляць 185—200, тады як на справе гэты паказчык склаў 210 долараў у эквіваленце.

Тарыфная стаўка і «свае сілы»?

Між тым, што чакае нас сёлета? Як нагадаў Андрэй Тур, вызначана, што па выніках гэтага года паказчыкі работы сельскай гаспадаркі павінны «сплюсаваць» на 8,5, прымысловасці — на 11, павелічэнне інвестыцый у асноўны капітал складзе 25, а рост валавога ўнутранага прадукту — 11 працэнтаў. На тыя ж 11 працэнтаў будзе «арыентавацца» і павышэнне рэальных даходаў насельніцтва. У прыватнасці, меркаваны рост зноў-такі рэальнай сярэдняй зарплаты вызначаны ў 8,7 працэнта. Гэта мэта з'яўляецца прыкладна аднолькавай як для вытворцаў, так і для невытворцаў, праўда, падкрэсліваюць ва ўрадзе, тут бюджэтнікі мусяць разлічваць не

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

1

ЛЮТАГА
2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 5 (15509)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Кубінская энергія для беларускай публікі

У Мінску ўпершыню пад патранатам Пасольства Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь пройшоў фестываль кубінскай культуры «Энергія сальсы». А гэта значыць — не толькі жывая музыка, яркія касцюмы і палкія танцы, але і майстар-класы па найбольш папулярных з клубных лацінаамерыканскіх танцаў, розныя танцавальныя і музычныя конкурсы і ўвогуле зусім іншая па энергетыцы, экзатычная атмасфера… Нездарма ў афішах асобна ўказвалася: дрэс-код — кубінскі стыль, «лаціна».

У якасці аднаго з галоўных сюрпрызаў быў прыезд самага папулярнага інструктара афра-кубінскіх танцаў, а па сумяшчальніцтве аніматара — па-простаму кажучы, масавіка-завадатара, Ёрга «Camaquey» з Кубы. Гэтаксама ў мерапрыемствах фестывалю ўзялі ўдзел госці з кубінскага пасольства ў Беларусі, прадстаўнікі вядучай беларускай школы сальсы «SalsaBreeze», маладыя музыканты і мастакі бодзі-арту, і, зразумела, спецыялісты кубінскай кухні. «Выконваць сацыяльныя танцы, а менавіта сальсу, можа кожны чалавек — незалежна ад узросту, статусу, узроўню адукацыі, каштоўнасцяў, установак і нават здароўя, — сцвярджаюць арганізатары. — Гэты танец дапамагае фарміраваць субкультуру са станоўчай дынамікай».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

БАРЦЫ-МАЛАЙЦЫ!

У пасёлку Дружны Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці адбыўся XII Рэспубліканскі турнір па грэка-рымскай барацьбе памяці Уладзіміра Шаманоўскага.

У юнацкіх спаборніцтвах бралі ўдзел 224 спартсмены. Прыехалі каманды з Расіі (Санкт-Пецярбург), Украіны (Кіраваград). Беларусь прадстаўлялі барцы з Мінска, Брэста, Гомеля, Мазыра, Барысава, Бабруйска, Беразіно, Дружнага, Маладзечна, Свіслачы. Арганізатары турніру — ТЭЦ-5 і кіраўнік секцыі па грэка-рымскай барацьбе пасёлка Дружны — Армэн Джанамян. Ён рыхтуе вельмі моцных барцоў. Яго вучні на ўсіх спаборніцтвах займаюць прызавыя месцы.

У спаборніцтвах удзельнічалі спартсмены ў вагавых катэгорыях ад 26 да 100 кг, ва ўзросце ад 8 да 17 гадоў. Было разыграна 15 камплектаў узнагарод.

Ірына ДЗЯДКОЎСКАЯ, вучаніца 11 «Г» класа школы № 30 г. Мінска.

Віншуем любую матулю **Таццяну Трафімаўну МАШЧОНСКУЮ з 80-годдзем.** Жадаем бадзёрага настрою і добрага здароўя.

Родная! Адзіная! Святая!
Ты — прамень наш
праз увесь Сусвет.
Да тваіх далоняў прыпадаем.
Стомленай нагі цалуем след.

Дочкі Валянціна, Алена, Раіса і іх сем'і. г, Жодзіна.

«ДАВЯРАЦЬ МОЛАДЗІ»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Усе напрамкі жыцця сённяшняй моладзі нам цікавыя. Гэта і працаўладкаванне, і пытанні прафарыентацыі. Некалькі гадоў таму ўсе рванулі ў юрысты, эканамісты, і сёння гэтыя спецыяльнасці для многіх абітурыентаў застаюцца прыярытэтнымі. І яны не разумеюць, што па некаторых інжынерных, будаўнічых спецыяльнасцях заработная плата нават вышэйшая, чым у юрыста. У прафарыентацыі мы таксама знайшлі сваю нішу. Мы даём маладым людзям магчымасць рэалізаваць сябе як лідара. Наша праграма «Лідар» ставіць задачу дайсці да самага ніжэйшага звяна — кожны сакратар нашай пярвічнай арганізацыі ў класе, у групе, на прадпрыемстве павінен быць рэальным лідарам. Пошук лідара мы будзем ажыццяўляць на альтэрнатыўнай аснове — шляхам выбараў. Школьнікі, студэнты павінны самі выбіраць тых, за кім яны хочуць ісці. Такія лідары ёсць, іх бачна ў любым калектыве. У кожным калектыве ёсць тыя, пра каго гавораць кожны дзень, і тыя, хто «шэранька», імкнучыся не вылучацца, усё жыццё і правёў. Праграма «Лідар» дае магчымасць рэалізаваць сябе.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Давайце падрабязней спынімся на працаўладкаванні моладзі. Летась ваша арганізацыя працаўладкавала каля 52 тысяч маладых людзей, больш за тысячу выехала за межы Беларусі…

— Цяпер мы пераглядаем гэтыя пазіцыі і бяром курс не на працаўладкаванне за мяжой, а ў нашай краіне. У нас сёння не хапае працоўных рук, вялікая колькасць аб'ектаў, якія будуюцца, аграгарадкоў, спартыўных аб'ектаў. Таму прымяненне можна знайсці ў нашай краіне, тым больш, што цяпер у нас дастойная заработная плата. Магчымасці для моладзі ёсць і ту, без выезду за тысячы кіламетраў у Расію, Крым (летась нашы хлопцы на БАМ нават ездзілі). Такія паездкі магчымыя, безумоўна, і зараз, як даніна павагі тым традыцыям, якія мы перанялі ад камсамола. Разам з тым, сёння мы задумваемся не проста над стварэннем студатрада, але і аб тым, як якасна яго палепшыць. Атрад павінен быць асобнай адзінкай са сваім бухгалтарам, камісарам, камандзірам, урачом, які можа пражываць на асобна ўзятай тэрыторыі і выконваць пэўны аб'ём работ. Мы павінны дапамагчы студэнтам не проста быць рознарабочымі, якім прапаноўваюць самую нізкакваліфікаваную працу і адпаведна малы заробак. Мы маем намер на базе тых жа ПТВ стварыць цэнтры падрыхтоўкі, дзе за некалькі тыдняў на курсах студэнт можа атрымаць сертыфікат муляра, цесляра, і з гэтымі ведамі на будоўлі ён будзе, скажам, не раствор размешваць, а класці цэглу. Зараз, несумненна, у больш выйгрышнай сітуацыі студэнты старэйшых курсаў будаўнічых спецыяльнасцяў, яны працуюць на адпаведных высокакваліфікаваных работах і заробак у іх вышэйшы, чым у тых, хто прыйшоў у студатрад з гуманітарнага ВНУ.

— Колькі мог зарабіць маладыя чалавек у студатрадзе?

— Сярэдняя зарплата летась — каля 300 долараў у месяц. Але былі і такія, хто зарабіў 1500 долараў за месяц.

— На якіх аб'ектах працавалі студатрады?

— Будаўніцтва «Мінск-Арэны» — больш за 200 чалавек там працавала. На добраўпарадкаванні Камсамольскага возера мы працавалі цэлы год і будзем працягваць працаваць. 135 атрадаў працавала ў нас у аграгарадках. Рукамі нашых хлопцаў і дзяўчат адбрукаваны вуліцы, пабудаваны тратуары, агароджы. Апошнія гады нашы студатрадаўцы працавалі ў Брэсцкай крэпасці, Хатыні, на Лініі Сталіна, Аўгустоўскім канале, Гродзенскай абласной бальніцы, на вяслярным канале ў Брэсце. Сёння ў кожнай вобласці павінны вызначыць канкрэтны аб'ект, які будзе з нуля пабудаваны нашым атрадам. Гэта, умоўна кажучы, можа быць сельскагаспадарчае збудаванне — склад, арачнік, ферма.

— Летась пярвічкі БРСМ з'явіліся на ўсіх дзяржаўных прадпрыемствах. Чым яны могуць быць карыснымі маладому чалавеку?

— Ніякіх адрозненняў у БРСМ для маладога чалавека, які працуе, і маладога чалавека, які вучыцца, няма. Тыя ж праекты, тыя ж мерапрыемствы. Проста студэнцкая моладзь больш актыўная, а ў працоўнай моладзі менш часу на нейкія мерапрыемствы. І на прадпрыемстве, і ў калгасе наша задача накіраваць энергію маладых людзей у стваральнае рэчышча, дапамагчы маладому чалавеку рэалізавацца. Прывяду яшчэ такі прыклад. У межах асобнага прадпрыемства, напрыклад, «Бабулін гладыш», вядуць спаборніцтва нашы маладзёжныя брыгады. Яны выпускаюць тэтрапакаўскую ўпакоўку, на якой стаіць значок БРСМ. Упакоўка прадаецца і ў Беларусі, і ў Расіі. І прадпрыемству гэта плюс, паколькі такое спаборніцтва павышае выточныя паказчыкі. Лічу, гэта выдатная форма работы, якую трэба распаўсюджваць.

— 2008 год аб'яўлены Годам здароўя. БРСМ, вядома, не застанецца ўбаку…

— Значная колькасць усіх нашых мерапрыемстваў сёлета будзе прысвечана ў той ці іншай ступені здароваму ладу жыцця. Гэта і «Алімпія», гэта і міжнародны лагер «Бе-Ла-Русь», гэта і «Сяброўства славян», вялікая колькасць турыстычных злётаў, зарніц, гэта і нашы брэнды «Скураны мяч», «Залатая шайба», «Імклівы мяч», гэта і эстафеты кшталту «Тата, мама, я — дружная сям'я».

— Асабіста вы бераце ўдзел у масавых спартыўных мерапрыемствах, напрыклад, «Мінскай лыжні»?

— Я займаюся валейболам, часам гуляю ў міні-футбол. У валейбол я пакуль гуляю з камандай БДУ, але цяпер, я думаю, удасца стварыць каманду Цэнтральнага камітэта БРСМ. Час на гульню ёсць толькі з васьмі да адзінаццаці гадзін вечара. З лыжамі таксама ніякіх праблем няма. Сёлета я з задавальненнем гатовы ўзяць удзел у «Мінскай лыжні». Хоць апошні раз на лыжах я стаяў, калі вучыўся ў школе. У нашым інфармацыйна-ідэалагічным цэнтры, дзе праходзяць навучанне спецыялісты тэрытарыяльных арганізацый БРСМ, з 10-ці дзён адзін цалкам прысвечаны спорту, мы праводзім спаборніцтвы па валейболе, футболе, тэнісе.

— Наколькі рэальна вашай арганізацыі самастойна зарабляць грошы?

— У 2007 годзе БРСМ упершыню зарабіў больш-менш прыстойныя грошы. З чатырох нашых прадпрыемстваў, толькі «Беларускі Спадарожнік» спрацаваў са стратамі. «Пілот-FM» прынёс 25 мільёнаў прыбытку, «Дом моладзі» — 30 мільёнаў, турыстычная фірма «Сакваяж» у Брэсце — 12 мільёнаў. Але ў наступным годзе і ў «Спадарожнік», які, дарэчы, у 2004—2005 гадах увогуле не працаваў, і мы яго аднавілі, будзе прыбытак, я ўпэўнены. Зразумела, не стаіць пытанне аб тым, што гэтыя прадпрыемствы павінны ўтрымліваць арганізацыю. Наша задача — развіць іх і зрабіць сучаснымі і канкурэнтаздольнымі на сённяшнім рынку. Тады можна будзе казаць і пра фінансаванне уласных праектаў з дапамогай сваіх прадпрыемстваў.

— Якую ацэнку дзейнасці вашай арганізацыі вы паставілі б па выніках мінулага года?

— Адметным паказчыкам мінулага года можна лічыць тое, што 37 працэнтаў ад усіх студэнтаў дзённай формы навучання з'яўляюцца членамі БРСМ, раней такой лічбы ніколі не было. Практыка паказала, што можна зацікавіць і моладзь у вёсцы. У нас ёсць праект Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці «Уладар вёскі», дзе маладыя сем'і спаборнічаюць (вызначаецца і лепшы падворак, і сядзіба, і інш), у выніку пераможца атрымлівае катэдж. Нам будзе прыемна паехаць на навасселле, калі нас запросяць, на ўсякі выпадак падарунак мы прыгатавалі. У нашых конкурсах на лепшы падворак, на лепшую маладую сям'ю летась узяло ўдзел 368 маладых сем'яў з сельскай мясцовасці, і гэта таксама вынік.

У гэтым годзе мы рыхтуем новыя праекты. Сярод іх вызначыў бы «Прамы кантакт», калі кіраўніцтва нашай дзяржавы (прэм'ер-міністр, міністры, а магчыма ўдасца запрасіць і прэзідэнта краіны) будзе размаўляць з моладдзю ў нефармальнай абстаноўцы, умоўна кажучы, прыязджаць да нас на турзлёт. Такая жывая размова, на мой погляд, будзе цікавая не толькі нашай моладзі, але і нашаму кіраўніцтву. А што наконт ацэнак, то выстаўляць іх сваёй рабоце лічу некарэктным, давер моладзі — галоўны крытэрый ацэнкі нашай работы.

Алена КРАВЕЦ.

А на мой погляд...

ПРЫГАДАЕМ, ВЫПУСКНІК, ШКОЛЬНЫЯ ГАДЫ СУМЕСНЫЯ...

У гэтую суботу па традыцыі ў школах пройдуць вечары сустрэчы выпускнікоў розных гадоў. У некага гэта будзе будзённая (у сэнсе не «круглая») дата з моманту пачатку дарослага жыцця, хтосьці збіраецца на юбілей. Адны аднакашнікі бачацца ў роднай вёсцы ці гарадку ці не штодня, іншыя, раздзеленыя гадамі і адлегласцямі, не чулі пра сваіх школьных сяброў гадамі…

Ці памятаеце вы сваю школу, настаўнікаў, аднакласнікаў? Ці падтрымліваеце з імі стасункі? Магчыма, сярод вашых школьных сяброў ёсць вядомыя, публічныя, як кажуць, людзі? Ці бываеце на сустрэчах выпускнікоў? У гэту суботу пойдзеце ў сваю школу?

Пётр ПРУДНІКАЎ, галоўны інжынер ахоўнага эксплуатацыйнага ўнітарнага прадпрыемства Мінгарвыканкама «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі»:

— Я скончыў сталічную школу № 103 у 1977 годзе. Яна была з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы; у нас быў вельмі моцны клас — толькі ў ім адным было тры медалісты. Асабіста мне базавых школьных ведаў па шэрагу прадметаў потым «хапіла» на два гады вучобы ў інстытуце *(смяецца)*. Займацца было цікава, памятаю, быў гурток англійскай мовы, мы рабілі пастаноўкі. Школа раней была на вуліцы Акадэмічнай, побач з Батанічным садам, але потым яе перанеслі ў мікрараён Зялёны Луг. Апошні раз быў у ёй гадоў 10 таму. Ведаеце, атмасфера ўжо не тая, калектыў настаўнікаў змяніўся... Безумоўна, памятаю сваю першую настаўніцу Тамару Фёдараўну, прабачце, прозвішча вось так адразу не прыгадаю. З некаторымі аднакласнікамі атрымліваецца сустракацца па жыцці, па працы — большасць жа былі мінчанамі. Дома ў мяне захаваліся фотаальбомы, час ад часу праглядаю іх, прыгадваю «школьныя гады цудоўныя». Нават «дасье» на многіх імкнуся весці: хто што скончыў, калі з кім ажаніўся (смяецца). За адной партай я сядзеў з Сашам Лазарэнкам, ён потым стаў лётчыкам транспартнай авіяцыі. Дык калі я быў студэнтам, а ён — курсантам у Падмаскоўі, мы перапісваліся. Лісты тыя захаваліся, перачытваў іх неяк — вельмі змястоўныя, як паэма якая (смяецца). На жаль, сувязь з Сашам потым перарвалася. Вядомыя людзі сярод колішніх аднакласнікаў? Віця быў таленавітым хлопцам, стаў хімікам, можа, ужо прафесар? *(Смяецца.)* На сёлетнюю сустрэчу выпускнікоў пакуль не ведаю патрапіць ці не.

Алеся ГОЛАД, галоўны спецыяліст упраўлення Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асобаў Міністэрства юстыцыі:

— О-О, гэта было гадоў 10 таму або нават больш. Я скончыла сярэднюю школу № 208 г. Мінска. Безумоўна, памятаю ўсіх сваіх аднакласнікаў: у 10—11-ым класах нас было больш за 20 чалавек. Памятаю класнага кіраўніка Пятра Рыгоравіча Козела, ён яшчэ геаграфію выкладаў. Ведаеце, нейкіх асабліва любімых школьных прадметаў у мяне асабіста не было... З аднакласнікамі сустракаюся, хутчэй, выпадкова, на сустрэчы выпускнікоў рэгулярна хадзіць не выпадае. Не ведаю, што гэта атрымаецца па шэрагу прычын і ў гэтую суботу.

Сяргей САРОКІН, начальнік галоўнага ўпраўлення вытворчай і сацыяльна-эканамічнай работы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:

— Хо-хо... Не вельмі ўдала, лічу, вы патэлефанавалі. Справа ў тым, што я не заканчваў дзесяцігодку, пасля 7-га класа пайшоў вучыцца ў тэхнікум. А менавіта ж у гэтыя гады і адбываецца сталенне, закладваюцца нейкія сяброўскія сувязі, праўда? Пасля заканчэння ж тэхнікума лёс параскідаў нас, выпускнікоў, па ўсім Саюзе. Напачатку сувязі падтрымлівалі, потым яны неяк паступова перарваліся. У тэхнікуме я вучыўся разам з Мікалаем Авяр'янавічам Стральцовым, які цяпер узначальвае Беларускую навукова-прамысловую асацыяцыю, а да нядаўняга часу — Канфедэрацыю прамысловасці і прадпрымальніцтва. У тэхнічным інстытуце я вучыўся на вячэрнім аддзяленні, а гэта ж не дзённае, калі студэнты дзеляць на ўсіх апошні кавалак хлеба *(смяецца)*. Хоць такія сувязі, нават сямейныя, мы раней падтрымлівалі. Ёсць што прыгадаць: з 8 да 17 гадзін працуеш, потым на вучобу — і так пяць дзён у тыдзень. А ў выхадныя *(смяецца)* не ведаеш, за што схапіцца!

Аляксей БЫКАЎ, начальнік аддзела будаўніцтва і архітэктуры Стаўбцоўскага райвыканкама:

— У 1993 годзе я скончыў сярэднюю школу № 3 у нашым горадзе. Так, бывае, прыгадваю эпізоды са школьнага жыцця, колішніх аднакласнікаў, тым больш што многія засталіся жыць і працаваць на малой радзіме. Нейкія канкрэтныя прозвішчы прыгадаць цяжка — сяброў было шмат! Не, вядомых, публічных людзей сярод іх няма *(смяецца)*. Памятаю і настаўнікаў, якія нас вучылі. Бываю не на кожнай сустрэчы выпускнікоў, але ў гэтую суботу абавязкова пайду ў родную школу — у нас жа сёлета 15-гадовы юбілей!

Тамара ШАВЕЛЬ, кіраўнік справамі Дзятлаўскага райвыканкама:

— Натуральна, памятаю! У 1974 годзе я скончыла СШ № 2 у нашым горадзе, цяпер гэта гімназія. Яе будынак — праз дарогу ад райвыканкама. У нас было два выпускныя класы, у нашым 10 «А» было 26 вучняў. Школьная сяброўка Людміла Анатольеўна Мяцеліца (па мужу) узначальвае зараз камбінат кааператы ўнай прамысловасці; яшчэ адна — Валянціна Іосіфаўна Юркевіч — працуе выхавальніцай у дзіцячым садку № 2. Жук Аляксандр... Як жа яго па бацьку? Ён жа для нас заўсёды быў Сашам *(смяецца)* — у Гродне, інжынерам працуе. Шмат аднакласнікаў у Мінску працуюць пасля заканчэння эканамічных ВНУ, многія ўладкаваліся ў родным горадзе. Так, звяртаюцца да мяне і з вытворчымі праблемамі, і з бытавымі — дапамагаю вырашаць у межах захавання заканадаўства *(смяецца)*. Памятаю сваю першую настаўніцу — Лідзію Васільеўну Гульніцкую, яна зараз на пенсіі, часам таксама звяртаецца. Прыгадваю настаўніцу гісторыі Яўгенію Іонаўну Новікаву, яе мужа — намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце. У іх увогуле дынастыя — цяпер у гімназіі выкладае англійскую мову ўнучка Інеса Уладзіміраўна Зубрыліна. Добрымі словамі прыгадваем нашага класнага кіраўніка Алену Іванаўну Барысевіч, яна, дарэчы, толькі ў мінулыя выхадныя паехала ад нас да сябе дадому ў Расію. Яна не давала нам сумаваць, увогуле ўсё сваё жыццё прысвяціла дзецям.

Апошні раз мы сустракаліся з аднакласнікамі ў 2004 годзе — на 30-гадовы юбілей. Прыязджала нават выпускніца з Рыгі. У наступным годзе будзе чарговая юбілейная сустрэча!

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Выстаўкі

Скарбы Беларусі — пад адной вокладкай

Учора ў Нацыянальным мастацкім музеі адбылася прэзентацыя альбома журналістаў Белтэлерадыёкампаніі Аляксандра Аляксеева і Алега Лукашэвіча «Спадчына Беларусі. Скарбы». Акрамя таго, у сценах музея для наведвальнікаў разгорнута экспазіцыя — фатаздымкі з прадстаўленага альбома.

Альбом стаў лагічным працягам мастацкага праекта «Спадчына Беларусі», які пачаўся яшчэ ў 2004 годзе. Яго падтрымку забяспечвалі сумесна Белтэлерадыёкампанія, а таксама міністэрствы культуры і інфармацыі. Тады было надрукавана 8 перавыданняў першага фотаальбома, агульным накладам у 26 500 асобнікаў — гэта рэкорд у беларускім кнігавыдавецтве. Упершыню за 14 гадоў на рэспубліканскім конкурсе «Мастацтва кнігі» вышэйшую ўзнагароду — Дыплом Францыска Скарыны — атрымаў менавіта мастацкі альбом «Спадчына Беларусі. Скарбы». У студзені 2005 года аўтары альбома былі ўдастоены прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі «За духоўнае адраджэнне».

...Праца над цяперашнім выданнем у 320 старонак працягвалася амаль 4 гады. Журналісты Аляксандр Аляксееў і Алег Лукашэвіч ўпершыню прадставілі выявы амаль усіх найкаштоўнейшых вырабаў з золата і срэбра, якія з'яўляюцца нацыянальнай спадчынай Беларусі і захоўваюцца на тэрыторыі нашай краіны — у музейных фондах, а таксама ў праваслаўных і каталіцкіх прыходах. Падобная фотапрэзентацыя твораў ювелірнага мастацтва адбылася ў Беларусі ўпершыню. Дарэчы, сваё бласлаўленне на ажыццяўленне праекта «Спадчына Беларусі. Скарбы» аўтарам альбома далі Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі і Кардынал Казімір Свёнтак.



Фота прадастаўлена прэс-службай БТРК.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Лідарскі дар

З ПАКАЛЕННЯ ДЗЕЛАВІТЫХ

Яшчэ гадоў пяць таму яна навучалася майстэрству рухаў у Турцыі, зараз у яе ўласная школа танцаў у Дзяржынску. Ад слова да справы ў гэтай прадпрымальнай дзяўчыны — толькі яе ўласныя намаганні і руплівая праца. У свае 22 яна выдатна ведае, чаго хоча і як гэта атрымаць. Уласным вопытам з маладымі чытачамі дзеліцца бізнэс-гёрл (дзелавая дзяўчына) Кацярына ЧЫКАЛАВА.

— Каця, парай, як маладому лідару пачаць уласную справу.

— Трэба запасціся цярплівасцю і прайсці неверагодную колькасць інстанцый, каб сабраць усе неабходныя дакументы, трэба знайсці сваю нішу і прапанаваць нешта адметнае — і па якасці, і па кошце, трэба прадумаць рэкламную стратэгію, бо без гэтага людзі элементарна не будуць ведаць пра паслугі, якія ты можаш ім прадаставіць. Аднак пачаць — гэта яшчэ паўбяды, куды больш складана — утрымацца на плыву. Заахвоціўшы людзей да заняткаў, варта потым захаваць іх зацікаўленасць. І вось гэта ўжо сапраўднае мастацтва: карпаратыўная культура ўнутры самой групы — сумесныя паходы на чэмпіянаты па танцах, святочныя вечары, сустрэчы, гэта не безасабовыя адносіны выкладчыка і навучэнца, калі яны пазаймаліся гадзіну і разышліся, а цёплыя чалавечыя стасункі. Мы з дзяўчатамі часта збіраемся і глядзім разам запісы замежных танцавальных конкурсаў, абавязкова абмяркоўваем усё да дробязяў. Я ведаю дні нараджэння ўсіх сваіх навучэнак, рыхтую для кожнай які-небудзь сюрпрыз, напрыклад, дыск з запісамі музычных навінак для нашых танцаў. Ну і, вядома ж, да працы сваёй я стаўлюся сур'ёзна. Не прымаю навічкоў кожны занятак, хоць гэта і было б выгадней — праводжу ўвосень сход, дэманструю танцы, каб дзяўчаты атрымалі ўяўленне пра заняткі і маглі суаднесці яго са сваімі жаданнямі і спадзяваннямі. Тыя, каму спадабалася, прыходзяць у маю школу танцаў. І гэта адзіны набор за год, паколькі пачаткоўцаў цяжка будзе аб'яднаць у групах, дзе займаюцца не першы месяц, зразумела, за выключэннем тых, у каго ёсць харэаграфічныя даныя. Здараецца так, што нехта памыляецца з выбарам, танцы ім не прыносяць задавальнення, у іх не атрымліваецца — такія адсейваюцца або адразу ж, пасля некалькіх першых заняткаў, або пасля першых двух месяцаў. Ёсць і такія дзяўчаты, у якіх няма асаблівых танцавальных здольнасцяў, аднак ёсць велізарнае жаданне — іх стараннасць можа даваць нават большы плён, чым прыродныя даныя.

— З чаго пачынаўся твой бізнэс?

— Літаральна з некалькіх сотняў долараў, якія пайшлі на афармленне дакументаў, пакупку касавага апарата, арэндную плату. А як доўга я шукала памяшканне! Колькі перагледзела залаў у школах, дзіцячых садках, пакуль знайшла тое, што трэба: з мноствам люстэркаў і вялікай плошчай — займаемся ж з хусткамі ды іншымі аксесуарамі для танцаў. Весці справы напачатку мне дапамагаў эканаміст — тлумачыў, як рыхтаваць падатковыя справаздачы. Аднак цяпер я сама асвоілася і спраўляюся з гэтым без аніякай дапамогі. Дасягненнем я лічу ўжо хоць бы тое, што змагла рэалізаваць сваю задуму. Памятаю, калі прыйшла дамаўляцца канкон арэнды зальц, да маіх планаў паставіліся скептычна: «Каця, тут людзі бясплатна не ходзяць, а ты хочаш, каб да цябе за грошы пайшлі?.» І прапанавалі мне працаваць не на сябе, а як бы на базе школы. Я адмовілася. Калі дзяўчаты, пачалі займацца, а праз год не толькі не сышлі, а яшчэ і запрасілі знаёмых, у шоку былі ўсе, у тым ліку і я. (*Усміхаецца.* — **Аўт.**).

— Ты, відаць, з дзяцінства захаплялася танцамі?

— Не паверыш, у дзяцінстве цярпець не магла рытміку: мяне ставілі ў пару з тоўсценькім хлопчыкам і я вельмі саромелася, займалася цераз сілу. Ды і ў сям'і ніхто не танцаваў, гэта неяк знутры пайшло: танец — заўсёды перадача асабістых пачуццяў. Чаму менавіта ўсходнія танцы? Проста мяне заўсёды вабіла культура Усходу (сама Каця надта падобная на ўсходнюю прыгажуню — смуглявая, чарнявая, цемнавокая. — **Аўт.**), мне прыйшлося даспадобы ўсходняе адзенне. Убачыўшы мяне ва ўсходнім убранні, жонка майго брата запрасіла займацца танцамі разам з ёю. Я пагадзілася з цікаўнасці, танцы мяне ўразілі, аднак спосаб выкладання, памятаю, тады не задаволіў. Неўзабаве пачала займацца па відэакасетах — гадзіны праводзіла перад тэлевізарам. Ну а калі сяброў з Турцыі запрасілі да сябе на лета ў госці, я загарэлася ідэяй павучыцца танцаваць там, тым больш што турэцкую мову ведаю няблага. У стамбульскай школе выкладалі менавіта турэцкі стыль танца, сама ж я ў далейшым засвоіла і егіпецкі стыль: ён карыстаецца большай папулярнасцю ў Беларусі, і мне самой ён больш блізкі. Там рухі не такія рэзкія і касцюмы не такія адкрытыя, як у турэцкім. Са сваімі дзяўчатамі я выкарыстоўваю элементы розных стыляў, у тым ліку і турэцкага, асабліва з тымі, хто займаецца не першы год, валодае пэўным вопытам, — ім ужо хочацца чагосьці больш жвавага і дынамічнага, і яны гатовы гэта ўспрыняць і засвоіць.

— Бездакорны выкладчык — які ён?

— Паспрабую разважаць ад адваротнага. Дакладна ведаю, што выкладчык, які клапоціцца толькі аб прыбытку, — дрэнны выкладчык. У яго перапоўненыя групы, так што за кожнай навучэнкай прасачыць ён не можа проста фізічна. А ў танцах індывідуальны падыход такі важны. Я адчула гэта на сабе, калі вучылася ў стамбульскай школе танцаў. На жаль, у большасці беларускіх школаў танцы выкладаюць без уліку гэтых момантаў, а ў маім родным Дзяржынску і наогул не было прапаноў па ўсходніх танцах, таму так хацелася арганізаваць нешта сваё і стаць добрым выкладчыкам. Не танцоўшчыцай, а менавіта выкладчыкам, бо паспяховая прафесійная танцоўшчыца — яшчэ не значыць, добры перакладчык. Для трэнера, акрамя ўласных здольнасцяў важна ўменне даступна тлумачыць і сачыць за тым, каб навучэнкі правільна усё выконвалі. Адны інструктары даюць вельмі складаныя звязкі, якія пачаткоўцам проста нерэальна паўтарыць, другія акцэнтуюць шмат увагі на ўласным танцы і практычна не звяртаюць увагі на тое, як танцуюць іх навучэнкі. Таму я імкнуся ўдаскаладніць нальвацца не толькі і не столькі ва ўласным майстэрстве, колькі ў працы з дзяўчатамі, падыходзе да іх, у распрацоўцы незвычайных тэхнік тлумачэння рухаў. Адзін і той жа прынцып у танцы можна тлумачыць 10 спосабамі, важна мець некалькі варыянтаў — камусьці прасцей зразумець, калі паказваюць так, а камусьці — зусім па-іншаму. Калі гэта трэба, я прыношу на заняткі «падручны матэрыял»: яблыкі, дрот — з іх дапамогай тлумачу сваім навучэнкам траекторыі танцавальных рухаў (некаторыя дзяўчаты лягчэй успрымаюць тлумачэнні рухаў па траекторыях, а не па кропках). Вось, скажам, у маёй сяброўкі, якая займаецца танцамі ў Мінску, доўга не атрымлівалася зрабіць хвалю ўсім целам. Я ёй паспрабавала паказаць з яблыкам: «Кладзём на далонь яблычак, уяўляем, што паклалі яго сабе на грудзі. Яблычак мы спачатку апускаем, а потым цягнемся за ім наперад». І ведаеце, у яе адразу ж атрымалася. Сяброўка была літаральна ў шоку: «Каця, я хадзіла на заняткі некалькі месяцаў, і ніяк не магла зразумець, а ты мне за хвіліну растлумачыла!». Варта ўсяго толькі знайсці патрэбны спосаб тлумачэння. Каб навучыць дзяўчат рабіць «васьмёрку» сцёгнамі, адным трэба пакласці рукі на сцёгны і задаць накірунак руху, у кагосьці ж атрымаецца, калі рухі паказаць рукой, да кагосьці трэба стаць спінай і паказаць па ўсіх кропках, як рухацца васьмёркай, а іншым больш наглядна будзе паказаць траекторыю на дроце. Таму так важна мець у сваім выкладчыцкім «арсенале» як мага больш разнастайных спосабаў тлумачэння, і чым іх больш, чым больш удала атрымліваецца іх выкарыстоўваць у кожным асобным выпадку, тым, відаць, лепшы выкладчык.

— Якія былі першыя ўражанні ад выкладання?

— Весці самы першы занятак было вельмі складана, памятаю, я так хвалявалася. Яно і нядзіўна: я, тады яшчэ 18-гадовае дзяўчо, прыйшла вучыць жанчын, куды больш сталых, чым сама — некаторым з іх было ў два, калі не ў тры разы больш, чым мне. Спачатку нервавалася, а літаральна праз 2—3 заняткі гэта адчуванне само сабой знікла. Тады ў мяне займалася літаральна 10 жанчын, на сёння (калі ўлічваць набраную сёлета дзіцячую групу) — у некалькі разоў больш.

— А як падтрымліваеш уласныя навыкі?

— Наведваю навучальныя семінары і трэнінгі, танцавальныя конкурсы і фестывалі, у тым ліку за мяжой, для мяне ўсё гэта неяк лёгка — зірнула на рухі і падхапіла. Не грэбую інфармацыяй са спецыялізаваных сайтаў у Інтэрнэце, купляю дыскі з відэа і музыкай. Мая фанатэка рэгулярна папаўняецца, прычым выключна аўтэнтычнымі кампазіцыямі.

— Якія, на тваю, думку складнікі паспяховага бізнэсу?

— Па-першае, прапаноўваць прадукт, разлічаны на шырокую аўдыторыю. У выпадку з танцамі — адкрываць такія накірункі, якія будуць прывабнымі для жанчын усіх узростаў, напрыклад, індыйскія танцы. Сучаснымі танцамі цікавяцца пераважна маладыя дзяўчаты, для парных танцаў патрэбны хлопцы, аднак ахвотнікаў сярод іх звычайна няшмат. Выбіраўшы такі накірунак, звузіш аўдыторыю патэнцыяльных кліентаў. Па-другое, даступныя цэны (Каця і гэтым прынцыпам карыстаецца на практыцы: абанемент на месяц — восем заняткаў — у яе школе танцаў каштуе 30 тысяч рублёў. — **Аўт.**). Па-трэцяе, пазітыўны настрой і пачуццё гумару: працаваць трэба з задавальненнем, незалежна ад таго, наколькі сур'ёзныя ў цябе праблемы. Рабіць гэта няцяжка, калі любіш сваю справу. Калі людзі прыйшлі на заняткі да цябе ў клуб, у іх не павінна быць і цэню сумнення ў тым, што клуб, які яны наведваюць, — самы лепшы. Ну і, вядома ж, важныя знешні выгляд, манера кантактаваць з людзьмі, самаацэнка. Трэба яшчэ пастаянна сачыць за рынкам, рэгуляваць цэны, падтрымліваць на належным узроўні якасць прадукту (абслугоўвання).

Бізнэсам Каця займаецца не ў першым пакаленні: мама яе трымае вясельны салон, тата — стаматалагічную клініку. Да мамінага бізнэсу Каця мае непасрэднае дачыненне: аднойчы мама ад'язджала на некалькі месяцаў і даручыла дачцэ кіраваць салонам.

— Я яго поўнасцю мадэрнізавала, — успамінае Каця. — Паставіла там хатні камп'ютар, размеркавала ўсе аксесуары па нумарах. Калі раней, скажам, на пальчатках пакідалі нейкія там запісачкі, то ў мяне ўсе даныя былі ў кам-п'ютарнай сістэме. Яшчэ я завітала ў другія вясельныя салоны горада, прыгледзелася і ... і знізіла цэны ў нашым салоне такім чынам, каб яны выгадна адрозніваліся ад цэнаў у канкурэнтаў, а мы пры гэтым не працавалі на страту. Бачылі б вы, як павялічыўся попыт! Мама засталася задаволеная.

— Справы у цябе ідуць угару, што будзе далей? Якія планы на будучыню, аб чым марыш?

— Я бачу сябе ў бізнэсе (хутчэй за ўсё, у сферы абслугоўвання), тым больш што ёсць мноства незапоўненых ніш: у прыватнасці, пастаўкі морапрадуктаў, сыроў — гэта аддаленая перспектыва. У мяне пакуль статус індывідуальнага прадпрымальніка, аднак я гатова да ўзбуйнення ўласнага бізнэсу ў самым хуткім часе — магчыма, гэта будзе нешта тыпу фітнэс-клуба — літаральна некалькі танцавальных і спартыўных накірункаў. Тут галоўнае — знайсці адпаведных спецыялістаў. І па журналісцкім шляху (Каця — без пяці хвілін выпускніца журфака — **Аўт.**) я таксама іду ў бізнэс-накірунку: у сэнсе, пішу пра бізнэс для спецыялізаванага часопіса. Кола маіх тэм прыблізна так

ПАНЯДЗЕЛАК, 4 ЛЮТАГА

5.25 Дак. серыял «Еўропа. Погляд зверху».
6.20, 7.05, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.45, 7.45, 18.50, 0.20 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30, 8.25 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05 Фігуры.
9.35 Здароўе.
10.00 «Жыццё як жыццё».
11.00, 17.40 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.15 Камедыя «З днём нараджэння, Каралева!».
14.30 Nota Bene.
15.15. 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Дак. фільм «Удзельнікі і саўдзельнікі».
16.00 ЕўраФэст. Дзень за днём.
16.15 Гадзіна кіно.
16.45 Серыял «Трымай мяне мацней». Заключная серыя.
19.35 Гадзіна спорту.
20.00 «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.45, 0.25 Серыял «Лічбы».
22.35 Трылер «Смяротны лабірынт».

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
10.40, 11.10 Камедыя «Шчасце».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 3.20 Навіны спорту.
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Дачка садоўніка». Серыял.
16.15 Камедыя «Чужыя грошы».
18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 «Пуцейцы». Серыял.
22.05 «Громавы. Дом надзеі». Серыял.
23.25 «Дакументальны дэтэктыў». «Слуцкі прыгавор».
0.00 «Прафесійны бокс. Лепшыя баі».
1.20 «Ігар Кваша. Кропка адліку».
2.10 «Абаронца». Серыял.
3.30—5.00 Тэхнічная прафілактыка.

5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
6.50, 14.35 Мультсерыял «Олівер Твіст».
7.10 Ранішняя падзарадка.
8.10 Дак. серыял «Архітэктурныя шэдэўры».
8.45 Невытлумачальна, але факт.
9.35 У гэты дзень.
9.40, 16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.25 Святло далёкай зоркі. Аляксей Глебаў.
10.55, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
11.50 Добрыя навіны.
12.20 Усё аб бяспецы.
12.50 Гаспадар.
13.20 Школа рамонту.
14.15 Тэлебарометр.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.10 Нянька спяшаецца на дапамогу.
16.00 «Смачна з Барысам Бурдой».
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Паляўнічы».
20.05 Калыханка.
20.25 Беларуская часінка.
21.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
22.25 Хакей. Формула гульні.
23.00 Меладрама «Рыжая вавёрка».

6.00, 7.30. 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40 «Наша справа».
7.55 «Вялікае снеданне».
8.30, 16.50 «Вовачка-2». Серыял.
9.00 «Тыдзень».
10.00 «Спартыўны тыдзень».
10.40 «Наш дом».
11.00 «Рэбека». Серыял.
11.50 «Танга ўтраіх». Серыял.
12.40 «Вяртанне да папуасаў». Дак. фільм, частка 3-я.
13.00 «Ёсць кантакт».
13.50 «Культурнае жыццё».
14.20 «Дарагая перадача».
14.45 «Магутныя рэйнджары. Касмічны патруль «Дэльта». Мультсерыял.
15.10 «Элен і рабяты». Серыял.
15.45 «Народжаныя ў СССР».
17.30 «Званая вячэра».
18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 Дэтэктыў «Запомніце, мяне завуць Рагозін».
22.55 «Закон і крымінал».
23.00 «Інструктар». Серыял.
23.45 «Сталічны футбол».
0.15 «Гучная справа».
1.05 «Рэдакцыя». Серыял.

5.00, 6.15, 7.00, 1.15 Сядружнасць live.
5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».
6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 «Навіны Сядружнасці».
6.45 Камерцыйная праграма.
7.30 «Мар, дзейнічай, будзь!».
8.00 «Разам».
9.15 Ведаем рускую.
10.15 «Казахстан: старонкі гісторыі».
10.30 Серыял «Дзікі месяц».
11.30 Дак. серыял «Дзіўнае жыллё».
12.15 Студыя 60х90.
12.25, 22.25 Маст. фільм «Дзе ты, мая Зульфія?».
14.15 «Вучым англійскую».
15.25, 0.15 Дак. серыял «Самыя дзіўныя святы свету».
16.25, 1.45 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.25, 2.45 «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
18.25 «Акцэнты».
18.45 Серыял «Рускія амазонкі».
19.45 «Цік-так».
20.00 «Агульны інтарэс».
20.30 «Рэспубліка сёння».
21.25 Серыял «Высакародныя махляры». 1-я серыя.

7.00, 18.50, 21.20 Навіны кіно.
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25. 23.10 «Метэапрагноз».
7.30 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі».
8.55 «К-гульні».
9.00 «Клуб 700».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50 Серыял «Паліцэйскія гісторыі».
11.00 Маст. фільм «Небяспечныя сувязі».
13.00 Дзённы тэлечат.
16.30 «Пераможны голас верніка».
17.00 «Мультпарад».
17.15 «Фантастыка і прыгоды».
19.00 «Мой любімы гадаванец».
19.25, 21.30 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.05 «Зялёны дом».
21.35 Трылер «Жніво».
23.15 «Хіт-парад тэлечата».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.10 «Яўгеній Лявонаў. «А слёзы капалі...».
10.00 Рэвізор.
10.30 «Спецыяльны карэспандэнт».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45 «Фитиль».
13.00 Серыял «Каханне сляпое».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.20 Камедыя «Акцёры».
15.55 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.50 Весткі. Дзяжурная часць.
18.00 Серыял «Анёл-ахоўнік».
19.50 Добрай ночы, малыя!
20.00 Серыял «Тайны следства-7».
21.00 Серыял «Мая граніца».
22.00 Серыял «Сустрэча выпускнікоў».
23.10 Весткі+.
23.30 «Мой сярэбраны шар. Ізольда Ізвіцкая».

6.00 «Сёння раніцай».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.00 «Агляд».
9.30 «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
10.20 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.15 «Следства вялі...».
13.30 Серыял «Сышчыкі-5».
15.10 «Прафесія — рэпарцёр».
15.35, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Серыял «Каменская-2».
19.45 Серыял «Двое з кафэрка».
20.50 Драма «Штрафбат».
22.30 Серыял «Формула стыхіі».
23.35 Серыял «План Б».

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
7.50 Выбары Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.
7.55, 10.15, 0.20 Пятроўка, 38.
8.05, 13.45, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.15 «Коннік без галавы». Маст. фільм.
10.45 «Пастскрыптум» з Аляксеем Пушковым.
11.55 «Доказы віны». «Залатая ліханка».
12.45 Лінія абароны.
13.50 Мультпарад.
14.30 «У цэнтры падзей».
15.30 Новая «Часінка».
16.50 Выбары Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.
17.15 Дзяніс Матросаў у праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
17.50 «Расплата за грахі». Серыял.
18.55 «Рэальныя гісторыі». Пакарыць Маскву.
20.00 «Рака-мора». Серыял.
21.00 «Афіцэры». Серыял.
22.00 Момант ісціны.
22.55 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.25 «Збор твораў». К. Сен-Санс. Канцэрт 2 для фартэпіяна з аркестрам.
0.45 «Чыста англійскае забойства». Серыял.
2.20 «Закон Вольфа». Серыял.
3.05 «Крок насустрач». Маст. фільм.
4.20 «Тры таўсцякі». Мультфільм.

9.30 Агляд снежнага ўік-энда.
10.00, 12.15, 19.00 Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый.
11.00 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
15.45 Снукер.
18.15, 1.45 Футбол. Еўрагалы.
1.30 Вось гэта дзіва!!!

ФІЛЬМ ДНЯ

ЛАД 23.00 «РЫЖАЯ ВАВЁРКА» (ІСПАНІЯ, 1993 г.)

Узнагароды: прыз маладзёжнага журы на Канскім МКФ, 1993 г., Нацыянальная кінапрэмія Іспаніі «Гоя», прыз за лепшы фільм на МКФ у Багоце (Калумбія), прыз крытыкі і прыз журы на МКФ у Жэрармеры (Францыя), прэмія «Ondas» за лепшы іспанскі фільм года, прэмія Хуліо Медэму на МКФ у Дэнверы, 1994 г.

У кемпінгу, вакол якога лес белых дрэў, дзе жывуць маленькія і вельмі кемлівыя жвавыя істоты, развіваецца гісторыя незвычайных чуйных адносінаў паміж двума

зусім незнаёмымі людзьмі, гісторыя, стрыжань якой — хлусня...

Рэжысёр — Хуліо Медэм. **У ролях:** Эма Суарэс, Нанчо Ново, Марыя Баранко, Кара Элехальдэ, Кармело Гомес, Моніка Моліна.

АЎТОРАК, 5 ЛЮТАГА

5.25 Серыял «Участак». Заключная серыя.
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.50, 0.30 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Гадзіна спорту.
9.05 Баявік «Сармат». Заключная серыя.
10.00 Серыял «Трымай мяне мацней». Заключная серыя.
10.55 Серыял «Каханне як каханне-2». Заключная серыя.
12.15 Драма «Угрум-рака». 1-я серыя.
13.55 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15. 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Серыял «Зачараваны ўчастак». 1-я серыя.
16.30 Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды». 1-я серыя.
17.25 Серыял «Сэрцу не загадаеш». 1-я серыя.
19.35 Сфера інтарэсаў.
19.55 Серыял «Марозаў». 1-я серыя.
21.00 Панарама.
21.45, 0.50 Серыял «Лічбы».
22.35 Камедыя «Забойства ў Грос-Пойнце».
0.40 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Чакай мяне.
10.00 «Модны прыгавор».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Адзін супраць усіх».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Дачка садоўніка». Серыял.
16.15 «Агонь кахання». Серыял.
17.15, 5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.
20.00 Час.
21.05 «Пуцейцы». Серыял.
22.05 «Громавы. Дом надзеі». Серыял.
23.25 Тэорыя неверагоднасці. «Як прадоўжыць жыццё».
0.05 Баявік «Разбуральнік».
2.05 «Абаронца». Серыял.
3.25 «Тайны Смалвіля». Серыял.

6.45, 14.20 Мультсерыял «Олівер Твіст».
7.10 Ранішняя падзарадка.
8.10, 16.00 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.40, 18.50 Серыял «Паляўнічы».
9.40 У гэты дзень.
9.45, 16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.35 Хакей. Формула каханне.
11.05, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
12.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
13.05 Школа рамонту.
14.00 ПРАсоўванне+.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.10 Невытлумачальна, але факт.
18.35 Навіны культуры.
20.05 Калыханка.
20.20 Беларуская часінка.
21.30 Спорт-кадр.
22.00 «Іншыя». Асноўны інстынкт.
22.30 Серыял «Анатомія Грэй».
23.25 Хакей. НХЛ. Пітсбург—Нью-Джэрсі.

6.00, 7.30. 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 «Вовачка-2». Серыял.
9.00 «Прачніся і спявай».
9.30 «Ecce homo».
10.00 «Сталічны футбол».
10.40 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
11.00 «Рэбека». Серыял.
11.50, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.
12.40 «Вяртанне да папуасаў». Дак. фільм, частка 4-я.
13.00 «Сталкер».
13.50 «Чэмпіянат спорту па ралі». Монтэ-Карла.
14.45 «Магутныя рэйнджары. Касмічны патруль «Дэльта». Мультсерыял.
15.10 «Элен і рабяты». Серыял.
15.40 «Фантастычныя гісторыі».
17.30 «Званая вячэра».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 «Аўтапанарама».
20.50 «Салдаты 13». Серыял.
22.00 «Рэпарцёр СТБ».
22.55 «Закон і крымінал».
23.00 «Інструктар». Серыял.
23.45 «Гарачы лёд».
0.15 «Надзвычайныя гісторыі».
1.05 «Рэдакцыя». Серыял.

5.00, 6.15, 7.00, 1.15 Сядружнасць live.
5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».
6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 «Навіны Сядружнасці».
6.45 Камерцыйная праграма.
7.30 «Рэспубліка сёння».
8.00, 18.45 Серыял «Рускія амазонкі».
9.15 Хіт-экспрэс.
10.15 «Суседзі».
10.30 Серыял «Дзікі месяц».
11.30 «Пра каханне».
12.15 Студыя 60х90.
12.25, 22.25 Маст. фільм «Люты».
14.15 Урокі англійскай.
15.25, 0.15 Дак. серыял «Вы гэта бачылі?».
16.25, 16.25 «Гадзіна суда». Справы сямейныя.
17.25, 2.45 «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
18.25 «Акцэнты».
19.45 «Цік-так».
20.00 «Спрэчная тэрыторыя».
21.25 Серыял «Высакародныя махляры».

7.00, 18.55, 23.30 «К-гульні».
7.10, 10.55, 23.35 «Метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Знаёмства з бацькамі».
8.50, 19.15 «Навіны кіно».
9.00 «Клуб 700».
9.30, 17.00 «Мультпарад».
9.50 Серыял «Паліцэйскія гісторыі».
10.50 Інфармбюро «Міжнароднае».
11.00 Маст. фільм «Жніво».
13.00 Дзённы тэлечат.
16.30 «Пераможны голас верніка».
17.15 «Фантастыка і прыгоды».
19.00 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
19.25, 21.15 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.30 Серыял «Семнаццаць імгненняў вясны».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Зялёны дом».
21.20 Камедыя «Адкрыйце, паліцыя!».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.05 «Народны маркіз. Ігар Дзмітрыеў».
9.55, 20.00 Серыял «Тайны следства-7».
10.45, 17.50 Весткі. Дзяжурная часць.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25, 14.20, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45, 21.00 Серыял «Мая граніца».
12.35 «Гарадок».
13.00 Серыял «Каханне сляпое».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.35 «Кулагін і партнёры».
15.05 Суд ідзе.
15.55 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
18.00 Серыял «Анёл-ахоўнік».
19.50 Добрай ночы, малыя!
22.00 Серыял «Сустрэча выпускнікоў».
23.10 Весткі+.
23.30 «Чужое імя. Здрада ў мяккім пераплёце».

6.00 «Сёння раніцай».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.00, 22.30 Серыял «Формула стыхіі».
10.25 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.55 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
11.15 Серыял «Права на шчасце».
13.30 Серыял «Урачэбная тайна».
15.20 «Асарці».
15.35, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Серыял «Каменская-2».
19.45 Серыял «Двое з кафэрка».
20.50 Серыял «Штрафбат».
23.35 Серыял «План Б».

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
7.50 Выбары Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.
8.00, 10.15, 23.25 Пятроўка, 38.
8.10, 13.45, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.20 Маст. фільм «Проста Саша».
9.45 «Доказы віны». «Дзікія гонкі».
10.45, 20.05 «Рака-мора». Серыял.
11.40, 21.00 «Афіцэры». Серыял.
12.40 Момант ісціны.
13.50 Нашы любімыя жывёлы.
14.30 «Закон Вольфа». Серыял.
15.30 Новая «Часінка».
16.55 Дзелавая Масква.
17.15 «21 кабінет» з Віктарам Бяліцкім.
17.50 «Расплата за грахі». Серыял.
18.55 Тварам да горада.
22.00 «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Гадзіна пік».
22.55 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.45 «Замыкаючы круг». Канцэрт.
0.45 Маст. фільм.
2.30 «Коннік без галавы». Маст. фільм.
4.30 Мультпарад.

9.30 Вось гэта дзіва!!!
9.45, 11.30, 0.00 Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый.
10.45, 19.00, 21.00 Футбол. Еўрагалы.
15.00, 19.15 Тэніс. Турнір WTA.
16.45, 21.15 Снукер.
0.30. Бокс.

ФІЛЬМ ДНЯ

ПЕРШЫ 22.35 «ЗАБОЙСТВА Ў ГРОС-ПОЙНЦЕ» (ЗША, 1997 г.)

Узнагароды: прэмія лонданскіх кінакрытыкаў (Вялікабрытанія, 1997 г.), прэмія «Chlotrudis» Асацыяцыі незалежных кінавытворцаў (ЗША, 1997 г.).

Марцін, прафесійны забойца, з некаторага часу перастаў адтрымліваць задавальненне ад працы і адчувае дэпрэсію. Чарговае заданне — забіць нейкага сведку ў Дэтройце, але высвятляецца, што сведка — бацька яго школьнага кахання.

Рэжысёр — Джон Эрмітэйдж. **У ролях:** Джон К'юсак, Міні Драйвер, Дэн Экройд, Алан Аркін, Джаан К'юсак, Хэнк Азарыя.

СЕРАДА, 6 ЛЮТАГА

5.25, 15.50 Серыял «Зачараваны ўчастак».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.50, 0.30 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05, 19.55 Серыял «Марозаў».
10.00, 16.45 Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
10.55, 17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.15 Драма «Угрум-рака». 2-я серыя.
13.55 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30, 0.45 Серыял «Клава, давай!».
19.35 Зямельнае пытанне.
21.00 Панарама.
21.45, 1.10 Серыял «Лічбы».
22.35 Драма «Доказ».
0.35 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 «Таццянін дзень». Серыял.
10.00 «Модны прыгавор».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 3.20 Навіны спорту.
11.10, 21.05 «Пуцейцы» Серыял.
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Дачка садоўніка». Серыял.
16.15 «Агонь кахання». Серыял.
17.15, 5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.
20.00 Час.
22.05 «Громавы. Дом надзеі». Серыял.
23.25 «Дакументальны дэтэктыў». «Слуцкі прыгавор».
0.00 «Прафесійны бокс. Лепшыя баі».
1.20 «Ігар Кваша. Кропка адліку».
2.10 «Абаронца». Серыял.
3.30—5.00 Тэхнічная прафілактыка.

9.40 У гэты дзень.
9.45, 16.10 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.30 «Лабірынты». Першы Хрост: Торвальд Вандроўнік.
11.00, 17.05 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
12.00 Серыял «Анатомія Грэй».
12.45 Спорт-кадр.
13.15 Цудоўная сямёрка. Эпізод чацвёрты.
14.05 «У яранзе гарыць агонь». Мультфільм.
14.30 Пазакласная гадзіна.
14.40 Невытлумачальна, але факт.
18.10 Навіны культуры.
18.25 Хакей. «Кубак Палесся-2008». Беларусь—«Каманда Палесся».
20.40 Калыханка.
20.55 Беларуская часінка.
23.05 Нянька спяшаецца на дапамогу.
0.05 Баскетбол. НБА. Агляд тыдня.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 «Вовачка-2». Серыял.
9.00, 20.50 «Салдаты 13». Серыял.
10.00 «Гарачы лёд»:
10.40 «Аўтапанарама».
11.00 «Рэбека». Серыял.
11.50, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.
12.40 «Неверагодная рэальнасць Мексікі». Дак. фільм, частка 1-я.
13.00 «Рэпарцёр СТБ».
13.50 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
14.45 «Магутныя рэйнджары. Касмічны патруль «Дэльта». Мультсерыял.
15.10 «Элен і рабяты». Серыял.
15.45 «Народжаныя ў СССР».
17.30 «Званая вячэра».
18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 «Добра пажаловаться».
22.00 «Мінск і мінчане».
22.55 «Закон і крымінал».
23.00 «Інструктар». Серыял.
23.45 «Сталічны футбол».
0.15 «Гучная справа».
1.05 «Рэдакцыя». Серыял.

5.00, 6.15, 7.00, 1.15 Сядружнасць live.
5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».
6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 «Навіны Сядружнасці».
6.45 Камерцыйная праграма.
7.30 «Агульны інтарэс».
8.00, 18.45 Серыял «Рускія амазонкі».
9.15, 20.00 «Спрэчная тэрыторыя».
10.15 «Спецрэпартаж».
10.30 Серыял «Дзікі месяц».
11.30 Дак. серыял «Следчыя і экстрасэнсы».
12.15 Студыя 60х90.
12.25, 22.25 Маст. фільм «Сямёра смелых».
14.15 «Вучым англійскую».
15.25, 0.15 Дак. серыял «Небяспека буйным планам?».
15.55 «Планета VISION прадстаўляе».
16.25, 1.45 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.25, 2.45 «Лепшае з джэнтльмен-шоў».
18.25 «Акцэнты».
19.45 «Цік-так».
21.25 Серыял «Высакародныя махляры».
0.45 Тэлемагазін.

7.00, 19.15, 21.10 «Навіны кіно».
7.10, 10.55, 21.05, 23.30 «Метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Знаёмства з Факерамі».
9.00 «К-відэа» для дзяцей.
9.30 «Адшукваецца адпачынак».
9.50 Серыял «Паліцэйскія гісторыі».
10.50 «К-гульні».
11.00 Маст. фільм «Адчыніце, паліцыя!».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Пераможны голас верніка».
17.00 Мультпарад.
17.15 «Фантастыка і прыгоды».
19.25, 21.20 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.30 Серыял «Семнаццаць імгненняў вясны».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.25 Драма «Вяртанне».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.05 «Смяротная вертыкаль лётчыка Гарнаева».
9.55, 20.00 Серыял «Тайны следства-7».
10.45, 17.50 Весткі. Дзяжурная часць.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25, 14.20, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45, 21.00 Серыял «Мая граніца».
12.35 «Гарадок».
13.00 Серыял «Каханне сляпое».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.35 «Кулагін і партнёры».
15.05 Суд ідзе.
15.55 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
18.00 Серыял «Анёл-ахоўнік».
19.50 Добрай ночы, малыя!
22.00 Серыял «Сустрэча выпускнікоў».
23.10 Весткі+.
23.30 «Гібель Імперыі. Візантыйскі ўрок».

6.00 «Сёння раніцай».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.00, 22.30 Серыял «Формула стыхіі».
10.25 «Пакой адпачынку» з Людмілай Нарусавай.
10.50 «Агляд. Выратавальнікі».
11.20 Серыял «Права на шчасце».
13.35 Серыял «Урачэбная тайна».
15.20 «Асарці».
15.35, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Серыял «Каменская-2».
19.45 Серыял «Двое з кафэрка».
20.50 Серыял «Штрафбат».
23.35 Серыял «План Б».

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
7.50 Выбары Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.
8.00, 10.15, 0.10 Пятроўка, 38.
8.10, 10.45, 13.45, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.15 «Гонка з праследаваннем». Маст. фільм.
Жыццё шафёра Сцяпана Чакмянёва склалася ўдала. Але аднойчы ў лесе гіне аднавяскавец. І Чакмянёў, лічачы сябе вінаватым, цяпер напярэдадні расплаты, якая чакае за ўтворанае, спрабуе зразумець: калі і як ён, які некалі меў шмат сяброў, стаў абыякавым да чужога жыцця.
10.05 «Каньяк, карты і ніводнага ствала». Дэтэктыў Леаніда Млечына.
10.55, 20.00 «Рака-мора». Серыял.
11.50, 21.00 «Афіцэры». Серыял.
12.55 «Дэтэктыўныя гісторыі». «Укол маку». Фільм 1-ы.
13.50 Дзень бусла.
14.10 «Навагодняя казка». Мультфільм.
14.30 «Закон Вольфа». Серыял.
15.30 Новая «Часінка».
16.55 «Рэзананс».
17.15 Сялянская застава.
17.50 «Расплата за грахі». Серыял.
18.55 «Доказы віны». «Зваротная перамотка».
22.00 «Вырашыце за мяне».
22.55 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.25 «Вячаслаў Ціханаў. Жыццё і імгненні». Дак. фільм.
0.30 «Фабрыка шчасця». Маст. фільм.
2.20 Маст. фільм.
4.30 «Вастраў памылак». Мультфільм.

9.30 Экстрэмальны спорт.
10.00 Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Легенды. Камерун.
11.00 Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Легенды. Туніс.

12.00, 0.00 Футбол. Еўра-2008.
13.00 Тэніс. Турнір WTA.
16.30, 23.15, 1.00 Снукер.
19.00 Футбол. Еўрагалы.
19.15, 20.25, 22.40 Выбранае па серадах.
19.20 Конны спорт. Кубак свету.
20.30 Гольф.
22.05 Парусны спорт.
22.45, 2.00 «Алімпійскія гульні».

ФІЛЬМ ДНЯ

ПЕРШЫ 22.35 «ДОКАЗ» (ЗША, 2005 г.)

Узнагароды: прыз Фламандскага МКФ (Бельгія, 1998 г.), прыз кінакрытыкаў Сан-Дыега (ЗША, 2005 г.). Усё сваё юнацтва Кэтрын правяла, даглядаючы звар'яцелага генія бацьку-матэматыка. Пасля яго смерці знаходзіць сшытак з доказам складанай тэарэмы. Кэтрын сцвярджае, што менавіта яна, а не бацька, яго аўтар.

Рэжысёр — Джон Мэдэн. **У ролях:** Гвінет Пэлтроу, Энтані Хопкінс, Хоуп Дэвіс, Джэйк Гіленхаал, Гэры Х'юстан, Эн Уітман.

ЧАЦВЕР, 7 ЛЮТАГА

5.25, 15.50 Серыял «Зачараваны ўчастак».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.50, 0.20 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам!
8.35 Зямельнае пытанне.
9.05, 19.55 Серыял «Марозаў».
10.05, 16.55 Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
11.00, 17.50 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.15 Драма «Угрум-рака».
13.30 Час кіно.
14.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30, 0.35 Серыял «Клава, давай!».
19.35 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45, 1.00 Серыял «Лічбы».
22.40 Драма «Паніка».
0.25 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 «Таццянін дзень». Серыял.
10.00 «Модны прыгавор».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 3.20 Навіны спорту.
11.10, 21.05 «Пуцейцы». Серыял.
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Дачка садоўніка». Серыял.
16.15 «Агонь кахання». Серыял.
17.15, 5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.

ПЯТНІЦА, 8 ЛЮТАГА

5.25, 15.40 Серыял «Зачараваны ўчастак».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 19.30 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.05 Навіны.
7.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05. 19.55 Серыял «Марозаў».
10.05 Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
11.00, 17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.15 Драма «Угрум-рака».
13.35 «І жыццё, і слёзы, і каханне...».
14.05 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 ЕўраФэст. Дзень за днём.
16.45 «Жыццё як жыццё».
21.00 Панарама.
21.45, 1.45 Серыял «Ліч-бы».
22.45 Жорсткая размова.
23.15 Дзень спорту.
23.25 Фігуры.
23.50 Драма «Кропка».

Драматычная гісторыя маладых дзяўчат, якія працуюць на «кропцы». Тры зламаныя лёсы цесна перапляліся паміж сабой.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.25, 3.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Таццянін дзень». Серыял.
10.00 «Модны прыгавор».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.40, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Пуцейцы». Серыял.
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Дачка садоўніка». Серыял.
16.15 «Агонь кахання». Серыял.
17.15 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Злачынства стагоддзя».
18.55 Поле цудаў.
20.00 Час.
21.05 Маст. фільм «Прадчуванне».
22.55 «Наша Russia».
23.45 «Сярэбраны грамафон».
0.40 Баявік «Спецыяліст».
2.35 «Голыя і смешныя».
3.25 Маст. фільм «Зніклы атрад».

5.35 Формула М-1. «Замуж за Расію».
6.05 «Асабістае жыццё Аляксандра Маслякова».

6.50, 14.30 Мультсерыял «Балі».
7.10 Ранішняя падзарадка.
8.15, 16.05 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.45 Серыял «Паляўнічы».
9.45 У гэты дзень.
9.50, 16.40 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.40 Дак. фільм «Рамантык з Люцынкі».
11.05, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
12.05 Дак. фільм «Нікаля дэ Сталь. Прага пісаць...».
13.00 «Тэатр. Выбранае...». Labas! Прывітанне! Здравствуйте, соседи!
13.40 «Віват, кароль!». Новы арган у Віцебску.
14.10 Анекдот. LAD.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.10 Клуб былых жонак.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Усё пра бяспеку.
19.25 Цудоўная сямёрка. Эпізод чацвёрты. Фінал.
20.30 Калыханка.
20.45 Невытлумачальна, але факт.
21.50 Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.
22.55 Шок-О-ЛАД.
23.55 Казанова.
0.25 Меладрама «Бура».

6.00. 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 «Вовачка-2». Серыял.
9.00 «Салдаты 13». Серыял.
10.00 «Новыя падарожжы дылетанта».
10.40 «Аўтапанарама».
11.00 «Рэбека». Серыял.
11.50, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.
12.40 «НЛА: Руская версія». Дак. фільм.
13.00 «Асабісты інтарэс».
13.50 «Відавочца прадстаўляе: самае шакіруючае».
14.45 «Магутныя рэйнджары. Касмічны патруль «Дэльта». Мультсерыял.
15.10 «Элен і рабяты». Серыял.
15.40 «Далёкія сваякі».
16.00 «Ёсць кантакт».
17.30 «Званая вячэра».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 Камедыя «Абрабаванне па-французску».
22.55 «Відзьма-нявідзьма».
23.35 Баявік «Атрад выратавання».
1.00 «Па поўнай праграме».

5.00, 6.15, 7.00 Ранішні канал.
5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».
6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 «Навіны Садружнасці».
6.05 «Асабістае жыццё Аляксандра Маслякова».
6.45 Камерцыйная праграма.
7.30 Даведнік.
8.00 Серыял «Рускія амазонкі-2».
9.15 Ток-шоў «Спрэчная тэрыторыя».
10.15 «Арт-рэвалюцыя».
10.30 Серыял «Дзікі месяц».
11.30 Дак. серыял «Вясельныя вар'яцтвы».
12.15 Студыя 60х90.
12.25, 22.25 Маст. фільм «Мой англійскі дзядуля».
14.15 «Вучым англійскую».
15.25, 0.15 Дак. серыял «Сліўкі общества».
16.25. 1.45 «На мяжы магчымага».
17.25, 2.45 «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
18.00 Дзелавы тыдзень.
18.25 «Без палітыкі».
18.45 «Азія Даусы», Казахстан.
19.45 «Цік-так».
20.00 «Слава за хвіліну».
21.25 Серыял «Лаура і Зоя».
2.00, 1.15 Садружнасць live.

7.00, 19.15 «Навіны кіно».
7.10, 10.55, 23.25 «Метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Быць Стэнлі Кубрыкам».
9.00 «Дом жывых гісторый».
9.30 «К-відэа» для дзяцей.
9.50 Серыял «Паліцэйскія гісторыі».
10.40 «Музпарад».
10.50, 21.20 «К-гульні».
11.00 Маст. фільм «Яе звалі Нікіта».
12.30 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Пераможны голас верніка».
17.00 Мультпарад.
17.15 «Фантастыка і прыгоды».
19.25, 21.25 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.30 Серыял «Семнаццаць імгненняў вясны».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «Зялёны дом».
21.30 Меладрама «Элізэ».
3.00, 23.30 «Хіт-парад тэлечата».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.05 «Мой сярэбраны шар. Эраст Гарын».
9.55 Серыял «Тайны следства-7».
10.45, 17.50 Весткі. Дзяжурная часць.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25, 14.20, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45 Серыял «Мая граніца».
12.35 «Гарадок».
13.00 Серыял «Шчасце ты маё».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.35 «Кулагін і партнёры».
15.05 Суд ідзе.
15.55 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
18.00 Серыял «Алён-ахоўнік».
19.50 Спакойнай ночы, малыя!
20.00 «Юрмала-2007».
21.15 Маст. фільм «Час падзення».
23.10 Камедыя «Чылаут!».

6.00 Сёння раніцай.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
9.00 Серыял «Формула стыхіі».
10.25 «Перамогшыя смерць».
10.50 «Галоўная дарога».
11.20 Серыял «Права на шчасце».
13.30 Меладрама «Дарагі Фрэнкі».
15.25 «Асарці».
15.30 «Агляд. Выратавальнікі».
16.25 Серыял «Каменская-3».
18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.45 «Следства вялі...».
20.50 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
21.10 Трылер «Эфект матылька-2».
4.00, 23.00 Драма «Небяспечная гульня».

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
7.50 Выбары Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.
8.00, 13.45, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.05 «Маладая гвардыя». Маст. фільм.
9.40 «Вячаслаў Ціханаў. Жыццё і імгненні». Дак. фільм.
10.45 «Рака-мора». Серыял.
11.45 «Афіцэры». Серыял.
12.45 «Засакрэчанае каханне». «Зямля і неба рэзідэнта».
13.50 «Небяспечная зона».
14.30, 4.20 «Закон Вольфа». Серыял.
15.30 Новая «Часінка».
16.50 Выбары Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.
17.15 Нашы любімыя жывёлы.
17.50 «Расплата за грахі». Серыял.
18.55 «У цэнтры ўвагі». «Вайна з пахмеллем».
20.00 Маст. фільм «Мядовы месяц».
22.10 «Народ хоча ведаць». Ток-шоў.
23.15 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.45 Маст. фільм «Дні зацьмення».
2.20 Пятроўка, 38.
2.40 «Гонка з праследаваннем». Маст. фільм.
5.00, 5.15 «Дабрыня Нікіціч». Мультфільм.

9.30, 1.15, 2.00 Ралі. Чэмпіянат свету.
10.00, 16.45 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
11.00 Футбол. Еўра-2008. Таварыскі матч.
11.45, 19.30, 23.00 Снукер.
13.00, 0.00 Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый.
15.00 Тэніс. Турнір WTA.
19.15, 0.30, 1.45 Футбол. Еўрагалы.
21.00 Лёгкая атлетыка. Спаборніцтвы ў памяшканні.
6.00, 0.45 Экстрэмальны спорт.

ФІЛЬМ ДНЯ

НТБ 13.30 «ДАРАГІ ФРЭНКІ» (ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ, 2004 г.)

Узнагароды: прыз Хартлэндскага КФ (ЗША, 2004 г.), прыз МКФ у Сіэтле (2004 г.), прыз КФ у Лос-Анджэлесе (2004 г.), прэмія Манрэальскага МКФ (2004 г.), прыз КФ «Jackson Hole Wildlife Film Festival» (ЗША, 2004 г).

Дзевяцігадовы нямы Фрэнкі ў пастаянных пераездах жыве з маці-адзіночкай Лізі. Ён чакае свайго бацьку, які, як сказала маці, служыць на крэйсеры. Яна піша сыну пісьмы ад яго імя пра экзатычныя краіны, але хутка той крэйсер на самай справе прыстане ў іх горадзе.

Рэжысёр — Шона Аўэрбах. **У ролях:** Эмілі Морцімер, Джэрард Батлер, Шарон Смол, Джэк МакЭлоўн, Мэры Рыгэнс, Шон Браўн, Джэйд Джонсан.

СУБОТА, 9 ЛЮТАГА

6.35 Дак. серыял «Іконы моды».
7.00 Брытва Акама.
7.25 Існасць.
7.50 Добрай раніцы, Беларусь!
9.00, 12.00, 15.00, 18.00 Навіны.
9.05 Здароўе.
9.40 Серыял «Дзядуля маёй мары».
10.15 Шпілька.
10.50 Тайны смак.
11.20 Ранішняя хваля.
12.15 Камедыя «Афоня».
14.00 «Купала. Колас. Тайны біяграфіі».
14.25 Мужчынскі характар.
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 Вакол планеты.
16.10, 19.20, 21.40 Серыял «Пастка».
18.20 «Ваша лато».
21.00 Панарама.
0.10 Bee Gees. Канцэрт у Нью-Йорку.

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30, 3.00 Нашы навіны.
9.05 Серыял «Сябры».
9.35 «Здароўе».
10.20 «Смак».
10.55 «Фрэд — пячорны чалавек».
11.05 «Прыгожыя і жахлівыя». Дак. серыял.
12.00 «Тэлечасопіс «Саюз».
12.30 Маст. фільм «Вузкі мост».
16.10, 21.00, 3.20 Навіны спорту.
16.15 Камедыя «Танны дэтэктыў».
17.55 «У свеце людзей».
18.55 «Адзін супраць усіх».
20.00 Вялікая палітыка.
21.05 Дэтэктыў «Сярэбраны самурай».

У фільме пераплятаюцца інтрыгі пры дварэ Пятра III і загадкавыя забойствы нашых дзён, якія здарыліся на тэрыторыі палаца-музея Аранienбаўм.

23.00 «Наша Belarussia».
23.30 Драма «Філадэльфія».
Драматычная гісторыя смяротна хворага чалавека, які не страціў надзею. Чалавека, які верыў у справядлівасць.
1.45 Маст. фільм «Белы зомбі».
3.25 Маст. фільм «Каханне з прывілеямі».
5.40 Маст. фільм «Прыгоды зубнога ўрача».

7.40 Маст. фільм «Казка аб страчаным часе».
9.00 Свая кампанія.
10.05 Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
10.45 Школа рамонту.
11.55 Біятлон. Чэмпіянат свету. Спрынт. Жанчыны.
13.30 Добрыя навіны.
14.05 «Касмапалітэн». Відэаверсія.
15.10 Біятлон. Чэмпіянат свету. Спрынт. Мужчыны.
16.35 ПРАсоўванне+.
16.55 Хакей. «Кубак Палесся-2008». Беларусь—Данія.
19.10 «Тэатр. Выбранае...» Актрыса Эмілія Пранскутэ.
19.40 «Спорт, спорт, спорт...» Валерый Белан.
20.15 Камедыя «Дзіця да лістапада».
22.05 Анекдот. LAD.
22.25 Трагіфарс «Змешвальнік».
0.05 Гандбол. Кубак выкліку. 1/8 фіналу. «Аркатрон»—«Прышціна».

6.30 «Ваенная тайна».
7.20 Анфас.
7.35 «Прыгоды кенгуранят». Мультсерыял.
8.00 «Трое зверху». Серыял.
9.00 «Наш дом».
9.25 «Вялікія мазгаломы».
10.25 «Прачніся і спявай».
11.00 «Мінск і мінчане».
11.30 «Халасцякі». Серыял.
12.30 Маст. фільм «Ува-га! Усім пастам...».
14.05 «Геркулес». Мультсерыял.
14.30 «Новыя падарожжы дылетанта».
15.00 «Народжаныя ў СССР».
15.45 «Відзьма-нявідзьма».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.40 «Фантастычныя гісторыі».
17.30 «Наша справа».
17.40 «Прыватныя гісторыі».
18.30 «Паспець усё».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Маст. фільм «Праклён залатой кветкі».
22.30 «Бла-бла-шоў».
23.40 Драма «Прыватнае жыццё».
1.20 Баявік «Непераўзыдзены баец».

5.00, 12.15 «Любімыя акцёры».
5.10, 12.25 Маст. фільм «Іван ды Мар'я».
7.00 Камерцыйная праграма.
7.30 «Паэзія Арменіі».
7.45 Мультсерыял «Прыгоды маленькай рыбкі».
8.15 «У гасцях у Мінуткі».
8.30 Серыял «Славуты Джэт Джэксан».
9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 «Навіны Садружнасці».
9.15 «Мар, дзейнічай, будзь!».
9.45 «Ведаем рускую».
10.45 «Любоўныя гісторыі».
11.30 «Вялікая будоўля».
11.45 Студыя 60х90.
14.15 «Арт-рэвалюцыя».
14.30 Спецрэпартаж.
14.45 «Казахстан: старонкі гісторыі».
15.25 Дак. серыял «Гэтыя цудоўныя жывёлы».
16.25 «Аднакашнікі».
17.25 Серыял «Душачка Моніка».
18.25, 1.15 Маст. фільм «Клуб няўдачніц».
20.30, 0.55 «Супраць мафіі».
21.25 Кінаіндыя. Маст. фільм «Сэрцаед».
23.55 Серыял «Горац».

9.00, 23.15 «Навіны кіно».
9.05, 23.25 «Метэапрагноз».
9.10 «Адзінка ў кубе».
9.30, 15.00 Мультпарад.
9.55 «К-гульні».
10.00 «Хіт-парад тэлечата».
10.15 Маст. фільм «Элізе».
12.15 Маст. фільм «Пагранічны гарадок».
14.30 «Змяні свой свет».
16.30 «Адшукваецца адпачынак».
16.50 Камедыя «У джазе толькі дзяўчаты».
18.55, 21.05 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.00 Трылер «Джыперс-Крыперс».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Трылер «Чужы».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
8.15 «Уся Расія».
8.30 «Огі і прусакі». Мультсерыял.
8.50 Мультфільм.
9.00 «Ваенная праграма».
9.20 «Студыя «Здароўе».
9.55 Ранішняя пошта.
10.30 Гарадок.
11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
11.10 «Суботнік».
11.50 «Успомніць усё».
12.20 Мультфільм.
12.35 «Вакол свету».
13.30 «Сінеманія».
14.20 Маст. фільм «Канфліктная сітуацыя».
16.40 «Крывое люстэрка. Тэатр Яўгена Петрасяна».
18.30 «Рэвізор».
19.20 «Суботні вечар».
21.15 Меладрама «Капіруючы Бетховена».
23.05 Трылер «Віртуальнае шоў».
0.55 «Гарачая дзесятка».

7.30 Мультфільмы.
8.00, 10.00, 13.00, 16,00, 19.00, 22.00 Сёння.
8.20 «Казкі Бажэнава».
8.45 Мультфільм.
8.55 «Агляд».
9.25 «Без рэцэпта».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.30 «Асабліва небяспечны!».
14.10 Фільм-фэнтэзі «Чароўны партрэт».
16.25 «Жаночы погляд» Аксаны Пушкінай. Павел Глоба.
17.05 Серыял «Сышчыкі-5».
19.45 «Прафесія — рэпарцёр».
20.25 «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
21.30 «Рускія сенсацыі».
22.35 «Ты не паверыш!».
23.30 Трылер «Застацца ў жывых».
1.20 «Дас іст фантасціш».
1.50 «Рэальная палітыка».

5.35 «На чужым свяце». Маст. фільм.
7.00 АБВГДэйка.
7.30 Праваслаўная энцыклапедыя.
8.00 «Жывая прырода». «Самая вялікая змяя ў свеце».
8.45, 13.45, 17.00, 18.00 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
9.05 Фільм-казка «Як Іванка дурненькі за цудам хадзіў».
10.30, 13.30, 16.30 Падзеі.
10.45 «Рэпарцёр» з Міхаілам Дзегцяром.
11.05 Лінія абароны.
11.50 Ігар Бутман у праграме «Сто пытанняў даросламу».
12.40 Гарадскі сход.
13.55 «Памылка прэзідэнта Клінтана». Фільм Леаніда Млечына.
14.45 Дэтэктыў «Выстрал у тумане».
16.45 Пятроўка, 38.
17.05 «Гарачыя кропкі халоднай вайны». «Польскі арол супраць чырвонай зоркі». Фільм 2-гі.
18.05 «Чыста англійскае забойства». Серыял.
20.00 «Пастскрыптум» з Аляксеем Пушковым.
21.10, 23.30 Маст. фільм.
23.15 Падзеі.
1.20 «Мядовы месяц». Маст. фільм.
3.25 «Закон Вольфа». Серыял.
4.25 «Карлсан вярнуўся». Мультфільм.

9.30, 0.30, 2.30 Ралі. Чэмпіянат свету.
10.00, 18.45, 0.00 Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый.
10.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
11.30, 17.00 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
12.00, 15.15 Біятлон. Кубак свету.
13.30 Горныя лыжы. Кубак свету.
14.45, 16.45 Вось гэта дзіва!!!
21.00 Тэніс. Турнір WTA.
22.00 Снукер.
1.00 Байцоўскі клуб.

ФІЛЬМ ДНЯ

СТБ 20.10 «ПРАКЛЁН ЗАЛАТОЙ КВЕТКІ» (ГАНКОНГ—КІТАЙ, 2006 г.)

Кітай, X стагоддзе. З доўгага паходу вяртаецца імператар. Ён здзіўлены халоднай сустрэчай прыдворных. Імператрыца старанна скрывае тайную сувязь з кронпрынцам, дзіўна паводзіць сябе і сын. Двор пагруз у любоўных і палітычных інтрыгах, аплятаючых дварэц, нібы гірлянды залатых хрызантэм.

Рэжысёр — Чжан Імоу. **У ролях:** Гонг Лі, Юнь-Фат Чоу.

НЯДЗЕЛЯ, 10 ЛЮТАГА

5.40 Меладрама «Ты не адзінокі. Іншапланецянін на зямлі Індыі».
8.30 Альманах падарожжаў.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05 «Арсенал».
9.35 Серыял «Дзядуля маёй мары».
10.10 Культурныя людзі.
10.45 Nota Bene.
11.15 У свеце матораў.
11.45 ЕўраФэст. Дзень за днём.
12.15 Меладрама «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў».
14.05 «Купала. Колас. Тайны біяграфіі».
14.30 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30, 19.10 Серыял «Пастка».
18.10 Суперлато.
21.00 Панарама тыдня.
22.25 Вось дык шоў!
23.25 Усе стыхіі.

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная прапаведзь.
9.20 Серыял «Сябры».
9.50 «Бесталковыя нататкі».
10.10 Пакуль усе дома.
11.00 Фазэнда.
11.35 «Ранішняя пошта».
12.20 «Разумніцы і разумнікі».
13.00 «Страсці па насякомых». Дак. фільм.
13.30 Нядзельны «Ералаш».
13.40 «Вяртанне дадому. Аляксандр Абдулаў. Фергана».
14.25 Камедыя «Паліцэйская акадэмія-4».
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Міжнародная панарама».
16.40 «Бляск і беднасць каралевы камедый».
17.40 КВЗ у Сочы. Старт сезона.
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.35 Маст. фільм «Лузер».
23.35 «Камедзі клаб».
0.10 «Бразільскі футбол на АНТ».
2.10, 3.15 Маст. фільм «Мэверык».
3.10 Навіны спорту.
4.30 «Гісторыя аднаго цуду».
5.05 «Пакуль усе дома».

7.40 Звон.
8.10 Мір вашаму дому.
8.20 Бухта капітанаў.
9.00 Наша пяцёрачка.
10.05 Несвоечасова.
10.45 Школа рамонту.
11.50 Клуб былых жонак.
12.55 Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка праследавання. Жанчыны.
13.40 «Лабірынты». Першы Хрост: Торвальд Вандроўнік.
14.10, 23.00 ПРАсоўванне+.
14.30 Слова пісьменніка.

9.15 Даведнік.
9.45 «Хіт-экспрэс».
10.45 «Хвост каметы».
11.45 «Студыя 60х90».
14.15 «Каму на Русі жыць добра».
14.45 «Тэрыторыя KG».
15.25 Дак. серыял «Містычная Азія».
16.25 «У нашу гавань заходзілі караблі».
17.25 Серыял «Душачка Моніка».
18.15 «Без палітыкі».
18.25, 1.15 Маст. фільм «2009: сцёртая памяць».
20.30, 0.55 «Рандэву з зоркай».
21.00 «Разам».
22.00 Маст. фільм «Бульвар Сансет».
23.25 «Паўночнікі».
23.55 Серыял «Горац».

9.00, 18.50 «К-гульні».
9.05, 23.30 «Метэапрагноз».
9.10 «Адшукваецца адпачынак».
9.30 «Мультпарад».
9.55, 21.00 «Навіны кіно».
10.00 «Мой любімы гадаванец».
10.15 Трылер «Чужы».
12.15 Маст. фільм «Незакончаная вячэра».
14.30 «Добрая вестка з Рыкам Рэнерам».
15.00 «К-відэа для дзяцей».
15.20 Фільм для дзяцей.
16.45 Драма «Басейн».
18.55, 21.20 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.00 Трылер «Джыперс-Крыперс-2».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «Зялёны дом».
21.25 Маст. фільм «Ліцэнзія на шлюб».

7.00, 11.00 Весткі.
7.10 Маст. фільм «Хто, калі не ты».
8.30 Мультсерыял «Огі і прусакі».
8.55 «Дыялогі пра жывёл».
9.30 «Смехапанарама».
10.10 «Сто да аднаго».
11.10 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.20 «Сам сабе рэжысёр».
12.10 «Пазмагайся з нацыяй».
12.40 «Формула ўлады». Прэм'ер-міністр Арменіі Серж Саркісян.
13.10 «Пакой смеху».
13.25 Маст. фільм «У бары брусніцы».
16.10 Весткі. Дзяжурная часць.
16.40 «Сумленны дэтэктыў».
17.10 Вялікі святочны канцэрт.
19.00 Весткі тыдня.
20.00 «Спецыяльны карэспандэнт».
20.30 Маст. фільм «Каханне на траіх».
Аднойчы, падчас аперацыі па затрыманні небяспечнага злачынцы, Пол выпадкова даведваецца аб здрадзе сваёй жонкі з блізкім сябрам.
22.15 Маст. фільм «Залатая жыла».

6.45 Мультфільм.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.15 «Дзікі свет» з Цімафеем Бажэнавым.
8.35 «Шчаслівы рэйс».
9.30 «Усе адразу!».
10.20 «Ядзім дома!».
10.55 «Іх норавы».
11.25 «Авіятары».
11.55 «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
12.30 «Адзін дзень. Новая версія».
13.30 «Крамлёўскія дзеці». «Дзеці Шчарбакова. Іх бацька мог узарваць Маскву».
14.20 Камедыя «Прынцы паветра».
16.25 «Перамогшыя смерць».
17.05 «Ты — супер-стар».
19.00 Сёння. Падагульняючая праграма.
20.00 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.40 «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
21.20 «Галоўны герой».
22.40 «Нядзельны вечар».
23.50 Драма «Догвіль».

4.50 Маст. фільм «Стрэл у тумане».
6.30 Фактар жыцця.
6.55 Дзённік падарожніка.
7.25 Сялянская застава.
8.00 «Жывая прырода». «Кальмар-забойца».
8.45 «21 кабінет» з Віктарам Бяліцкім.
9.20 «Наша музыка». Група «Фабрыка».
9.55 «Дэтэктыўныя гісторыі». «Могільнікавы кашмар».
10.30, 23.10 Падзеі.
10.40 Камедыя «Спячы леў».
12.10 Алена Захарава ў праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
12.35 «Фабрыка думкі». Ідэя для Расіі.
13.30 Падзеі. Маскоўскі тыдзень.
14.00 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
14.25 «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Гадзіна пік».
15.15 «VIP-місія». Спецыяльны рэпартаж.
15.40 Камедыя «Мая мачэха».
17.10 Тэлегульня «Адзін супраць усіх».
18.05 Камедыя «Рэцэпт вядзьмаркі».
20.00 «У цэнтры падзей» з Ганнай Прохаравай.
21.00 Дэтэктыў «Пуаро Агаты Крысці».
23.25 Баявік «Нястрымныя».
1.05 Маст. фільм.
3.05 Маст. фільм «І ты ўбачыш неба».
4.30 Мультпарад.

9.30, 0.00 Ралі. Чэмпіянат свету.
10.00 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
11.00, 13.00, 15.15 Біятлон. Чэмпіянат свету.
12.00 Горныя лыжы. Кубак свету.
13.45 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
15.00 Вось гэта дзіва!!!
16.00 Тэніс. Турнір WTA.
17.45 Лёгкая атлетыка. Спаборніцтва ў памяшканні.
19.00, 23.30, 0.30 Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый.
21.00 Снукер.
23.00, 2.00 Агляд снежнага ўік-энда.

ФІЛЬМ ДНЯ

ЛАД 20.55 «МЭНСФІЛД-ПАРК» (ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ, 1999 г.)

У бастыёне вышэйшай брытанскай арыстакратыі XVIII стагоддзя пражывае сям'я Томаса Бертрама. І тут жа жыве Фані, іх 12-гадовая бедная сваячка. Хутка яна вырастае ў прыгожую, разумную і адукаваную дзяўчыну, але ў доме ёй пастаянна даюць зразумець, што яна проста дармаедка без пасагу.

Рэжысёр — Патрыцыя Разема. **У ролях:** Джоні Лі Мілер, Фрэнсіс О'Конар, Алесандра Нівола, Эмбет Дэвідз, Хэралд Пінтэр, Ліндсей Данкен.



Тэлесеткі

Ад раддома да паштамта

З 22 лютага на тэлеканале АНТ пачнецца працяг праекта «Цудоўная пяцёрка» — «Цудоўная пяцёрка-2». Нагадаем, арыгінальная назва праграмы — «Спяваючыя офісы», а сутнасць засталася нязменнай: прадстаўнікі розных, ніяк не звязаных з прафесійным вакалам і музыкай устаноў, адбіраюцца ў каманды па 5 чалавек і спрабуюць «спецца» — хто лепш.

У кожным шоў удзельнічаюць па дзве каманды, у фінал іх выходзіць 5, а пераможцам гледачы ў ходзе інтэрактыўнага галасавання прызнаюць толькі адну. На кану стаіць галоўны прыз у 25 мільёнаў рублёў.

Калі на першы праект удзельнікі згаджаліся асцярожна, а то і не вельмі ахвотна, то на другі, можна сказаць, утварылася нават чарга з жадаючых. Але найбольш пашанцавала толькі 10 арганізацыям: Мінскаму метрапалітэну, аднаму з таксапаркаў, аб'яднанню байкераў, радзільнаму дому № 3, СШ № 119, Дзяржынскаму агракамбінату, Ваеннай акадэміі, Мінскаму трактарнаму заводу, Галоўпаштамту і Батанічнаму саду. Папярэднія адборы, на якіх здымачны «дэсант», а таксама выкладчыкі па вакалу Вольга Вронская і Таццяна Лігорская ацэньвалі здольнасці будучых канкурсантаў, ужо адбыліся, хутка пачнуцца рэпетыцыі. Вядучымі шоў — лідарамі «сініх» і «чырвоных» каманд — засталіся ўсё тыя ж харызматычныя выхадцы з КВЗ Дзмітрый Танковіч і Яўген Смарыгін адпаведна, а музычнае суправаджэнне праекта забяспечвае вядомы джазавы гурт «Apple Tea».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Дзве даты

1 лютага

1518 год — 490 гадоў таму ўбачыла свет пражскае выданне Францыска Скарыны — кніга «Еклезіяст», кананічная кніга Старога запавету. Аўтарам лічыцца цар Ізраільска-Іудзейскага царства Саламон. Асноўны матыў — марнасць спроб чалавека даведацца аб сэнсе жыцця. На тытульным лісце кнігі ўказана — «Зуполлне выложенный на руский язык доктором Францискомъ Скорининымъ сыном с Полоцка». Выданне ўпрыгожана гравюрай «Саламон і царыца Саўская». Мова — царкоўнаславянская беларускай рэдакцыі.

1411 год — Торуньскім мірам завершана Вялікая вайна (1409—1411 гг.) Тэўтонскага ордэна з Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай.

Цытата дня

«Хто рухаецца наперад у навуках, але адстае ў маралі, той больш ідзе назад, чым наперад».

Арыстоцель (384—322 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.58	16.49	8.51
Віцебск —	7.52	16.34	8.42
Магілёў —	7.48	16.39	8.51
Гомель —	7.39	16.41	9.02
Гродна —	8.12	17.05	8.53
Брэст —	8.07	17.12	9.05

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Марыі, Давіда, Іосіфа, Макара, Якава;*
К. *Таццяны, Чаславы, Аркадзя, Бенядзікта, Бярнарда, Часлава.*

НАДВОР'Е на заўтра

— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні

2 гадз.	5 гадз.	8 гадз.	11 гадз.	14 гадз.	17 гадз.	20 гадз.	23 гадз.

...у суседзяў

ВАРШАВА +5..+7°С	**КІЕЎ** +1..+3

НАДЗЕЙНАСЦЬ СІСТЭМ РУЛЯВОГА КІРАВАННЯ — У НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ



Барысаўскі завод «Аўтагідраўзмацняльнік» атрымаў па выніках мінулага года прэмію ўрада за дасягненні ў галіне якасці

Асобныя палажэнні прадпрыемства з «Палітыкі ў галіне якасці»

Місія прадпрыемства — вырабляць сучасныя канкурэнтаздольныя вузлы сістэмы рулявога кіравання і іншыя аўтамабільныя кампаненты.

Стратэгія — утрыманне вядучых пазіцый на аўтамабільным рынку краін СНД і Рэспублікі Беларусь і заваяванне рынкаў далёкага замежжа.

Задача — выпускаць прадукцыю толькі высокага ўзроўню якасці, якая забяспечвае і перасягае чаканні спажыўцоў і прыносіць прыбытак прадпрыемству.

Якасць — мэта № 1. Кожны работнік працоўнага калектыву ўсведамляе: пачуццё адказнасці перад спажыўцамі і імкненне да дасканаласці — ключ да поспеху.

З заводам «Аўтагідраўзмацняльнік» многія, па сутнасці, звязалі ўсё сваё жыццё, у многіх у працоўнай кніжцы толькі адзін адпаведны запіс. Тут нямала хто працуе сем'ямі. З адной з такіх працоўных дынастый мы пазнаёміліся.

Такім чынам, прадстаўляем: Мардвінцавы, якіх вы бачыце на здымку. **Заснавальнікі дынастыі — Мардвінцаў Мацвей Іванавіч, намеснік начальніка ўпраўлення якасцю, і Мардвінцава Наталля Мікалаеўна, вядучы інжынер па стандартызацыі і сертыфікацыі. Іх сын Аляксандр працуе намеснікам начальніка аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, дачка Таццяна Ісаковіч — інжынер-эканаміст.** У гэты спіс трэба ўнесці жонку сына, якая таксама працуе на «Аўтагідраўзмацняльніку» (на здымку адсутнічае па самай уважлівай для жанчын прычыне: даглядае дзіця).

Чаму гэтак прывязаліся Мардвінцавы да завода? На гэта пытанне вельмі коратка і ясна адказаў Аляксандр: «Надзейна тут». Маючы на ўвазе гэту самую надзейнасць, ён некалі, падчас выбару — ісці на «Аўтагідраўзмацняльнік» або ў прыватную структуру і выбраў завод.

Гісторыя завода — гэта старонка гісторыі ўсяго Барысава, — сказаў нам намеснік галоўнага інжынера Юрый Камадзей у музеі прадпрыемства.

ШТО ГАЛОЎНАЕ Ў АЎТАМАБІЛІ? У сэнсе бяспекі яго руху? Ну, вядома ж, надзейнае рулявое кіраванне ды тармазная сістэма. На забеспячэнне гэтай агульнай надзейнасці мы і працуем, выконваючы сваю асобна ўзятую задачу па камплектаванні аўтамабіляў надзейнымі сістэмамі рулявога кіравання...

Так, ці прыкладна так неаднойчы гаварылі на барысаўскім заводзе «Аўтагідраўзмацняльнік», падкрэсліваючы важнасць, а найперш адказнасць сваёй работы.

Прыгадаем крыху тое, што вядома многім аўтамабілістам. Намаганне, прыкладзенае да рулявога кола, з дапамогай гідрасістэмы павялічваецца ў многія дзесяткі разоў (да 100 і болей атмасфер «працуюць» у гэтай гідрасістэме), паэтапна перадаецца на многія элементы рулявога механізма (рулявую рэйку, сектар і г.д.), і ўсё ў гэтай сістэме павінна дзейнічаць лёгка, узгоднена і бездакорна. Толькі ў такім разе наш аўтамабіль будзе добра слухацца нас, рухацца ў патрэбным для нас напрамку. Добра вядомае «моцна за абаранак трымайся, шафёр» ніколькі не дапаможа, калі ў сістэме рулявога кіравання адбудзецца нейкі збой... Расказваючы пра тонкасці зборкі рулявых механізмаў, на заводзе падкрэслівалі: вось тут, на сучляненнях дэталяў, павінны быць допускі, не большыя за некалькі мікрон. Зразумела, гэта трэба для таго, каб потым, пры эксплуатацыі аўтамабіля, выключыць нават самы нязначны механічны люфт у рулявым механізме, а значыць, і магчымую аварыю... Яшчэ больш жорсткія допускі ўстаноўлены на аперацыях — пры вырабе гэтых дэталяў, на ўсіх этапах іх апрацоўкі.

У свой час завод «Аўтагідраўзмацняльнік» быў створаны як завод-спадарожнік добра вядомага аўтагіганта «КамАЗ». Да 60 працэнтаў барысаўскіх сістэм рулявога кіравання ішло менавіта на гэты гігант. Пры гэтым барысаўчане асвойвалі выпуск сваіх сістэм і для іншых аўтазаводаў былой вялікай краіны; іх сістэмамі пачынаюць камплектавацца аўтобусы, тралейбусы. Барысаўчане практычна становяцца ў краіне манапалістамі ў сваёй справе. Асаблівы штуршок развіццю прадпрыемства, значнаму расшырэнню тыпаразмернага шэрагу яго сістэм рулявога кіравання надалі наступствы непрыемнага здарэння ў яго ранейшага асноўнага партнёра — КамАЗа, калі тут на заводзе па вытворчасці рухавікоў здарыўся пажар, і ён практычна вывеў са строю ўсю гэту вытворчасць. На КамАЗе пасля гэтага рэзка падае выпуск аўтамабіляў — адпаведна, становяцца незапатрабаванымі і барысаўскія сістэмы рулявога кіравання. Але няма ліха без дабра. У Барысаве добра зразумелі, што ўсю справу па вырабе сістэм рулявога кіравання для аўтамабіляў трэба поўнасцю браць у свае рукі. Да гэтага барысаўчане, па сутнасці, працавалі выключна па заказах аўтазаводаў, па іх жа канструктарска-тэхналагічнай дакументацыі. Як прыгадвае былы галоўны канструктар «Аўтагідраўзмацняльніка», а цяпер начальнік выпрабавальнага цэнтра прадпрыемства Анатоль Фянько, барысаўчане аб'ехалі ўсе аўтазаводы былой савецкай краіны, вывучылі перспектывы іх развіцця, каб прапанаваць ім свае вырабы. Асабліва добрыя партнёрскія адносіны наладзілі з Горкаўскім аўтамабільным заводам, на якім актыўна распрацоўваліся новыя віды машын, пры гэтым ствараліся і свае ўласныя сістэмы рулявога кіравання. Барысаўчане пераканалі спецыялістаў гэтага аўтазавода, што, маючы неблагі вопыт, зробяць гэта і танней, і хутчэй. Тое супрацоўніцтва з ГАЗам, якое тады было наладжана, прайшло добрае выпрабаванне часам і значна пашырылася. Цяпер барысаўскі «Аўтагідраўзмацняльнік» мае цесныя партнёрскія адносіны ўжо з групай аўтазаводаў, якія аб'ядналіся пад маркай «ГАЗ», на іх ён пастаўляе палову сваёй цяперашняй прадукцыі. Сёння групу «ГАЗ» на барысаўскім прадпрыемстве называюць сваім стратэгічным партнёрам...

Гэта толькі кароткія ўводзіны ў сённяшнія і ранейшыя справы завода «Аўтагідраўзмацняльнік». А цяпер слова кіраўніку, іншым спецыялістам прадпрыемства.

— Стаць добрым спецыялістам у любой справе нялёгка, а ў нашай — тым больш. Тут мала таго ж інстытута ды няхай некалькіх гадоў работы непасрэдна на заводзе. Гідраўліка — тонкая рэч, не ўсім падаецца, — зазначыў падчас нашай гутаркі Васіль Ігнатавіч. — Што тут галоўнае? Грунтоўныя практычныя навыкі ды імкненне да дакладнасці, уменне «лавіць» мікроны. У сувязі з гэтым адзначу: на заводзе склалася добрая каманда спецыялістаў, у цэлым добрая школа. Гэта адзначаюць нават нашы канкурэнты, якія да нас часам прыязджаюць і з якімі мы абменьваемся найбольш агульнымі планамі развіцця.

— Раней, на былой постсавецкай прасторы, у вас канкурэнтаў практычна не было...

— Так. А цяпер з'явіліся два сур'ёзныя канкурэнты па рулявых механізмах — Стэрлітамацкі машынабудаўнічы завод «Інмаш» у Башкірыі і Елецкі завод «Гідрапрывод», які выпускае помпы гідраўзмацняльнікаў руля. Але мы знаходзім сваю нішу. Пры гэтым у Расію адпраўляем больш за 80 працэнтаў сваёй прадукцыі. Наш стратэгічны партнёр у Расіі — група аўтазаводаў «ГАЗ», на якія паступае 48 працэнтаў усіх нашых сістэм рулявога кіравання. У сувязі з гэтым асабліва хацеў бы падкрэсліць: на тым жа «ГАЗе» памяняўся ўласнік. Але мяняюцца кіраўніцтва, вышэйшыя менеджары, а тыя добрыя грунтоўныя партнёрскія адносіны, якія склаліся з расійскімі аўтамабілебудаўнікамі, надзейна захоўваюцца. Паміж канструктарамі, тэхнолагамі. І гэта нас вельмі радуе. Ва ўсім гэтым бачу залог далейшага неблагога развіцця нашага прадпрыемства. Нашы ж аб'ёмы, тэмпы развіцця, тэмпы абнаўлення прадукцыі цалкам залежаць ад нашых асноўных гандлёвых партнёраў, ад аўтамабілебудаўнікоў. Усё для нас дыктуюць менавіта аўтазборачныя канвееры. На іх апошнім часам даволі часта з'яўляюцца ўзоры новай прадукцыі — адпаведна, ідзе абнаўленне прадукцыі і ў нас. У мінулым годзе аб'ём новай прадукцыі ў нас склаў больш за 20 працэнтаў, думаем выйсці на такія ж тэмпы і сёлета.

Васіль Ігнатавіч ЛАЎНІК — генеральны дырэктар завода. Тут жа, на заводзе, пасля заканчэння Барысаўскага палітэхнікума, пачынаў сваю працоўную дзейнасць. Працаваў наладчыкам, майстрам. Завочна вучыўся ў Беларускім політэхнічным інстытуце і, адпаведна, прайшоў ступені тэхнолага, начальніка тэхбюро, начальніка цэха, намесніка галоўнага інжынера па перспектыўным развіцці і інш. На сваёй цяперашняй пасадзе крыху больш за паўгода.

— Карацей кажучы, вас канкурэнты асабліва не палохаюць.

— Пра іх ніколі нельга забываць. Ну вось цяпер на расійскі рынак аўтамабілебудавання вельмі актыўна ўкараняюцца кітайцы са сваімі аўтакампанентамі. Праўда, менавіта па сістэмах рулявога кіравання ў іх пакуль што няма прапаноў, але ж, пэўна, з'явяцца.

— А кітайцы часта бяруць цаной... Як у вас суадносяцца такія катэгорыі, як цана і якасць?

— Паўтару: гідраўлічныя сістэмы рулявога кіравання — гэта асабліва складаныя сістэмы, асабліва адказныя. І тут на першым плане, асабліва апошнім часам, стаіць якасць. Аднак пры з'яўленні больш жорсткай канкурэнцыі, няйначай, давядзецца аднолькава ўважліва ставіцца да дзвюх частак гэтай формулы — «цана—якасць».

— Назавіце, калі ласка, вашы апошнія найбольш цікавыя тэхнічныя праекты, найбольш заўважныя дасягненні.

— Пра тое, як завод рухаўся да прэміі ўрада ў галіне якасці, вам, напэўна, ужо расказалі (удакладнім: наша гутарка з Васілём Ігнатавічам адбылася пасля сустрэчы са спецыялістамі прадпрыемства), а вось зусім свежая і вельмі прыемная для нас навіна. Згодна з распоряджэннем калегіі Міністэрства прамысловасці завод стаў лаўрэатам прэміі ў галіне навукі за асваенне новай помпы для гідраўлічных рулявых сістэм у аўтамабілях КамАЗ, якая забяспечвае рэжым ціску ў гідрасістэме да 170 атмасфер. Гэта быў заказ расійскіх аўтамабілебудаўнікоў для іх новых вялікагрузных аўтамабіляў, да гэтага мы пастаўлялі помпы з максімальным ціскам да 100 атмасфер. У дадзеным выпадку нямала папрацавалі нашы канструктары, тэхнолагі, бо гэта помпа — прынцыпова новы прадукт. Словам, нашы спецыялісты выдатна справіліся з пастаўленай перад імі задачай, помпа вельмі добра ацэнена заказчыкам. І гэта, дарэчы, лішні раз сведчыць на карысць таго, што на прадпрыемстве ў такой тонкай справе, як гідраўліка, склалася неблагая школа.

Цяпер на прадпрыемстве ідзе асваенне помпы для сістэмы гідраўзмацнення руля ў аўтамабілях «Волга», «Собаль», «Газель». Чым адметная гэта справа? Помпа будзе ўстанаўлівацца на амерыканскіх рухавіках вытворчасці «Крайслер», якімі цяпер на 50 працэнтаў аснашчаюцца вышэйназваныя расійскія аўтамабілі. Наша прадпрыемства яшчэ ў 2006 годзе распрацавала канструкцыю гэтай помпы, выраблі дослодныя ўзоры, адправіла іх на «Крайслер», і яны там каля паўгода выпрабоўваліся. (Варта ўдакладніць: усё навяснае абсталяванне, якое ўстанаўліваецца на рухавік, павінна абавязкова ўзгадняцца з яго вытворцам.) А не так даўно мы атрымалі станоўчае заключэнне, і ўжо хутка на «ГАЗ» будзе адпраўлена першая партыя гэтых помпаў, якія цяпер будуць устанаўлівацца на рухавіках «Крайслера» паралельна з амерыканскімі. Аднак, асабліва варта падкрэсліць, што для нас найбольш галоўнае ў гэтым праекце: мы практычна пачынаем выходзіць са сваёй прадукцыяй на далёкае замежжа.

— Васіль Ігнатавіч, як можна меркаваць, у вас на заводзе шмат якое абсталяванне далёка не новае. У цэлым яно мае немалы працэнт зносу. Як «ловіце» тыя ж мікроны на такім абсталяванні?

— Так, наша абсталяванне мае каля 90 працэнтаў зносу. Гэта вельмі вялікі працэнт. Апошнім часам мы ўкладваем немалыя інвестыцыі ў вытворчасць, напрыклад, у мінулым годзе выкарысталі на тэхперааўзбраенне і асваенне новых відаў прадукцыі 12,4 мільярда рублёў. Аднак гэтага яўна недастаткова. Як пры ўсім гэтым выходзім са становішча, дабіваемся той жа выключнай дакладнасці? Па-першае, накіроўваем інвестыцыі ў першую чаргу на новыя тэхналогіі, на вытворчасць новых вырабаў. Так, на вытворчасць той жа помпы для «Крайслера» намі практычна поўнасцю закуплена новае высокадакладнае і высокапрадукцыйнае імпартнае абсталяванне. Па-другое, мы пры гэтай сітуацыі імкнёмся галоўным чынам абнавіць фінішнае абсталяванне, на якім галоўным чынам і ствараецца тая ж дакладнасць.

У заключэнне хачу сказаць: наш завод у мінулым годзе адзначыў 40-годдзе з дня свайго заснавання. Аднак мала заснаваць прадпрыемства — важна яго па-сапраўднаму стварыць. З добрым іміджам, з надзейнай прадукцыяй, якая не падводзіла б нашых партнёраў. І мы такое прадпрыемства стварылі, яго стварылі нашы людзі. Марка «Аўтагідраўзмацняльнік» добра вядомая, ёю можна ганарыцца.

ПРАБЛЕМА ЧАЛАВЕКА — НАША АГУЛЬНАЯ ПРАБЛЕМА

Расказвае намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Яўген КАРАШКОЎ:

— Наша дзяржава праводзіць сацыяльна арыентаваную палітыку, а мы — дзяржаўнае прадпрыемства. Значыць, і мы павінны мець абсалютна такі ж падыход у адпаведных пытаннях.

Цяпер асобныя прадпрыемствы пазбаўляюцца ад аб'ектаў сацыяльнай сферы. Непахіснай у гэтых адносінах застаецца наша пазіцыя. За мінулы год прадпрыемства выдаткавала на сацыяльную сферу каля 2 мільярдаў рублёў. Яно мае два дзіцячыя садкі, якія наведваюць пераважна дзеці заводскіх работнікаў, два інтэрнаты, Дом культуры, санаторый, дзіцячы аздараўленчы лагер, лекавы цэнтр.

А ўвогуле сёння нельга скардзіцца на балячкі, сёння модна быць здаровым. Адпаведна, на прадпрыемстве вялікая ўвага надаецца ўкараненню і прапагандзе здаровага ладу жыцця. Спартыўныя каманды прадпрыемства ўдзельнічаюць практычна ва ўсіх гарадскіх спаборніцтвах і, як правіла, займаюць першае месца. Другое месца для нас — гэта ўжо пройгрыш. Зімой на лыжную трасу выходзяць каля тысячы нашых работнікаў. Прычым гэтыя лыжныя забегі ператвараюцца ў сапраўднае спартыўнае свята. Ад фірмы, гэта значыць ад прадпрыемства, і за кошт фірмы — гарбата, кава, бліны, шашлыкі, хатнія каўбаскі... Праводзім і зусім экзатычныя спаборніцтвы, напрыклад, цукровыя эстафеты, або эстафеты з мехам цукру на плячах. Хто выйграў — той, вядома, і атрымлівае гэты мех у якасці прыза.

На заводзе распрацавана дакладная сістэма ідэалагічнай работы. Галоўнае месца ў гэтай рабоце займаюць штомесячныя дні інфармавання, якія заўсёды маюць пэўную тэматыку. Не ўпускаюцца падчас іх злабадзённыя пытанні; кожны на гэтых днях можа выступіць з крытыкай таго або іншага заводскага кіраўніка, выказаць усё, што яго хвалюе. Увогуле, на заводзе заведзена няўхільнае правіла: ніводнае пытанне чалавека не павінна застацца без адказу, любая яго праблема павінна быць нашай агульнай праблемай. Па сутнасці, на гэту мэту працуе і наш савет ветэранаў, а ўсіх іх у нас — 46. Прычым ветэранам па некалькі разоў на год выдзяляецца матэрыяльная дапамога.

Шмат увагі надаём выхаванню пачуцця гонару за свой калектыў, за наша прадпрыемства. Напрыклад, асабіста я сам — фанат свайго прадпрыемства; лічу, што працаваць на ім — найбольш прэстыжна ў нашым горадзе, хоць у ім ёсць і іншыя вельмі добрыя прадпрыемствы. Гэта даводзім у першую чаргу маладым работнікам, якія толькі што прыйшлі на завод. Для іх, напрыклад, абавязкова наладжваецца экскурсія ў заводскі музей прадпрыемства; расказваем ім аб традыцыях, гісторыі прадпрыемства. У нас ёсць за што трымацца. Я ўжо казаў пра нашу сацыяльную сферу; на заводзе неблагая заработная плата, нядрэнна вырашаюцца жыллёвыя пытанні. Так, як правіла, раз у два гады фарміруецца свой, заводскі, ЖБК; прадпрыемства заключае адпаведны дагавор з будаўнікамі горада. Пры гэтым завод аплачвае кошт праектна-каштарыснай дакументацыі, часткова — кошт работ пры закладцы фундамента дома, дапамагае сваёй тэхнікай, што значна памяншае кошт узвядзення дома. Удзельнікам ЖБК выдзяляецца бязвыплатная сума ў памеры 4 працэнтаў ад кошту іх кватэры, аказваецца дапамога ў афармленні льготнага 5-працэнтнага крэдыту.

Разам з усім гэтым на заводзе пільная ўвага надаецца працоўнай дысцыпліне, выкананню Дырэктывы № 1. Нельга хаваць, некалі на прадпрыемстве пасля працоўнага дня маглі адзначыць юбілей і г.д. Цяпер усё гэта проста выключана, тым больш пасля ўнясення адпаведных змяненняў і дапаўненняў у Працоўны кодэкс, якія ўступілі ў дзеянне з 26 студзеня. На прадпрыемстве актыўна працуе камісія па барацьбе з п'янствам і па прафілактыцы правапарушэнняў. Як зразумела ўжо, камісія не пакідае без адпаведнай увагі нашых работнікаў і тады, калі яны пахуліганілі за варотамі прадпрыемства.

Вельмі прыемнымі для нашых завадчан сталі сустрэчы нашага прафесійнага свята. Да гэтага дня падводзяцца вынікі вытворчага спаборніцтва на заводзе. Для падраздзяленняў, якія занялі прызавыя месцы, звычайная месячная прэмія падвойваецца. Лепшым інжынерна-тэхнічным работнікам робіцца (на год) 15-працэнтная надбаўка да акладу. Тыя работнікі, чые партрэты заносяцца на заводскую Дошку гонару, атрымліваюць 30-працэнтную надбаўку.

ЗАХАВАЦЬ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦЬ

З гутаркі з галоўным інжынерам Міхаілам Муравейнікавым

Наша вытворчасць — высокатэхналагічная, хоць абсталяванне ў нас і мае значны працэнт зносу. Тым не менш апошнім часам прадпрыемства актыўна абнаўляецца. Так, за апошні час мы набылі новае абсталяванне для фінішнай апрацоўкі дэталяў шарыка-вінтавых пар, карпусных дэталяў і іншых, якія маюць высокую ступень дакладнасці. Гэта ў выніку і дазваляе падтрымліваць якасць выпускаемай прадукцыі на высокім узроўні, захоўваць яе добрую канкурэнтаздольнасць і ў прыватнасці — канкурэнтаздольнасць нашых помпаў. Захаваць гэту канкурэнтаздольнасць і надалей — наша асноўная задача. Цяпер фарміруецца праграма інвестыцыйнага развіцця завода на гэты год, у якой прадугледжваецца прыцягнуць інвестыцыі у асноўны капітал на суму больш за 16 мільярдаў рублёў. Гэта будуць у асноўным уласныя сродкі і крэдыты банкаў.

У планах прадпрыемства — набыццё кагенерацыйнай установкі магутнасцю каля 2 МВт, якая будзе адначасова выпрацоўваць як электрычнасць, так і цяпло. Гэта дазволіць нам недзе напалову забяспечваць сябе ўласнай электраэнергіяй, прычым больш таннай.

ПЫТАННІ ЯКАСЦІ ВЫРАШАЕМ КОМПЛЕКСНА

Расказвае Віталій Лісоўскі, дырэктар па якасці:

— Да нядаўняй прэміі ўрада ў галіне якасці мы, па сутнасці, ішлі немалы час. Прадпрыемства тройчы за 9 гадоў выходзіла лаўрэатам прэміі Міністэрства прамысловасці ў галіне якасці, мае дыплом надзейнага пастаўшчыка.

У 1996 годзе пачалі работу па ўкараненні ў сябе сістэмы менеджменту якасці згодна з міжнароднымі стандартамі ISO 9001. І праз тры гады атрымалі адпаведны сертыфікат. Прычым пад нумарам 17, гэта значыць, былі, па сутнасці, аднымі з першых у рэспубліцы.

Аднак жыццё не стаіць на месцы. У свеце, у дапаўненне да патрабаванняў стандартаў ISO 9001, існуюць асобныя, больш высокія патрабаванні ў галіне якасці да прадпрыемстваў, якія вырабляюць аўтакампаненты для аўтамабільнай прамысловасці. Адпаведныя стандарты абазначаны як ISO ТУ 16949. Укаранення гэтых стандартаў патрабуюць як расійскія, так і беларускія аўтамабілебудаўнікі, якія камплектуюць свае машыны нашымі сістэмамі механізмаў рулявога кіравання. Адпаведная работа ў нас ўжо ідзе, і сёлета, думаю, мы атрымаем яшчэ адзін сертыфікат.

Нашу работу ў галіне якасці больш за ўсё характарызуе такі паказчык: колькасць здымаў нашых сістэм рулявога кіравання з канвеера ў аўтазборшчыкаў і непасрэдна падчас эксплуатацыі аўтамабіля. Што датычыцца канвеера, то сёння мы ўкладваемся ў 0,015 працэнта (гэта значыць, што на мільён пастаўленых намі сістэм прыходзіцца ўсяго 150 нядобраякасных); паказчык па выніках эксплуатацыі — 0,2—0,3. Гэта неблагія паказчыкі. Увогуле, калі гаварыць больш канкрэтна, па аўтамабілях групы ГАЗ мы паменшылі колькасць такіх здымаў за гарантыйны тэрмін аўтамабіля ў 3 разы па выніках 2006 года і яшчэ на 15 працэнтаў — па выніках 2007-га.

Пытанні якасці патрабуюць комплекснага падыходу да іх вырашэння. Напрыклад, нямала непрыемнасцяў нам дастаўлялі гумавыя манжэты для нашых помпаў, якія мы атрымлівалі з Курска, а такія манжэты — вельмі адказная дэталь у помпавым абсталяванні. Усе нашы намаганні знайсці сумеснае з завадчанамі з Курска прымальнае вырашэнне гэтай праблемы закончыліся марна. І ў выніку мы пайшлі на супрацоўніцтва з адной з нямецкіх фірмаў, а таксама з карэйцамі. Хоць іх гумавыя манжэты (напрыклад, для гідрасістэм рулявога кіравання «Волгі» і «Собаля») у 5—6 разоў даражэйшыя, затое больш надзейныя.

1. Ірына СКАРУКА працуе на свідравальным станку.

2. Выпрабаванні механізма праводзіць вядучы інжынер Уладзімір МАТОРЫН.

3. Наладчык станкоў з праграмным кіраваннем Аляксандр КАРЖАНЕЦ абслугоўвае апрацоўчы цэнтр для карпусных дэталяў рулявога механізма.

4. Станочніцы Таццяне ГРУК даверана самая сучасная металаапрацоўчая тэхніка. Аперацыі, якія яна выконвае, завяршаюць шэраг папярэдніх.

5. Выпрабавальнік Ігар ВАРГАН працуе на зборачным участку цэха вытворчасці малых серый.

6. На станку для высокадакладнай шліфоўкі працуе малады аператар Дзмітрый КАЗАК.



Інтэгральны рулявы механізм ШНКФ 453461.100 прызначаны для легкавых аўтамабіляў павышанай камфортнасці, мікрааўтобусаў, джыпаў. Гідраўзмацняльнікі 256Б—3405010-15 і 503-3405010-Ф1 прызначаны для аўтамабіляў КрАЗ, МАЗ, аўтобусаў, тралейбусаў.

Наладчык Аляксандр АРЦЮШЭНКА і інжынер з Германіі Норберт БРОГХАМЕР занятыя рэгуліроўкай новага замежнага такарнага аўтамата для апрацоўкі корпуса помпы.

АПОШНЯЕ «ДАБРО» ВЫПРАБАВАЛЬНАГА ЦЭНТРА

Амаль з дня заснавання завода, з 1969 года, працуе на ім **Анатоль ФЯНЬКО**. Ён прайшоў тут пэўныя ступені службовай лесвіцы, а з 1978 года і да мінулага працаваў галоўным канструктарам; цяпер — начальнік выпрабавальнага цэнтра. Карацей кажучы, надзейнасць сістэм рулявога кіравання, якія некалі ствараліся з яго непасрэдным удзелам, па-ранейшаму ў яго руках. Іх кантроль — 100-працэнтны. «Мы павінны быць упэўнены — яны нашых спажыўцоў не падвядуць», — зазначае Аляксандр Фянько.

У 2004 годзе выпрабавальны цэнтр «Аўтагідраўзмацняльніка» атрымаў ад сертыфікацыйных органаў спецыяльную акрэдытацыю.

Матэрыялы падрыхтавалі Іван БАРАНОЎСКІ, Віктар ПАЗНЯКОЎ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Веды — сіла!

За 50-гадовую гісторыю адбылося 45 выпускаў, сярэднюю адукацыю атрымалі каля трох тысяч выпускнікоў. Сярод іх — Мікалай Кірычэнка, народны артыст Беларусі, дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, вядомы драматург Андрэй Курэйчык, член зборнай Беларусі па хакеі Аляксандр Журык, узыходзячая зорка беларускай эстрады Алена Валошына, многія іншыя.

25-я гімназія — адна з лепшых у Мінску. Расказвае дырэктар гімназіі Таццяна Дымкова:

— Навучанне ў гімназіі пачынаецца з 5-га класа, прыём ажыццяўляецца на конкурснай аснове. У нас паглыблена вучаць англійскую мову і паралельна — другую замежную мову (нямецкую, французскую, польскую). Сярэдні ўзрост педагогаў гімназіі — 41 год. Педкалектыў надзвычай моцны: тры чвэрці супрацоўнікаў маюць першую і вышэйшую кваліфікацыйныя катэгорыі. Кацярына Корнышава і Вольга Паўлавец — выдатнікі адукацыі Беларусі. Многія настаўнікі былі сярод лаўрэатаў прэміі і гранта Мінгарвыканкама. У 2008 годзе адбудзецца першы гімназічны выпуск. Мы ганарымся, што ў 25-й традыцыйна высокая колькасць паступленняў выпускнікоў у ВНУ — 95—97 працэнтаў.

Зараз у гімназіі навучаецца 477 вучняў (21 клас), працуе 55 педагагічных работнікаў.

У гімназіі дзейнічае вучнёўскае самакіраванне «Гімназічная садружнасць» на чале з лідарам і яго камандай, якія выбіраюцца штогадова.

Традыцыйнымі сталі і штогадовыя гімназічныя конкурсы «Самы класны класны» і «Самы класны клас».

Жыву ў Беларусі — і тым ганаруся!

Цэнтрам ідэйна-патрыятычнага выхавання, пошукава-даследчай работы навучэнцаў з'яўляецца музей гімназіі. Невыпадкова музей быў пераможцам рэспубліканскага конкурсу краязнаўчых музеяў установ адукацыі «Даследчая дзейнасць і навуковыя дасягненні сучаснага музея ўстановы адукацыі».

Краязнаўчы музей заснаваны ў 1987 годзе пасля першай фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў вёску Галаўцы Нясвіжскага раёна. Пазней наладжваліся экспедыцыі ў вёску Зялёная Дуброва Барысаўскага і вёску Брэсхія Мядзельскага раёнаў. Сабрана каля 500 экспанатаў беларускага побыту. Музей папаўняўся і экспанатамі, якія збіралі вучні падчас летніх канікулаў у вёсках сваіх дзядуляў і бабуль. З цягам часу музей распрацаваў накірунак «Летапісанне школы» — вучні адшуквалі і прадметы школьнай атрыбутыкі канца XIX — пачатку XX ст.

Сярод тэматычных экспазіцый музея — ганчарныя вырабы, лён і апрацоўка лёну, беларускія ручнікі, ткацтва і вышыўка, саломапляценне і лозапляценне, інтэр'ер беларускай хаты, народныя музычныя інструменты...

Вучні вядуць вялікую пошукавую і даследчую работу «Патрыёты Бацькаўшчыны» сярод ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, выпускнікоў 25-й даваеннай школы імя Чарвякова, аказваюць дапамогу ўдзельнікам вайны і работнікам тылу.

Нядаўна з'явілася экспазіцыя, прысвечаная газеце «Звязда». Чаму? Аб гэтым крыху ніжэй.

Кіраўніком музея на працягу двух дзесяцігоддзяў з'яўляецца настаўніца беларускай мовы і літаратуры Аліна Пахвалёная. Гэта сапраўды настаўнік ад Бога, падзвіжнік сваёй справы.

Менавіта пад кіраўніцтвам Аліны Казіміраўны навукова-даследчыя работы вучняў перамагалі ў раённых, гарадскіх і іншых конкурсах. У мінулым годзе было высока ацэнена арыгінальнае даследаванне гімназістаў Лізаветы Ермаковай і Сцяпана Манкевіча «Радок «Звязды» ў гісторыі краіны». А на гэтым тыдні выхаванка А. Пахвалёнай 11-класніца Наталля Белая атрымала Дыплом I ступені ў Мінскім гарадскім конкурсе навукова-даследчых навучэнскіх работ у межах акцыі «Жыву ў Беларусі — і тым ганаруся». Яна даследавала разнавіднасці нацыянальнага арнаменту беларускага ручніка ў розных рэгіёнах Беларусі.

Падарунак для «Звязды»

Вучняў і настаўнікаў 25-й гімназіі мы, звяздоўцы, нездарма называем шчырымі сябрамі газеты. Яны былі актыўнымі ўдзельнікамі сумеснага праекта рэдакцыі і Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Радок «Звязды» ў гісторыі краіны» — знайшлі новыя цікавыя факты біяграфіі газеты, адшукалі нашчадкаў тых падпольшчыкаў і партызанаў, якія ўдзельнічалі ў выпуску і распаўсюджванні газеты ў цяжкія гады вайны.

Напярэдадні свайго юбілею гімназія зрабіла рэдакцыі каштоўны гістарычны падарунак — перадала першы нумар падпольнай «Звязды», які быў аддрукаваны патрыётамі ва ўмовах акупаванага Мінска ў чэрвені 1942 года.

Краязнаўчы музей гімназіі і галоўная даследча-пошукавая група на чале з настаўнікам-беларусістам Алінай Пахвалёнай. Адзінаццацікласнікі Сцяпан Манкевіч і Лізавета Ермакова сталі пераможцамі горада з навукова-даследчай працай «Радок «Звязды» ў гісторыі краіны». Сцяпан Манкевіч трымае першы нумар «Звязды» ваеннага часу, які гімназія перадала на захаванне калектыву рэдакцыі га-

Футбольная «зорка» гімназіі дзевяцікласніца Марыя ДРОЗД.

Аліна Пахвалёная расказвае:

— Некалькі гадоў назад, незадоўга да смерці, малодшая сястра Рымы Шаршнёвай — Ала Іванаўна Шаршнёва — перадала мне для музея шэраг фатаздымкаў, асобныя нумары газет 50—60-ых гадоў з публікацыямі пра сястру, пра гісторыю падпольнай «Звязды» і ўвогуле пра партызанскі рух на Любаншчыне, іншыя дакументы. Частку матэрыялаў мы адразу ўвялі ў экспазіцыю нашага музея. А напярэдадні юбілею гімназіі я вырашыла яшчэ раз прааналізаваць гэты неацэнны дар Алы Іванаўны. І раптам з адной са старых пасляваенных газет вылятае лісток фармату А4. Гляджу — і не веру сваім вачам: дык гэта ж падпольная «Звязда»!.. Было аднагалосна прынята рашэнне: у гімназічным музеі пакінуць ксеракопію гэтага ўнікальнага выдання, а арыгінал перадаць рэдакцыі «Звязды».

Удзячнасць сённяшніх «звяздоўцаў» — бязмежная. Ніскі паклон вам, сябры!

І вось пра што падумалася. Гэта, напэўна, сімвалічна: вучаніца 25-й даваеннай школы, мужная партызанка Рыма Шаршнёва, якая распаўсюджвала «Звязду» ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — данесла «Звязду» і ў XXI стагоддзе. Дзякуючы патрыятычна-пошукавай рабоце сённяшніх вучняў.

Для вучняў 25-й Радзіма пачынаецца з гімназічнага музея, з вывучэння спрадвечных народных традыцый, з пачуцця гонару за драматычную і разам з тым гераічную гісторыю свайго народа.

Так было, ёсць і будзе: добрая школа вучыць любові да Радзімы — патрыятызму.

Таццяна ПАДАЛЯК.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гістарычнае фота — выпускнікі 1960-х.

Педагагічны савет гімназіі праводзіць дырэктар Таццяна ДЫМКОВА.



Лепшы спецыяліст філалогіі, настаўніца рускай мовы і літаратуры Любоў КУПРЭЕВА і яе сямікласнікі.

З чаго пачынаецца Радзіма...

ГІСТОРЫЯ

90 гадоў назад, у 1918-м, пачала працаваць школа, якой у 1923 годзе быў нададзены № 25, крыху пазней — імя А. Чарвякова. Будынак школы знаходзіўся на месцы цяперашняга Галоўпаштамта. Ён быў зруйнаваны ўжо ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны.

У 1958 годзе быў узведзены новы будынак для 25-й школы — але традыцыі даваеннай ашчадна захоўваліся і працягвалі развівацца.

І якія выдатныя гэтыя традыцыі!..

Вядомы беларускі пісьменнік, выпускнік 25-й школы, Артур Вольскі ўспамінаў, якія непаўторныя ўрокі геаграфіі праводзіў Іван Міхайлавіч Фёдараў — многія школьнікі тады яшчэ не ведалі, што іх настаўнік друкуе аповесці і апавяданні пад псеўданімам Янка Маўр. Настаўнікам фізкультуры быў Вольф Герцавіч Данцыг — сын друкара, які ў жніўні 1917 года не пабаяўся аддрукаваць першы нумар газеты «Звязда», і бацька народнага мастака Беларусі Мая Данцыга. Сярод вучняў выдзяляўся Аляксандр Міронаў — пазней ён стаў вядомым на ўсю краіну як таленавіты, арыгінальны пісьменнік-марыніст. У 25-й даваеннай беларускамоўнай узорнай чыгуначнай школе вучыўся Герой Савецкага Саюза лётчык Міхаіл Зялёнкін, падпольшчыкі Анатоль Ляўкоў, Мікалай Каржанеўскі, героі Вялікай Айчыннай вайны Аркадзь Вадэйка, Леанід Гарачка, Юрый Сіняковіч, Юліус Пучынскі, іншыя. Зараз гімназія носіць імя колішняй сваёй вучаніцы Рымы Шаршнёвай. Гэта адважная дзяўчына-партызанка ў адным з баёў на Любаншчыне прыняла агонь на сябе — цаной уласнага жыцця выратавала камандзіра Жукава і сяброў-партызан... Многае зроблена і робіцца па ўвекавечанні памяці Рымы Шаршнёвай. Штогод гімназісты ездзяць на магілу патрыёткі ў Любань. Устанавілі цесныя адукацыйна-творчыя сувязі з любанскай гімназіяй № 1.

Ветэраны школы, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны — не толькі частыя госці гімназіі, але і сапраўдныя сябры, дарадцы вучняў і настаўнікаў.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 17. Выйгрыш. (5+5).



Заданне № 18, заключнае. Нічыя. Ход чорных. (4+4).

Час на рашэнне — тры тыдні з дня апублікавання задання.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, СВАЕ РАШЭННІ

Змяшчаем рашэнні заданняў конкурсу, апублікаваных 15 снежня 2007 года.

№ 11. Фс1! цугцванг. 1. ... Крa4 2. Се2! Крa5 3. Фс6 b3 4. Фb5х, 2. ... Крb3 3. Сс4 Крa4 4. Фa1х, 2. ... b3 3. Фс5 b2 4. Сd1х.1. ... Крa2 2. Фс2+ Крa3 3. Сd1 b3 4. Ф:b3х, 2. ... Крa1 3. Сg6 b3 4. Фb1х.

№ 12. 1. Крс7 ~~ 2. Кс4+ Кр:d5 3. Кfе3.

ЗАДАЧЫ — 80 ГАДОЎ

У 1928 годзе у газетах «Звязда» быў праведзены міжнародны конкурс складання шахматных кампазіцый. Па раздзелу трохходовак першы прыз атрымала задача таленавітага майстра шахматнай кампазіцыі Леаніда Кубеля (1891—1942). Ён валодаў выключным творчым дыяпазонам, ахопліваючы ўсе жанры шахматнай кампазіцыі. Л. Кубелем складзена 2784 задачы і эцюды. Больш за 560 твораў атрымалі прызы і іншыя адзнакі.

Прыводзім вельмі вядомую ў шахматным асяроддзі трохходоўку.

Л. КУБЕЛЬ, «Звязда», 1928 г. (8+8).



1. Cg4! ~~ 2. Cf5 Л:f5 3. Kfd3x, 2. ... C:f5 3. Лd5х, 1. ... Kh3 2. Cf3 Ле4 3. Kfd3x, 2. ... Ce4 3. Ke6x, 1. ... Лее5 2. Лd5+ Л:d5 3. Ke6x, 1. ... Лge5 2. Ke6+ Л:e6 3. Лd5x, 1. ... Cc2 2. Cd2 і 3. Cb4x, 1. ... Kc2 Ce6 і 3. Ka4x.

У творы выкананы тэмы Новатнага, Грымшоў, Вюрцбург — Плахуты, чорнае перасячэнне, крытычныя і антыкрытычныя хады. Сам Леанід Кубель лічыў гэты твор найлепшым сваім дасягненнем.

Дзённік бландзінкі

«ШЫПШЫНА ДЛЯ ПАНІ»

Чытаю кнігу Людмілы Рублеўскай «Шыпшына для Пані» і дзіўлюся. Як хутка мы забываем некаторыя рэчы!

Яшчэ нядаўна ўсе школьныя падручнікі па літаратуры, здаецца, толькі тым і займаліся, што тлумачылі, чым ёсць паэзія, якое месца ў жыцці адведзена паэту, што застаецца па ім пасля смерці... Пытанні, можа, і далёкія ад паўсядзённага жыцця, але неабходныя для таго, каб разумець прыроду прыгожага.

Вось і Рублеўская ў новай кнізе пытае — што ёсць паэзія, крыж ці крылы? І так нечакана гэта загучала цяпер... Не толькі таму, што сёння да тэмы паэта і паэзіі рэдка звяртаюцца сур'ёзныя аўтары. А яшчэ і з-за таго, што сучасны «фармат» патрабуе, каб паэт выглядаў «шэрагоўцам», рэтранслятарам будзённасці, які кантамінуе аскепкі рэчаіснасці з чужымі цытатамі з хуткасцю аўтамата. Здаецца лірыка, а як гавораць, «нічога асабістага».

Таму Рублеўская — са сваімі «старасвецкімі» пытаннямі — выглядае надзіва актуальнай. Усё новае — добра забытае старое.

СТАРАНАВАГОДНЯЕ

Нечакана для сябе атрымала не толькі віншаванні, але і падарункі на стары новы год. Цяпер я разумею, чаму ў свеце так многа календароў!

Забегла вечарам і суседка. Спытаць — ці халодна мне.

— Халодна, халодна, — адказваю. — Во на тэрмометр паглядзіце...

Тыцкаю ёй пад нос тэрмометр, а там — усе васемнаццаць ...

Яна:

— А ў мяне халадней... — абводзіць вачыма пакой і, як той Архімед, ускліквае:

— ДЫК ГЭТА Ў ВАС АГЕНЬЧЫКІ НА ЁЛЦЫ НАГРЭЛІ!

МІНОРА

Мінора, дзяўчынка чатырнаццаці гадоў...

Я не бачыла яе ў жыцці, але ведаю, як яна выглядае. Белы твар П'еро, абведзеныя чорным вочы, кантрасна-чорныя валасы, якія выглядаюць ненатуральна... Ну і дзе вы бачылі натуральную «готку»? Асабліва смешна тое, што здымак зроблены ў цеснай вітальні хрушчоўскай кватэры. Жоўтыя абабітыя дэрматынам дзверы — дрэнная дэкарацыя для гатычнага спектакля.

Мне многае ў ёй смешна. Напрыклад, сур'ёзнасць і размовы пра смерць. Готы — гэта тыя, хто любіць смерць дэманстратыўна. Таму я не бяру да галавы. Мне ў ёй падабаецца іншае — апавяданні і малюнкі, яе цікавасць да нечаканых прадметаў і заняткаў. Вось вы трымалі ў руках двуручны меч? А яна ім займаецца. Яна шмат чым займаецца і цікавіцца, і ўсё гэта глыбока і таленавіта. І таму аднойчы я думаю пра яе — ну бываюць жа такія дзеці... Ну дае ж некаму Бог такіх дзяцей.

І роўненька пад маю гэтую думку яна кажа, што больш гаварыць не хоча — у яе няма настрою. Перапад эмоцый такі востры, што не маеш права не спытаць, а што ўласна здарылася...

У яе чарговы рэцыдыў. Дакладней, трэці. Рак. І яна больш не хоча лячыцца.

Ну, што тут скажаш? Што ў Бога поўна цудаў? Што медыцына развіваецца сямімільнымі крокамі... Што надзея выратоўвае... І што варта спрабаваць зноў і зноў...

І яна адказа: «А Вы ведаеце, як адчувае сябе чалавек пасля хіміятэрапіі?» І ты спыняеш размову, бо хто ты — каб угаворваць яе ісці на боль?

Яна знікае з майго Інтэрнэт-жыцця, і я нават не ведаю, як яе завуць на самай справе. Мінора.

Я інтуітыўна ведаю, што гэта была не гульня.

ПЕРАВАГІ СТАРЭЙШАГА ЎЗРОСТУ...

У дарослasці ёсць свае перавагі.

Напрыклад, калі ты дарослы, то ведаеш, што можна назаўсёды забыць імя чалавека, з-за якога парэзаны вены на тваіх руках. Не таму забыць, што імкнуўся да гэтага, а таму, што яно само забылася.

Калі ты дарослы, ты ведаеш, што кожнае наступнае каханне мацнейшае за папярэдняе. І што радасць новай сустрэчы роўнапрапарцыйная гору, якое адчуваў.

Калі ты дарослы, ты ведаеш, што шчасце кахаць, а не быць каханым.

Шкада, што гэты досвед — непередавальны.

...а раз непередавальны, то ці варта каментаваць ліст сябра, які плача над страчаным каханнем?

САКРЭТ ДАЎГАЛЕЦЦЯ

Пытаюся ў сяброўкі пра сваю былую суседку:

— Яшчэ жывая? Ёй жа было 94 тры гады таму...

— Усё такая ж!

— Слухай, дык ты б распытала — у чым сакрэт яе даўгалецця.

— Ужо! Яна сказала: «Ведаеце, Наташанька, муж мяне вельмі любіў — ТАМУ Ў НАС ЗАЎСЁДЫ БЫЛА ДОМРАБОТНІЦА».

ІНШЫ ДОСВЕД

Як часта мы мяркуем аб людзях з пазіцыі ўласнага няведання.

З падслуханай тэлефоннай размовы:

— Уяўляеш, у Дзяніскі карыес. Ха-ха-ха.

— Карыес? Ха-ха-ха...

Выглядае дзікунствам, калі не ведаць, што першай смяялася мама хлопчыка, якому ўсяго пару гадкоў ад нараджэння, а яму толькі што зрабілі складанейшую аперацыю, а другой — мама дзяўчынкі, якую праз тыдзень чакае такая ж аперацыя.

Іншым разам, чужы цынізм — гэта проста іншы досвед.

Ганна КІСЛІЦЫНА.

777 ВЫСАКОСНЫ ГОД — ЧАС «СЕЯЦЬ» ДОБРЫЯ ЎЧЫНКІ

Са старажытнасці лічылася, што высакосны год прыносіць з сабой беды і няшчасці. Прычым пік непрыемнасцяў прыпадае на 29 лютага — дзень, які з'яўляецца ў календары раз у чатыры гады. Людзі верылі, што менавіта 29 лютага прыносіць з сабой хваробы, разлады ў сям'і, матэрыяльныя страты. Для таго каб хоць неяк абараніць сябе ад падобных непрыемнасцяў, трэба было прачытаць спецыяльныя малітвы — адну напярэдадні высакоснага года, другую — у апошнюю ноч года.

29 лютага — дзень Касьяна. У спісе святых, якіх ушаноўваюць праваслаўныя вернікі, ён стаіць асобна.

У народзе яго не любілі, бо Касьян хоць і быў святым, аднак славу меў нялітасцівага. Касьян, адзін з паслядоўнікаў Хрыста, адмовіўся дапамагчы аратаму выцягнуць з зямлі колы, як прасіў яго Хрыстос. Гэта зрабіў Мікалай. За што людзі цяпер памінаюць Мікалая двойчы ў год — у маі і снежні. А Касьяна, за тое, што не дапамог, — раз у чатыры гады. Раней у некаторых мясцінах Касьяна ўвогуле лічылі апальным святым. Там бытавала легенда, што спачатку Касьян быў светлым анёлам, аднак потым спакусіўся на абяцанні нячыстага і расказаў таму аб планах Бога скінуць усю сатанінскую сілу з неба ў пекла. Калі Касьян раскаяўся, Бог дараваў яму здраду, аднак дзеля асцярожнасці прыставіў да Касьяна анёла-ахоўніка, якому наказаў прыкаваць святога ланцугамі на тры гады, а на чацвёрты адпускаць на волю. Паводле іншай версіі, святы Касьян тры гады запар сустракаў свае імяніны нецвярозым і толькі на чацвёрты год адумаўся.

Сяляне не любілі і баяліся гэтага святога: «Ідзе Касьян касой касіць», «На што Касьян ні гляне — усё вяне». Між іншым, не толькі славяне верылі, што высакосны год — гэта невычэрпная крыніца непрыемнасцяў. Англічане перакананы, што ў такі год усё ідзе шыварат-навыварат, а ў Шатландыі толькі ў высакосны год не мужчыны сватаюцца да жанчын, а наадварот.

Само паняцце «высакосны год» з'явілася яшчэ ў часы Рымскай імперыі. Атрымалася яно ад скажэння лацінскага спалучэння bis sextilis — двойчы шосты. Так першапачаткова быў названы 46-ы год да Ражджаства Хрыстова, калі Юлій Цэзар загадаў дадаць пасля 6 сакавіка яшчэ адзін дзень — другое шостае чысло. Назва так і замацавалася, хоць у юліянскім календары лішні дзень дадаецца раз у чатыры гады пасля 28 лютага.

У адпаведнасці з гэтым календаром працягласць года складала 365,25 дня. Звычайны год «абмяжоўваўся» 365 суткамі, а «лішкі» накопліваліся і суміраваліся ў дадатковы дзень (29 лютага), які дадаваўся ў каляндар раз у 4 гады. Такія гады і атрымалі назву высакосных. Як паказала практыка, юліянскі каляндар аказаўся недаканалым: «рымскі» год быў «даўжэйшым» за астранамічны на 11,2 хвіліны. Кожныя 128 гадоў ён «забягаў» наперад на адзін дзень. За паўтара тысячагоддзя розніца склала 10 дзён і стала відавочнай не толькі для астраномаў. У сярэдзіне 16 стагоддзя хрысціянскія вучоныя паводле даручэння Папы Паўла III пачалі рыхтаваць рэформу календара. Найбольш удалы варыянт прапанаваў фізік і астраном Луіджы Ліліо. Яго сістэма «прарэджвання» высакосных гадоў была адобрана Папам Рыгорам XIII 26 лютага 1582 года, новы каляндар атрымаў назву грыгарыянскага.

Як бачым, паняцце «высакосны год» з'яўляецца чыста каляндарным.

Царква лічыць веру ў неспрыяльнасць і небяспечнасць года — забабонамі. Паводле выказвання **іераманаха Іова (Гумерава)**, любыя каты, якія перабягаюць дарогу, для мяне не катастрофа. Што датычыцца высакоснага года, я да яго стаўлюся вельмі спакойна. Раней увогуле не задумвалася аб гэтым. Ведаю, што некаторыя нават пераносяць значныя падзеі, у прыватнасці, вяселле. Мы з сяброўкамі гэта неяк абмяркоўвалі. Атрымалася, што гэты год неспрыяльны, наступны — таксама і з выхадам замуж лепш пачакаць да 2010 года. Я тады прапанавала: а мо, увогуле не будзем замуж выходзіць, у прынцыпе? Я ў гэтым плане чалавек не прымхлівы, асабліваго значэння высакоснаму году не надаю. Яго прыдумалі людзі, раней я ўвогуле не чула, каб яго лічылі няўдалым. Проста ў новым годзе на адзін дзень стала больш і трэба паспець зрабіць яшчэ нешта добрае.

Што датычыцца спартыўных дасягненняў, тут я таксама не надта прымхлівая. Мая кар'ера доўжыцца не адзін год і я ўжо ведаю — якія месяцы года часцей за ўсё прыносяць няўдалыя выступленні, а якія, наадварот, будуць ударнымі. Гэта нават не прыметы, а мае біярытмы. Пагадзіцеся, гэта куды больш абгрунтавана, чым вера ў забабоны, хоць бы з фізіялагічнага пункту гледжання. Безумоўна, спартыўныя спаборніцтвы пад біярытмы асобнага чалавека ніхто не падстройвае. Увогуле, я лічу, што ў спорце нельга заганяцца забабонамі.

Сяргей БАГЛАСАЎ, галоўны архітэктар архітэктурнай майстэрні ТАА «Трайпл», (галоўны архітэктар гасцініцы «Еўропа» і сталічнай ратушы):

— Я нават не ведаў, што гэты год — высакосны. Па жыцці я не прымхлівы чалавек. Чорнаму кату, што перабягае дарогу, я кажу: «ты сам па сабе, а я сам па сабе і ніякіх адносінаў да цябе я не маю». Мяняць сваіх планаў ні ў якім разе я не збіраюся. Сёлета мы займаемся пашырэннем гарналыжнага комплексу ў Лагойску, будзем развіваць гэтую тэму з выхадам на трасу Мінск—Віцебск: плануем размясціць там карчму ў народным стылі, этнаграфічную экспазіцыю. У самім Лагойску будзем займацца рэстаўрацыяй унікальнага палацава-паркавага комплексу Тышкевічаў. Прадоўжым работы і ў Мінску.

А ВЫ ЯК СТАВІЦЕСЯ ДА ВЫСАКОСНАГА ГОДА?

Дзяніс ДУДЗІНСКІ, саліст праекта DaVinchi:

— Увогуле ніяк. Нават на секунду не задумваўся аб тым, каб неяк мяняць свае жыццёвыя і творчыя планы з-за таго, што 2008-ы — год высакосны. Высакосны год — ну і добра, ОК. Многія зоркі і артысты вызначаюцца прымхлівасцю і верай у забабоны, аднак, па-першае, я — не зорка, па-другое, не артыст. Мы не па праўдзе такія, клоуны, гульня ў нас такая — у артыстаў, у зорак. Раніцай устаю, пыласошу, іду ў магазін набыць нешта на сняданак, прыбіраю «сюрпрызы» за катом. На ўсё гэта высакосны год абсалютна ніяк не ўплывае. Што тычыцца лёсавызначальных падзей, накшталт шлюбу, я не стаў бы пераносіць вяселле на іншы год. Разумееце, калі б да мяне прыйшоў нейкі разумны чалавек у каўпаку астролага і сказаў: «Дзяніс, увага, паглядзі на дошку!», намаляваў бы мне формулы, графікі, даў падрабязныя тлумачэнні, чаму высакосны год трэба лічыць небяспечным, тады б я, магчыма, яго зразумеў. А так проста верыць, што высакосны год гэта дрэнна, што чорны кот, які перабягае дарогу, прынясе няўдачу, а пустое вядро з-пад смецця ў руках сустрэтага на дарозе чалавека абяцае грашовыя страты — я не хачу. Інакш сябе можна ў такія шоры загнаць. Атрымліваецца, што паводле гэтай логікі цяпер трэба цэлы год з жыцця выкрэсліваць? У мяне на яго столькі планаў: працаваць, здымаць кліпы, выпускаць альбомы, падарожнічаць па розных краінах, даваць канцэрты, кантактаваць з рознымі людзьмі. Мы збіраемся стварыць новы музычны праект. На гэты раз рускамоўны. Я і ў гараскопы не веру. На самай справе, для нявер'я, як і для веры, патрэбны пэўныя аргументы, а ў мяне іх няма ў абодвух выпадках.

Ганна ШАРЭВІЧ, міжнародны гросмайстар, чэмпіёнка Беларусі па шахматах:

— Я не вельмі прымхлівы чалавек і ўвогуле намагаюся не заганяцца рознымі прыкметамі. Адзінае, калі выйшла з дому, нешта забылася і даводзіцца вяртацца, — зірну ў люстэрка. На ўсякі выпадак. Чорныя катыі, якія перабягаюць дарогу, для мяне не катастрофа. Што датычыцца высакоснага года, я да яго стаўлюся вельмі спакойна. Раней увогуле не задумвалася аб гэтым. Ведаю, што некаторыя нават пераносяць значныя падзеі, у прыватнасці, вяселле. Мы з сяброўкамі гэта неяк абмяркоўвалі. Атрымалася, што гэты год неспрыяльны, наступны — таксама і з выхадам замуж лепш пачакаць да 2010 года. Я тады прапанавала: а мо, увогуле не будзем замуж выходзіць, у прынцыпе? Я ў гэтым плане чалавек не прымхлівы, асабліваго значэння высакоснаму году не надаю. Яго прыдумалі людзі, раней я ўвогуле не чула, каб яго лічылі няўдалым. Проста ў новым годзе на адзін дзень стала больш і трэба паспець зрабіць яшчэ нешта добрае.

Што датычыцца спартыўных дасягненняў, тут я таксама не надта прымхлівая. Мая кар'ера доўжыцца не адзін год і я ўжо ведаю — якія месяцы года часцей за ўсё прыносяць няўдалыя выступленні, а якія, наадварот, будуць ударнымі. Гэта нават не прыметы, а мае біярытмы. Пагадзіцеся, гэта куды больш абгрунтавана, чым вера ў забабоны, хоць бы з фізіялагічнага пункту гледжання. Безумоўна, спартыўныя спаборніцтвы пад біярытмы асобнага чалавека ніхто не падстройвае. Увогуле, я лічу, што ў спорце нельга заганяцца забабонамі.

Сяргей БАГЛАСАЎ, галоўны архітэктар архітэктурнай майстэрні ТАА «Трайпл», (галоўны архітэктар гасцініцы «Еўропа» і сталічнай ратушы):

— Я нават не ведаў, што гэты год — высакосны. Па жыцці я не прымхлівы чалавек. Чорнаму кату, што перабягае дарогу, я кажу: «ты сам па сабе, а я сам па сабе і ніякіх адносінаў да цябе я не маю». Мяняць сваіх планаў ні ў якім разе я не збіраюся. Сёлета мы займаемся пашырэннем гарналыжнага комплексу ў Лагойску, будзем развіваць гэтую тэму з выхадам на трасу Мінск—Віцебск: плануем размясціць там карчму ў народным стылі, этнаграфічную экспазіцыю. У самім Лагойску будзем займацца рэстаўрацыяй унікальнага палацава-паркавага комплексу Тышкевічаў. Прадоўжым работы і ў Мінску.

Паритетбанк

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ПАРИТЕТБАНК»!

21 февраля 2008 г. проводится внеочередное Общее собрание акционеров банка в заочной форме методом опроса с повесткой дня:

***1.** Об избрании Счетной комиссии.*

***2.** Об утверждении Положения о порядке учета аффилированных лиц ОАО «Паритетбанк» и согласовании сделок, в совершении которых имеется заинтересованность аффилированных лиц.*

***3.** Об утверждении Положения о порядке использования прибыли ОАО «Паритетбанк».*

Собрание проводится по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/4, комн. 306.

Бюллетени для заочного голосования и другие материалы к собранию участники собрания могут получить по указанному адресу 14—15 февраля 2008 г. с 9.00 до 17.00. ***Тел. (017) 288 49 43.***

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 18 февраля 2008 г. по месту их выдачи.

Дата подсчета голосов – 20 февраля 2008 г.

ОАО «Паритетбанк». Лиц. НБ РБ № 5 от 27.10.2006 г. УНП 100233809

Эх, леснікі, леснікі...

Калі браканьераць у нацыянальным парку тыя, хто павінен ахоўваць звяроў і лес, то можна ўявіць, што робіцца ў гэтым плане на астатняй тэрыторыі лясной гаспадаркі.

У Ясеньскім лясніцтве дзік трапіў у яму, якую для яго выкапалі двое мясцовых леснікоў. Звера яны забілі сякерай.

А ляснік Ружанскага лясніцтва з двума напарнікамі незаконна застрэліў дзікую казу.

У першым выпадку за дзіка давядзецца заплаціць больш за 6 млн рублёў. У такую суму ацэнены ўрон прыродзе, леснікоў чакае і вялікі штраф.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

1 лютага тыдня дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

Дзяжурыць галоўны ўрач мінскай амбулаторыі № 2 Леанід Анатольевіч БАГДАНАЎ.

Предложение о покупке акций ОАО «Брандко»

УСЛОВИЯ ПРЕДЛОЖЕНИЯ:

Покупатель — Открытое акционерное общество «Брандко», РБ, г. Минск, ул. Центральная, 46.
Эмитент акций — ОАО «Брандко» в ЕГР № 800002642.
Количество акций к приобретению — 110 штук.
Цена приобретения — 1 371 364 белорусских рубля за одну акцию (цена приобретения является обязательной для всех предложенных к приобретению акций).

УНП 800002642

Хозяйственный суд города Минска объявляет о проведении повторных публичных торгов по продаже имущества РУП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ»:

Лот № 1 — имущество детского оздоровительного лагеря «Бригантина», находящееся по адресу: Минская область, Молодечненский район, п/о Петровщина, д. Гердутишки, детсад-ясли корпус № 1, детсад-ясли на 140 мест корпус № 2, административно-приемный корпус (медсанчасть), бытовое здание для обслуживающего персонала, спальный корпус № 3 на 80 мест, спальный корпус № 4 на 80 мест, физкультурно-оздоровительный комплекс, котельная с навесом, канализационная насосная станция, трансформаторная подстанция, столовая на 360 мест, склад, водонапорная башня 25 куб. м, здание над артезианской скважиной, артскважина, автодорога к ДОЛ, противопожарный резервуар (пирс), ограждение с воротами, павильон для игр, библиотека, уборная 1, уборная 2, навес (возле котельной), станция перекачки, дымовая труба котельной, наружное освещение, в/в кабельная линия, внешние кабельные сети, поля фильтрации, наружные сети (тепловые), наружные сети (водопроводные), наружные сети (канализационные), таль электрическая МЗ-320, теплообменник пластинчатый разборный Р-025, котельная котла «Минск-1», котельная котла «Минск-1», лифт грузовой малый ЛГ-100, лифт грузовой малый г/п 100 кг. 1971—1985 гг. постройки окончательной стоимостью с учетом НДС 1 768 156 283 (один миллиард семьсот шестьдесят восемь миллионов сто пятьдесят шесть тысяч двести восемьдесят три) белорусских рубля. Минимальный шаг аукциона — 5 процентов от стоимости имущества.

Торги состоятся 22.02.2008 года в 11.00 по адресу: Минская область, Молодечненский район, п/о Петровщина, д. Гердутишки, ДОЛ «Бригантина».

За дополнительной информацией обращаться к судебному исполнителю Якименко Е.В. по телефону 294 93 57 (факс 294 93 86).

УНП 101541763

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); а

ДОРСТРОЙИНДУСТРИЯ

Без працы гэтых людзей Беларусь не была б Беларуссю — краінай, якая ганарыцца сваімі дарогамі і мастамі

ПРАДМЕТ ГОНАРУ І АПОРА ГЕНЕРАЛЬНАГА

— Уладзімір Іванавіч, з якога года вы займаеце пост генеральнага дырэктара Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Дарбудіндустрыя»?

— З сакавіка 2005-га.

— Вы прынялі гаспадарку, вядомую ў рэспубліцы сваёй стабільнасцю і высокай якасцю прадукцыі. Задача была не толькі захаваць пазіцыі, але і зрабіць крок наперад. Наколькі гэта ўдалося?

— Лічу, што ўдалося. За апошнія гады паказчыкі работы палепшыліся. Летась наш чысты прыбытак склаў 1,6 млрд беларускіх рублёў. Тэмпы росту аб'ёму вытворчасці ўзраслі на 24 працэнты. Мы забяспечылі станоўчую дынаміку практычна па ўсіх паказчыках сацыяльна-эканамічнага прагнозу.

— Чым сёння жыве прадпрыемства?

— Планамі, якія стаяць перад намі на 2008 год. Спрабуем рэалізаваць усё, што нам даручана, і што самі для сябе вырашылі.

— Гэта рэальныя задачы?

— Рэальныя. Хоць новыя задачы патрабуюць ад нас выхаду на новы ўзровень работы, каб выканаць іх, неабходна працягваць мадэрнізацыю прадпрыемства, якаснае пераўзбраенне. Гэта няпроста, але каб жыць у сучасным свеце, неабходна ўмець жыць у напружанні.

— Як размяркоўваеце прыбытак?

— На развіццё вытворчасці, на забеспячэнне сацыяльнага пакета і на паляпшэнне ўмоў працы. Мы абнаўляем актыўную частку асноўных фондаў: машыны, механізмы, абсталяванне. Праўда, забяспечыць пажаданы ўзровень тут пакуль не ўдаецца. Такая сітуацыя не толькі ў нас. Асноўныя фонды ў цэлым па Беларусі фізічна зношаны больш чым на 70 працэнтаў. І мы тут не выключэнне.

Хоць паступова сітуацыю ўдаецца паляпшаць. Напрыклад, мы летась уклалі ў абнаўленне асноўных сродкаў 2 млрд рублёў уласных грошай. Правялі дастаткова маштабную рэканструкцыю кар'ера «Чаркасы», увялі ў эксплуатацыю новую тэхналагічную лінію па перапрацоўцы пясчана-гравійнай сумесі. Мадэрнізавалі вытворчасць на Гравійна-сартавальным заводзе «Баруны» ў Ашмянскім раёне. За кошт сродкаў Рэспубліканскага дарожнага фонду набылі на Доследна-механічным заводзе ўстаноўку плазменнай рэзкі металу з праграмным кіраваннем.

— Наколькі вялікая сёння запатрабаванасць у матэрыялах для будаўніцтва дарог?

— Мы забяспечаны работай дзякуючы праграме «Дарогі Беларусі» на 2005—2014 гады. У выніку гэтай Праграмы будзе ўдасканалена ўся дарожная сетка краіны. Іншая справа, што фінансаванне, на жаль, недастатковае.

— Уладзімір Іванавіч, назавіце галоўны на сёння прадмет гонару кіраўніка «Дарбудіндустрыі»?

— Тут у адзін пункт не ўкладзешся. На трох філіялах мы сертыфікавалі сістэмы менеджменту якасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі міжнародных стандартаў ISO 9000. На двух філіялах укаранілі сістэму кіравання навакольным асяроддзем ISO 14000. Усе нашы пяць філіялаў сертыфікаваныя па сістэме кіравання аховай працы СТБ 18001-2005. Завод жалезабетонных маставых канструкцый атрымаў прэмію Урада Рэспублікі Беларусь «За дасягненні ў галіне якасці». Усё гэта вынікі вялікай работы.

— На складах прадукцыя не залежваецца?

— У 2007 годзе не залежвалася. Спадзяёмся, што і ў 2008-ым будзе тое самае.

— З якімі краінамі супрацоўнічаеце?

— У асноўным з бліжэйшымі да нас рэгіёнамі Расіі. Пастаўляем туды жалезабетон.

— Ці значыць гэта, што галоўная фішка «Дарбудіндустрыі» — жалезабетонныя маставыя канструкцыі?

— Так можна сказаць у дачыненні да знешняга рынку. Астатняя наша прадукцыя запатрабаваная ў Беларусі, і сёння проста няма яе лішкаў для таго, каб прапанаваць за межамі краіны.

— Раскажыце пра сацыяльны пакет, які прапаноўвае сваім работнікам «Дарбудіндустрыя».

— Мы забяспечваем усіх дзяцей сваіх работнікаў пуцёўкамі ў аздараўленчыя лагеры. Кампенсуем кошт пуцёвак у дамы адпачынку і санаторыі самім работнікам... У нас дастаткова высокія заробкі. Самыя высокія — на Доследна-механічным заводзе, на другім месцы — Завод жалезабетонных маставых канструкцый. Там сярэдняя заработная плата — больш за мільён беларускіх рублёў. Сярэдняя па прадпрыемстве — 974 тысячы.

— Не сумняваюся, што да вас імкнуцца патрапіць як выпускнікі ВНУ, так і рабочыя.

— У Фаніпаль да нас з задавальненнем прыязджаюць уладкоўвацца маладыя спецыялісты з Мінска і Дзяржынска. А там, дзе нашы кар'еры знаходзяцца ў сельскай мясцовасці, у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, існуюць нават чэргі на працоўныя спецыяльнасці. Разам з тым па асобных катэгорыях у нас дэфіцыт кадраў. Нам вельмі патрэбны экскаватаршчыкі, бульдазерысты, токары, фрэзероўшчыкі, зваршчыкі. Напэўна, гэта звязана з сістэмай прафесійнай падрыхтоўкі, якая на нейкім этапе не прадугледзела патрабаванні рынку працы. Старая гвардыя сыходзіць, а сярод моладзі спецыялістаў недастаткова. Мы вымушаны знаходзіць людзей, якія валодаюць блізкімі прафесіямі, і перавучваць.

Увогуле «Дарбудіндустрыі» шанцуе на людзей. Тут працуюць сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы, цудоўныя спецыялісты і акрамя ўсяго — цікавыя і адказныя людзі, усе: ад станочнікаў, вадзіцеляў, рэзчыкаў металу, аператараў драбільна-сартавальных машын да канструктараў, праграмістаў, галоўных інжынераў і эканамістаў. Дзякуючы ім прадпрыемства паспяхова пераадолела нестабільныя часы, яно ўдала ўпісваецца ў новыя эканамічныя ўмовы, вырашае задачы, пастаўленыя дзяржавай і не пасуе перад цяжкасцямі.

Чаму ў Фаніпаль імкнуцца спецыялісты і працоўны люд

Справа не толькі ў тым, што гарадок утульны і мясціны прыгожыя. І не ў тым, што да Мінска — 20 кіламетраў, і прыкладна столькі ж да Дзяржынска. Галоўная прычына ў тым, што ў Фаніпалі ёсць прадпрыемства, дзе людзі добра зарабляюць, іх праца запатрабаваная, яны маюць магчымасць пабудаваць за свае сродкі жыллё і, увогуле, жыць годна. А дзецям сваім сказаць: «Бачыш гэты мост? І гэту дарогу? І гэту машыну, якая пасыпае дарогу пяском? Усё гэта зроблена на нашых заводах: апоры і пліты, гравій і шчэбень. І машына, якая з дапамогай камп'ютара вельмі дакладна размяркоўвае на дарозе пясок з соллю, каб не было слізка, і людзі маглі бяспечна і хутка даехаць адзін да аднаго. Яна таксама зробленая ў нас».

Яны не будуюць. Яны вырабляюць неабходныя для будаўніцтва і рамонту дарог матэрыялы і машыны. Без іх працы Беларусь не была б Беларуссю — краінай, якая ганарыцца якасцю сваіх трас і надзейнасцю сваіх мастоў. Гэта вельмі адказная і вельмі пачэсная работа. І як высветлілася, вельмі няпростая.





«ПАТЭНЦЫЯЛЬНЫ ТУРЫСТЫЧНЫ АБ'ЕКТ. АПРОЧ ІНШАГА», —

такая думка натуральна ўзнікае пасля наведвання Доследна-механічнага завода РУП «Дарбудіндустрыя». І мы вырашылі падзяліцца ёю з намеснікам дырэктара завода Віктарам СТАНІШЭЎСКІМ.

— Віктар Францавіч, ваша прадпрыемства лічыцца адным з самых цікавых у аб'яднанні. Доследна-механічны завод, напэўна, мог бы зарабляць яшчэ і на экскурсіях...

— Пакуль што мы гатовыя праводзіць іх бясплатна. Я думаю і дзецям, і дарослым будзе цікава паназіраць, як са скручаных у рулон лістоў металу мы вырабляем бар'ерныя агароджы для дарог, як зварваем вялізныя трохслойныя тэрмасы — бітумавозы, як з дапамогай вады правяраем зварачныя швы на трываласць. У нас шмат дзіваў. Адно з апошніх — газа-плазменная рэзка металу, даволі тоўстага, самай рознай канфігурацыі. Кіруецца гэта машына з дапамогай камп'ютара, як і лазерная ўстаноўка, якая працуе ў нас ужо некалькі гадоў.

У хуткасці можна будзе ўбачыць яшчэ адзін рэалізаваны інвестыцыйны праект — мадэрнізаванае малярнае аддзяленне. Новая фарбавальна-сушыльная камера з праграмным кіраваннем будзе фарбаваць нашы вырабы ў электрастатычным полі. Атрымаецца не горш, чым на аўтамабільным заводзе.

— Яшчэ адна асаблівасць завода — пастаянная распрацоўка новай тэхнікі.

— Сапраўды, толькі для шасі трактара «Беларус» Ш-406 з дзвюма кабінамі мы распрацавалі больш за 20 відаў навяснога абсталявання для ўтрымання дарог у зімовы і летні час. Сёння мы прапануем больш таннае абсталяванне на базе МТЗ-82П. Спажывец ацаніў наш ротарны снегаачышчальнік, які ўбірае цяжкі, зляжалы снег і адкідвае яго на вялікую адлегласць. Нашы аўтагудранатары АРБ 7 і АРБ 8 здольныя падтрымліваць працоўную тэмпературу бітуму, а гэта 200 градусаў вышэй за нуль, і раўнамерна размяркоўваць яго па дарожным палатне...

Пошукі тэхнічнага аддзела і зладжаная работа ў цэхах і ўсіх структурах завода прыносяць добрыя вынікі. У 2007 годзе мы заваявалі першае месца ў Дзяржынскім раёне па паказчыках працы, атрымалі пераходны кубак, Ганаровую грамату і грашовую прэмію. Заробкі нашых людзей ўзраслі на 22 працэнты, вытворчасць працы — на 41 працэнт — удвая за два гады. У гэтым, безумоўна, ёсць заслуга і кіраўніцтва «Дарбудіндустрыі», і дэпартамента «Белаўтадар» — асноўнага нашага заказчыка. Сёння наша задача — не згубіць сваю нішу на рынку ў Беларусі, заваяванне якой было даволі цяжкім. Безумоўна, трэба вяртацца і на расійскі рынак, які мы былі вымушаны пакінуць з-за дэфолту 1998 года. Мэта, да якой мы імкнёмся — канкурэнтаздольная прадукцыя еўрапейскага ўзроўню.

1. **Адзін з відаў прадукцыі Доследна-механічнага завода — сушыльны барабан асфальтабетонных заводаў.**
2. **Слесар па абслугоўванні ўстаноўкі плазменнай рэзкі металу Міхаіл БІРАТКА (злева) і галоўны механік Валянцін АПАЗНАНСКІ.**
3. **Выраб элементаў металічнай бар'ернай агароджы на металапракатным станку.**
4. **Брыгадзір зваршчыкаў Іван ЗДРОК і зваршчык Сяргей КАНЮШЫК.**

Намеснік дырэктара па вытворчасці Доследна-механічнага завода Сяргей КУЗНЯЦОЎ дэманструе гатовую прадукцыю.

Шчэбеневы завод філіяла «Нярудбудматэрыялы»:

1. **Тэхналагічная лінія па перапрацоўцы шчэбеню.**
2. **Начальнік завода Андрэй КУСЦІКАЎ.**
3. **Старшы майстар Віктар БАГАМАЗАЎ.**
4. **Машыніст пагрузчыка L-34 Уладзімір САРАЧЫНСКІ.**

Начальнік мехкар'ера «Чаркасы» Сяргей ДЗІМІТРУК (злева) і начальнік аддзела механізацыі, энергетыкі і аховы працы РУП «Дарбудіндустрыя» Уладзімір ГОРБАЧ.

НАВОШТА ПАТРЭБНЫЯ ISO

Філіял-завод жалезабетонных маставых канструкцый атрымаў па выніках мінулага года прэмію ўрада за дасягненні ў галіне якасці.

— Наша прадпрыемства адно з першых у Беларусі пачало ўкараняць сістэмы ISO 9000, ISO 14000, ISO 18000, — **паведаміў «Звяздзе» дырэктар Завода жалезабетонных маставых канструкцый Пётр МІЦКЕВІЧ.** — Дарэчы, па апошняй сістэме мы былі трэцімі ў краіне, першымі ў вобласці і першымі ў міністэрстве. Гэта вызначыла ўсю нашу работу. Кожны, хто сёння працуе на заводзе, не проста зарабляе грошы сабе на хлеб, ён добра разумее ўсе патрабаванні якасці, экалогіі, культуры вытворчасці, аховы працы, тэхнікі бяспекі і ўвогуле адчувае сябе ў кантэксце краіны ў цэлым. У выніку наша прадукцыя стала вельмі прыкметнай як у Беларусі, так і за яе межамі. Гэта і падштурхнула нас прапанаваць прадпрыемства на суісканне прэміі Урада «За дасягненні ў галіне якасці». Наша работа атрымала самую высокую ацэнку.

— Значыць, справа не толькі ў трываласці жалезабетону?

— Пры прысуджэнні гэтай прэміі ўлічваецца ўсё: і сацыяльна-культурны побыт, і кампетэнтнасць работнікаў, і ўмовы працы, і ўзровень калектыўнага дагавора, і аховa навакольнага асяроддзя. Я нездарма сказаў пра сістэмы ISO. Дарэчы, калі члены працоўнай камісіі ўбачылі наш калектыўны дагавор, то сказалі, што такога яны яшчэ не сустракалі: шмат сацыяльных даброт і ўсе выконваюцца.

— Напрыклад?

— Кожны член калектыву, калі ідзе ў водпуск, атрымлівае аклад. Жанчыны, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, штомесяц атрымліваюць адзін аплатны свабодны ад працы дзень. Раз у квартал — 13-я зарплата. Праязныя білеты для іншагародніх. І шмат чаго яшчэ... Безумоўна, мы маем магчымасць усё гэта рабіць дзякуючы прыбытку.

Мінулы год быў для нас даволі ўдалым. Разам з тым і няпростым. Першага студзеня 2007-га нам перадалі дрэваапрацоўчы завод у вёсцы Латва Шклоўскага раёна. Галоўная праблема гэтага прадпрыемства — адсутнасць фондаў на круглы лес. Даводзіцца купляць лес на фабрыцы газетнай паперы ў выглядзе абразной дошкі і перапрацоўваць гэту дошку для падлогі. Мы вымушаны былі ўдвая скараціць колькасць працоўных месцаў. За тое вытворчасць працы павялічылі ўтрая. Узраслі ў Латве і заробкі, у сярэднім — да 600 тысяч — таксама больш чым утрая. Зусім іншым стала стаўленне людзей да працы.

У канцы 2007 года ў нас узніклі праблемы з заказамі па дэпартаменце «Белаўтадар». І мы вымушаны былі прапанаваць сваю прадукцыю расійскім рэгіёнам. Сёння мы ўжо цесна працуем з Расіяй, у студзені некалькі заказаў прынялі і на некалькі заключаем дагаворы. Размова ідзе пра Калінінград, Разанскую, Смаленскую вобласці. Вось учора, пакуль на словах, быў агучаны буйны заказ Екацярынбургскай вобласці: на 47 чыгуначных балак. Гэта вельмі дарагія канструкцыі. Мы працавалі з Белгарадам, Бранскам, Калугай, Псковам, Санкт-Пецярбургам, Маскоўскай і Ленінградскай абласцямі.

— Але ж гэта не значыць, што ў Расіі няма падобных прадпрыемстваў?

— Безумоўна. Нашай прадукцыі аддавалі перавагу з-за высокай якасці і выгаднай цаны. Цяпер, калі энерганосьбіты даражэюць, нам трымаць канкурэнтаздольную цану на жалезабетонныя канструкцыя будзе цяжэй. Не проста будзе выканаць і задачы па павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці з захаваннем якасці прадукцыі. Для гэта неабходна павялічваць вытворчыя плошчы, але без дапамогі дзяржавы, нам такое пакуль не пад сілу.

ТРЫ КІТЫ

— У свой час «Дарбудіндустрыя» з'яўлялася градаўтваральным прадпрыемствам, — расказвае галоўны інжынер РУП «Дарбудіндустрыя» Анатоль САЎЧАНКА. — Заводы жалезабетонных маставых канструкцый і Доследна-механічны (да іх два гады таму далучыўся яшчэ філіял «Нярудбудматэрыялы») не толькі забяспечваюць жыхароў Фаніпаля працоўнымі месцамі. Прадпрыемства пабудавала ўсю інфраструктуру горада: дарогі, кацельню, водазабор, ачышчальныя збудаванні, каналізацыю, жыллё, дзіцячы садок, удзельнічае ва ўзвядзенні царквы... Па сутнасці, гэта аб'яднанне: і па колькасці працаўнікоў, і па аб'ёме вытворчасці, і па значнасці.

— Завод жалезабетонных маставых канструкцый — адзінае прадпрыемства ў Беларусі, якое вырабляе неабходныя для будаўніцтва сучасных мастоў і пуцеправодаў бэлькі, пліты, палі і іншыя канструкцыі, у тым ліку ўнікальныя, як, напрыклад, цэльнаперавозімыя бэлькі даўжынёй 33 метры.

Доследна-механічны завод за час свайго існавання асвоіў каля 120 відаў новых машын, механізмаў і сродкаў механізацыі.

Сёння ў рэспубліцы востра запатрабаваны шчэбень дробных фракцый, які вырабляе філіял «Нярудбудматэрыялы». Мы атрымліваем у якасці сыравіны фракцыю 40—70 мм альбо 25—60 мм з Вытворчага аб'яднання «Граніт» у Мікашэвічах і перарабляем яе на шэраг дробных: 5—10, 10—15 і 15—20 мм.

На механічным кар'еры «Чаркасы» і іншых мы здабываем пясчана-гравійныя сумесі, абагачаем іх, у тым ліку вылучаем шчэбень, гравій і пясок першага класа — так званы «мыты». Толькі з такога пяску, прамытага ад гліны і глею, вырабляюцца жалезабетонныя канструкцыі для будаўніцтва мастоў. Мыты пясок надае неабходную трываласць, марозаўстойлівасць і воданепранікальнасць.

Штогод калектыў «Дарбудіндустрыі» ўдзельнічае ў праграмах Навукова-даследчых доследных канструктарскіх работ. Летась на заводзе жалезабетонных маставых канструкцый было асвоена тры віды стойкі мастоў рознага сячэння, а на Доследна-механічным — навясное абсталяванне для шасі Ш-406.

Усяго за 5 апошніх гадоў мы асвоілі 16 відаў навяснога абсталявання, якое дазваляе ў значнай ступені механізаваць і аўтаматызаваць работу па ўтрыманні аўтамабільных дарог.

— Дарэчы, калі дарожныя службы прыйдуць да адмовы ад выкарыстання салявых сумесяў у барацьбе з галалёдам, вы будзеце гатовыя прапанаваць ім адпаведныя машыны?

— Нашы пескаразмеркавальнікі могуць працаваць з пяском, соллю, з сумессю першага і другога. Яны раскідаюць на дарожнае палатно і іншы матэрыял, падобны на пясок і соль на сыпучасці. У Скандынаўскіх краінах прымяняюць дробны шчэбень, потым спрабуюць яго сабраць, прамыць і выкарыстаць паўторна. На некаторых участках і мы маглі б, напэўна, так рабіць. Ва ўсякім разе магу запэўніць, што калі наша навука зробіць крок наперад і прыдумае менш шкодны, чым салявая сумесь, сродак, наш тэхнічны аддзел і нашы машыны справяцца з новай задачай. Мы ў гэтай добрай справе не станем перашкодай.

— Падобныя машыны яшчэ недзе вырабляюцца ў Беларусі?

— Доследна-механічны завод у Фаніпалі — асноўны вытворца такіх машын, хоць мы не з'яўляемся манапалістамі. Нашы машыны адрозніваюцца больш высокім класам. Мы выкарыстоўваем імпартныя камплектуючыя, якія дазваляюць больш дакладна размяркоўваць сумесь. Каб не было лішку той жа солі.

— Наколькі я зразумела, «Дарбудіндустрыя» трымаецца на трох кітах: вытворчасці жалезабетонных маставых канструкцый, машын і механізмаў для ўтрымання дарог і будаўнічых матэрыялаў: шчэбень, пясок і гравій.

— Так. Усё гэта сёння мае вялікі попыт. Ажыццяўленне Праграмы адраджэння вёскі запатрабавала нярудныя будаўнічыя матэрыялы. У нас ёсць заказчыкі з Брэсцкай, Гродзенскай, Віцебскай абласцей. Мы маем свой кар'ер ва Украіне. Завод жалезабетонных маставых канструкцый увогуле манапаліст у Беларусі.

— Але ж калі-небудзь усе масты будуць пабудаваныя...

— На жаль, так. І гэты час не за гарамі. Але каля 30 працэнтаў існуючых сёння мастоў ужо не адпавядаюць патрабаванням па габарытах і нагрузках. Іх трэба рэканструяваць, мадэрнізаваць, а, магчыма, недзе і будаваць новыя. Таму, я лічу, наша прадукцыя будзе запатрабавана заўсёды, у той ці іншай ступені. У Еўропе больш папулярныя становяцца масты маналітнай канструкцыі. Ім можна надаць больш выразную архітэктуру. Мы гатовы і да такога павароту ў будаўніцтве мастоў. Наш завод прапануе высакакласны бетон і арматуру.

— Колькі працуе людзей на прадпрыемстве?

— На ўсіх філіялах сёння працуюць 973 чалавекі. Апошнім часам да нас прыйшло шмат моладзі. І што б сёння ні казалі пра маладое пакаленне, мы бачым: яно ўмее і працаваць, і нараджаць новыя ідэі.

РУП «Дарбудіндустрыя» ў лічбах:

- Штогод прадпрыемству ўдаецца павялічваць тэмпы росту гандлёвай прадукцыі і паляпшаць фінансавыя вынікі.
- Па выніках 2007 года выраблена гандлёвай прадукцыі ў супастаўных умовах на суму 56,8 млрд рублёў.
- За кошт уласных сродкаў прадпрыемства выкарыстана 2,2 млрд рублёў на тэхнічнае перааснашчэнне.
- На працягу апошняга года ўдалося знізіць выдаткі на рубель гандлёвай прадукцыі.
- Выканана праграма па энергазберажэнні.
- Павышаны вытворчасць працы, сярэднямесячны заробак і рэнтабельнасць.

Эканаміст па працы Іна КУНЦЭВІЧ, начальнік аддзела эканомікі, прагназавання і зарплаты Валянціна ЮРЫС, вядучы эканаміст Людміла ХМЯЛЕЎСКАЯ (злева направа).

Матэрыялы паласы падрыхтавалі Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Алена ДАЎЖАНОК, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).

РУП «Дарбудіндустрыя». УНП 100211220.